Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

24 КАСТРЫЧНІКА 2007 г.
СЕРАДА
№ 203 (26068)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

ПАРАІМСЯ З АЛЕРГОЛАГАМ

Сёння кожны пяты жыхар Зямлі церпіць ад розных алергічных праяў. Вядома больш за 20 тысяч алергенаў. І на кожны з іх арганізм чалавека рэагуе па-свойму. Алергія — гэта не абавязкова цяжкія захворванні, напрыклад, бранхіяльная астма, але і іншыя хваробы, якія значна зніжаюць якасць жыцця людзей. Алергікі, і не толькі яны, змогуць задаць свае пытанні **галоўнаму алерголагу рэспублікі, кандыдату медыцынскіх навук, дацэнту кафедры алергалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Людміле Вячаславаўне МАСЛАВАЙ.** «Прамая лінія» з яе ўдзелам пройдзе **30 кастрычніка, у аўторак, з 14.00 да 15.30. Папярэднія пытанні задаваць па нумарах: (8017) 287 18 29 — Святлане Барысенцы і (8017) 287 18 36 — Вользе Шаўко.**

Беларусь не адступіць ад інтэграцыйных працэсаў у СНД

Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў 23 кастрычніка на сустрэчы са старшынёй Выканаўчага камітэта — выканаўчым сакратаром СНД Сяргеем Лебедзевым.

«Вы можаце абапірацца на нашу дапамогу і падтрымку», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што прынятыя на нядаўнім саміце ў Душанбе Канцэпцыя далейшага развіцця СНД і План мерапрыемстваў па яе рэалізацыі «даюць магчымасць сканцэнтравацца на нечым канкрэтным і весці больш прадметную работу ў Садружнасці». Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, Беларусь прымала актыўны ўдзел у распрацоўцы гэтых дакументаў, і ў многім дзякуючы нашай краіне яны былі прыняты.

Прэзідэнт павіншаваў Сяргея Лебедзева з назначэннем на пасаду старшыні Выканаўчага камітэта — выканаўчага сакратара СНД, адзначыўшы, што гэта «вельмі складаная і аб'ёмная работа ў выніку тых узаемаадносінаў, якія часам складваюцца паміж дзяржавамі ў рамках СНД». Сяргей Лебедзеў у сваю чаргу заявіў, што Беларусь з'яўляецца адным з рухавікоў усіх інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы.

«Прэзідэнт Беларусі лічыць, што ўсе домыслы аб тым, што ў Садружнасці няма перспектывы, не маюць пад сабой глебы. Садружнасць развіваецца, і прынятыя на саміце ў Душанбе дакументы — добрая аснова для канкрэтных крокаў па развіцці і ўмацаванні СНД», — сказаў Сяргей Лебедзеў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Старшыня КДК праінфармаваў Прэзідэнта аб выкананні даручэнняў па навядзенні парадку на зямлі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 23 кастрычніка прыняў з дакладам старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянона Ломаця.

Зянон Ломаць праінфармаваў аб выніках работы КДК за 9 месяцаў 2007 года, а таксама за ўвесь перыяд, які прайшоў з часу наведання кіраўніком дзяржавы Камітэта дзяржкантролю ў кастрычніку мінулага года.

У прыватнасці, у цэнтры ўвагі на сустрэчы былі пытанні навядзення парадку на зямлі. Прэзідэнт запатрабаваў аднолькавага для ўсіх падыходу пры іх разглядзе: Камітэт не павінен дапускаць «перагібаў і шараханняў», падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. КДК мае намер дэталёва і глыбока прааналізаваць выкарыстанне кожнага зямельнага ўчастка і кожнае парушэнне ў гэтай сферы. У той жа час, калі ёсць прадпісанне аб парушэнні зямельнага, ляснога, водаахоўнага заканадаўстваў, неабходна добраахвотна, аператыўна і дакладна выконваць прад'яўленыя патрабаванні. Гэта датычыцца ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў без выключэння.

Зянон Ломаць праінфармаваў аб сітуацыі на спажывецкім рынку краіны. Кіраўнік дзяржавы даручыў трымаць на кантролі пытанне забеспячэння насельніцтва таварамі.

Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны аб маючым адбыцца візіце ў Мінск дэлегацыі з Кітая і правядзенні сумеснага пасяджэння беларуска-кітайскай камісіі па гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву, сустаршынёй якой з беларускага боку з'яўляецца Зянон Ломаць.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Германія заўсёды займала прыярытэтнае месца ў гандлёва-эканамічных адносінах Беларусі

Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі на сустрэчы з прэм'ер-міністрам федэральнай зямлі Брандэнбург Матыясам Платцэкам.

Паводле слоў Сяргея Сідорскага, Беларусь з Германіяй звязваюць добрыя адносіны. У 2006 годзе тавараабарот дзвюх краін перасягнуў $2,5 млрд. «Нядрэнная дынаміка росту тавараабароту і ў гэтым годзе», — адзначыў ён. У сваю чаргу прэм'ер-міністр федэральнай зямлі Брандэнбург сказаў: «Мы добра разумеем тыя змяненні, якія адбываюцца ў Беларусі. Гэта датычыцца эканамічных працэсаў, грамадскіх і палітычных». Паводле яго слоў, «для многіх з зямлі Брандэнбург Беларусь не з'яўляецца невядомай краінай». Матыяс Платцэк таксама падкрэсліў, што напярэдадні візіту ў Беларусь ён праводзіў перагаворы з дэпутатамі Бундэстага, Еўрапарламента, членамі ўрада. «Мне раілі не рабіць гэты візіт. У Германіі многа крытыкі наконт таго, што я прыехаў у Беларусь», — дадаў ён. Звяртаючыся да Сяргея Сідорскага, Матыяс Платцэк сказаў, што сёння бакі могуць адкрыта абмеркаваць адзін з адным актуальныя пытанні супрацоўніцтва...

БЕЛТА.

Восеньскі дэсант на соткі

в. Прылепы, Смалявіцкі раён.

Фота Анатоля КЛЕЦЧУКА

БЕЛАРУСКІ ЛЕГКАВЫ АЎТАМАБІЛЬ — НЕ ФАНТАЗІЯ!

Ва ўрадзе

Вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі за студзень—верасень 2007 года сведчаць аб поўнай адаптацыі работы эканомікі ва ўмовах істотнага павелічэння цэнаў на энерганосьбіты, якія паступаюць з Расіі, аб тым, што прадпрыемствы краіны навучыліся перабудоўваць сваю работу літаральна ў экстрэмальных умовах, навучыліся працаваць, навучыліся лічыць грошы. Гэтую думку выказаў учора на пасяджэнні Савета Міністраў кіраўнік беларускага ўрада Сяргей Сідорскі.

Прэм'ер-міністр паведаміў, што за дзевяць месяцаў рост валавога ўнутранага прадукту склаў 8,4 працэнта, намінальны аб'ём — 69,5 трыльёна беларускіх рублёў (USD 32 млрд), а інвестыцыі ў эканоміку перавысілі 16,7 трыльёна рублёў, прычым большасць з іх накіравана ў вытворчую сферу, што дало свой станоўчы вынік. Інфляцыя за гэты перыяд склала 5,4 працэнта (сярэднямесячны паказчык — 0,6 працэнта; у Расіі, дарэчы, гэты паказчык складае 0,8, а ва Украіне — 0,9 працэнта штомесяц). Рэальныя грашовыя даходы насельніцтва ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года выраслі на 16,2 працэнта. Намінальная заработная плата ў верасні складала 678,6 тысячы рублёў (рост 18 працэнтаў), сярэднямесячная пенсія за дзевяць месяцаў перавысіла 295 тысяч рублёў.

Між тым, выявіліся і праблемы. Не выкананы такія прагнозныя паказчыкі, як тэмп росту спажывецкіх тавараў, рэнтабельнасць вытворчасці. Акрамя таго, тэмп росту імпарту перавышае тэмп росту экспарту. Як адзначыў у сваім дакладзе першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка, наша насельніцтва вымушана траціць грошы на нехарчовую прадукцыю, якая не вырабляецца ў краіне. Так, рост тавараабароту з замежнымі краінамі даволі істотны (больш чым 20 працэнтаў, і гэта не можа не радаваць), аднак пры гэтым на сёння захоўваецца адмоўнае сальда ў памеры 1,3 млрд долараў. Пры гэтым неабходна ўдакладніць, што адмоўнае сальда ў гандлі з Расіяй складае амаль 4,7 мільярда, а вось з краінамі Еўрапейскага саюза сальда станоўчае (плюс 2,13 мільярда). Так што ўсходні вектар патрабуе сур'ёзнай дапрацоўкі.

Асобна закраналася пытанне з прадукцыяй жывёлагадоўлі. Як адзначалася на пасяджэнні, малака сёлета ў краіне выраблена больш як 3,7 мільёна тон, або 104,3 працэнта да ўзроўню мінулага года. «Сёння ўсе кінуліся рабіць сыры, бо гэта выгадна, адзначыў Сяргей Сідорскі, але вось чаму мяса ідзе міма мясаперапрацоўчых прадпрыемстваў?» Прэм'ер задаў пытанне: чаму (пры тым, што цэны на мяса і малако выраслі на 30—40 працэнтаў) нехта мае дадатковыя грошы, якія не можа атрымаць наша вёска? А гэта 700 мільярдаў рублёў. Хіба ж яны лішнія для беларускай вёскі?

Сярод станоўчых вынікаў можна назваць дастаткова паспяховае выкананне імпартазамяшчальных тавараў: за дзевяць месяцаў, напрыклад, на ўнутраны рынак паступіла 102 найменні імпартазамяшчальных тавараў са 137, закладзеных у праграме. У гэтай сувязі Уладзімір Сямашка асабліва адзначыў, што ў краіне неабходна хутчэй асвойваць вытворчасць бытавой электратэхнікі. Ужо заўтра ў Беларусі чакаюць візіцёраў з Кітая, з карпарацыі Midea Group, для пачатку практычнай рэалізацыі праекта найбуйнейшай у СНД вытворчасці бытавой электратэхнікі.

У рамках гэтай жа праграмы ў Беларусі плануецца ў бліжэйшыя гады наладзіць вытворчасць легкавых аўтамабіляў. «І гэта не нашы фантазіі», — адзначыў Уладзімір Сямашка.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

АБ ЗАКАНЧЭННІ ПЕРЫЯДУ ДЗЕЯННЯ «ЛЕТНЯГА» ЧАСУ

У адпаведнасці з парадкам вылічэння часу, вызначаным Пастановай Урада Рэспублікі Беларусь № 317 ад 13 мая 1996 г., 28 кастрычніка 2007 г. у рэспубліцы адмяняецца дзеянне «летняга» часу.

У сувязі з гэтым 28 кастрычніка 2007 г. у 3 гадзіны стрэлкі гадзіннікаў на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь пераводзяцца на адну гадзіну назад.

Старшыня Дзяржстандарта, Старшыня Міжгаліновай камісіі часу, частаты і вызначэння параметраў кручэння Зямлі В.М. КАРАШКОЎ

АБАНЕНТАМ «МТС» ТЭЛЕФАНУЮЦЬ НА «ШАСЦЁРКУ». НЕ ПАМЫЛЯЙЦЕСЯ...

GSM-аператар «Мабільныя Тэлесістэмы» пашырыў нумарную ёмістасць з занальным кодам 33, у выніку чаго ў эксплуатацыю ўводзяцца дадатковыя нумары для абанентаў «МТС» з дыяпазонам 63ххххх — 65ххххх. Абаненты фіксаванай тэлефоннай сувязі, а таксама абаненты іншых сотавых аператараў могуць тэлефанаваць на новыя нумары «МТС» або ў нацыянальным фармаце 8 033 63ххххх — 8 033 65ххххх, або ў міжнародным фармаце 375 33 63ххххх — 375 33 65ххххх.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЗАГІНУЛА ПЯЦЁРА РЫБАКОЎ

Трагедыяй закончылася рыбалка для пяці жыхароў Столінскага раёна. Мужчыны засталіся начаваць у крытым грузавіку аўтамашыны ГАЗ на беразе вадаёма. Тут жа знаходзіўся балон з газавай гарэлкай. Уцечка газу і стала прычынай смерці. Газ запоўніў прастору кузава, якая з-за шчыльнасці пакрыцця амаль не праветрывалася. Людзі заснулі і не прачнуліся. Разам з дарослымі рыбакамі быў школьнік — вучань дзевятага класа.

Яна СВЕТАВА.

МАХЛЯР — САБЕС

У хату 77-гадовага жыхара вёскі Беліца Лідскага раёна завіталі дзве жанчыны, якія назваліся работніцамі службы сацыяльнага забеспячэння. Іх «паслугі» каштавалі пенсіянеру 5 мільёнаў 800 тысяч рублёў. Гэтыя махляркі спачатку зацікавіліся ўмовамі яго жыцця, у прыватнасці, станам электраправодкі, а затым паведамілі чалавеку вельмі важную навіну. Аказваецца, неўзабаве ў сувязі з аб'яднаннем Беларусі і Расіі будуць уведзены новыя грошы і таму трэба своечасова паклапаціцца пра абмен на іх сваіх зберажэнняў. Прычым неабавязкова самому звяртацца ў банк, можа дапамагчы сабес. Чалавек паверыў і аддаў вышэйпамянёную суму. Двое сутак ён марна чакаў работнікаў пошты з новымі купюрамі і толькі тады звярнуўся ў міліцыю. Сваіх «дабрадзеек», ураджэнак Украіны, пацярпелы пазнаў па фатаграфіях, якія яму паказалі аператыўнікі. Гэтыя махляркі (на выгляд 30—35 гадоў, адна — бландзінка, другая — брунетка) падобным чынам ужо «кінулі» пажылую жанчыну ў іншай вёсцы раёна.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

УЗЯЎ, ШТО АХОЎВАЎ?

Работнікамі Нясвіжскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету за крадзеж рыбы ў сажалках ААТ «Рыбгас «Локтышы» быў затрыманы... начальнік аховы гэтага рыбгаса.

У яго пры выездзе з тэрыторыі прадпрыемства ў асабістым аўтамабілі быў знойдзены пакет з рыбай агульнай вагой 6 кілаграмаў. Дакументаў, якія б давалі права на вываз рыбы, у асобы пры пасадзе не аказалася. Матэрыялы накіраваны ў суд Ганцавіцкага раёна.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«А НУ, ДЗЯЎЧАТЫ, У МАШЫНУ!»

У Полацку а дзесятай гадзіне вечара да міліцыянераў Дэпартамента аховы звярнуўся па дапамогу навучэнец ПТВ. Хлопец паведаміў, што дзвюх яго знаёмых дзяўчат — навучэнку таго ж ПТВ і 10-класніцу двое невядомых мужчын пад пагрозай прадмета, што нагадвае пісталет, спрабавалі запіхнуць у «Форд». Усяго праз 35 хвілін падчас рэалізацыі спецыяльнага плана міліцыянеры гарадскога аддзела «Аховы» затрымалі аўтамабіль у дварах дома па вуліцы М. Багдановіча. Машынай кіраваў 30-гадовы рабочы, а ў якасці пасажыра быў 28-гадовы мужчына. У затрыманых канфіскаваны пнеўматычны пісталет...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Артэрыі эканомікі

ДАРОГІ, ДАРОЖНІКІ І ФІНАНСАВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Сетка аўтадарог Беларусі створана ў асноўным на працягу апошніх 60 гадоў. Зараз яе працягласць складае 83,6 тысячы кіламетраў: 15,4 тысячы — рэспубліканскія і 68,2 тысячы — мясцовыя, 70 працэнтаў апошніх знаходзяцца ва ўзросце пасля сарака.

Абсалютная большасць айчынных дарог з цвёрдым пакрыццём пяражываюць пратэрміноўку міжрамонтных тэрмінаў па капрамонце. Прыкладна кожныя пяць гадоў дарожнае пакрыццё павінна пяражываць і бягучы рамонт. Аднак па факце аб'ёмы капрамонту дарог павінны быць большымі ў 5,6 раза, бягучага — у 3,3. Складанае становішча абумоўлена недастатковасцю фінансавання дарожнай гаспадаркі. Сярэдняя гадавая патрэба ў сродках на ўтрыманне, рамонт, развіццё аўтадарог агульнага карыстання складае 4,2 трыльёна рублёў, а фактычнае забеспячэнне не перавышае 1,4 трыльёна, пры тым, што сродкі рэспубліканскага дарожнага фонду складаюць каля 1,9 трыльёна рублёў. Падрабязней аб стане дарожнай гаспадаркі расказвае напярэдадні Дня аўтамабіліста і дарожніка першы намеснік міністра транспарту і камунікацый — дырэктар Дэпартамента «Белаўтадар» Анатоль ЛЫЦІН.

— Анатоль Міхайлавіч, што зроблена і што запланавана на гэты год у межах рэалізацыі галіновай праграмы «Дарогі Беларусі» на 2006—2015 гады? Што можна сказаць пра яе фінансавае забеспячэнне?

— Агульны аб'ём фінансавання праграмы — 23,3 трыльёна рублёў. Гэта сума прадугледжана на рэалізацыю комплексу мераў, скіраваных на паляпшэнне транспартна-эксплуатацыйнага стану дарог, забеспячэнне народнай гаспадаркі і насельніцтва ў аўтамабільных перавозках. Спланаваны пэўныя аб'ёмы работ па будаўніцтве і рэканструкцыі, капрамонце, бягучым рамонце, утрыманні дарог, мастоў і пуцеправодаў. Вызначаны асноўныя накірункі дзейнасці ў галіне павышэння бяспекі дарожнага руху, развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу, прыдарожнага сэрвісу (да 2011 года будзе пабудавана звыш 600 адпаведных аб'ектаў), па мадэрнізацыі дарог на ўсіх накірунках міжнародных транспартных калідораў, па павышэнні тэхнічнага ўзроўню рэспубліканскіх дарог, якія злучаюць сталіцу з абласнымі цэнтрамі, будаўніцтве абходаў 11 гарадоў — Баранавічы, Верхнядзвінск, Віцебск, Калінкавічы, Ваўкавыск, Гродна, Ліда, Слонім, Магілёў, Маладзечна і пасёлка гарадскога тыпу Пагранічны... Нашы разлікі паказваюць высокую эфектыўнасць намечаных мерапрыемстваў: сяроднегадавы эфект на 1 рубель затрат ацэньваецца ў памеры 1,8 рубля. Выкананне праграмы дазволіць забяспечыць народнай гаспадарцы штогадовы прырост ВУП у памеры 2,1 працэнта.

Летась на ўтрыманне, рамонт, рэканструкцыю і будаўніцтва аўтадарог мы атрымалі 90 працэнтаў ад аб'ёму, прадугледжанага праграмай. Сёлета запланавана выдача 70 працэнтаў ад заяўленай сумы. За кошт выдатканых сродкаў у першую чаргу выконваюцца работы па ліквідацыі дэфектаў, якія непасрэдна ўплываюць на бяспеку руху.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

У Магілёў прыедзе Іглесіяс?

Вельмі верагодна, што такі навагодні падарунак зробіць арганізацыйны камітэт Міжнароднага музычнага фестывалю «Залаты шлягер». У Магілёве называюць гэта «фантастычным, але рэальным планам». І мяркуюць, якога Іглесіяса запрашаць: старэйшага Хуліо альбо маладзейшага Энрыке. Хутчэй — апошняга, бо гэта будзе ўпершыню ў Беларусі.

Пра гэта расказаў на прэс-канферэнцыі намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Глаз. Размова ішла пра вынікі нядаўняга «Залатога шлягера-2007» і планах на перспектыву.

Сёлета канцэрты дзесятага юбілейнага фестывалю наведалі восем тысяч чалавек. Узровень «Залатога шлягера» высока ацанілі ў Міністэрстве культуры: як «сапраўды фестываль сапраўднай музыкі». Гэта былі тры дні канцэртаў жывой музыкі — спевакоў суправаджаў прэзідэнцкі аркестр.

Прэса сёлета адзначыла і хібы магілёўскага фестывалю: мала гучных імёнаў і мала канцэртаў, скасаванне конкурсу маладых выканаўцаў. Арганізатары адказалі на ўсе прэтэнзіі эканамічнымі разлікамі: бюджэт цяпер выдаткоўвае на правядзенне «Залатога шлягера» 300 тысяч долараў, а пры рэалізацыі білетаў на канцэрты даводзіцца ўлічваць пакупніцкую здольнасць.

Кошт запрашэння артыстаў павысіўся ў некалькі разоў: цяпер выступленне аднаго спевака каштуе 5—6 тысяч долараў. Аргкамітэт мае намер працаваць над прыцягненнем спонсараў, каб зрабіць праграму «Залатога шлягера» больш цікавай і разнастайнай. Ад конкурсу маладых выканаўцаў даводзіцца адмаўляцца як ад вельмі дарагога мерапрыемства, але «Залаты шлягер», лічаць арганізатары, у першую чаргу з'яўляецца фестывалем майстроў.

— Затое фестываль абавязкова захавае сваю дзіцячую праграму, — запэўніў Анатоль Глаз. — Адна з канцэртных праграм будзе прысвечана моладзі XXI стагоддзя і сённяшнім шлягерам. Пашырыцца кола выканаўцаў на «Рамансіядзе». Мы маем намер правесці міжнародны конкурс ВІА памяці Уладзіміра Мулявіна: у ім будуць браць удзел папулярныя гурты высокага ўзроўню — еўрапейскага і міжнароднага.

Наступны «Залаты шлягер» адбудзецца ў пачатку верасня — каб абавязкова патрапіць на «бабіна лета» і добры музычны настрой супаў з цёплым надвор'ем. Але калі гэта будзе — у наступным годзе альбо пасля наступнага (апошнім часам фестываль праводзіцца раз у два гады) — пакуль невядома. А вось канцэрты ў межах «Залатога шлягера» могуць быць арганізаваны ў любы час. Цяпер вось плануюць запрасіць Іглесіяса напярэдадні Новага года, які ўжо не за гарамі.

Ілона ІВАНОВА.

Знайшлі і абясшкодзілі

Днямі на тэрыторыі Беларусі і іншых краін СНД адначасова была праведзена спецыяльная міждзяржаўная аперацыя «Вышук».

Як паведаміла начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі Кацярына Самусенкава-Шэлегава, супрацоўнікі крымінальнага вышуку Беларусі, напрыклад, самі выязджалі ў Маскоўскую і Ленінградскую вобласці. І гэта дало неблагія вынікі. У Расіі былі затрыманы 15 злачынцаў, якія хаваліся ад беларускага правасуддзя, а таксама ўстаноўлена месцазнаходжанне 11 зніклых без вестак асобаў.

А на тэрыторыі Беларусі падчас цяперашняй татальнай «аблавы» на злачынцаў былі затрыманы 12 злымыснікаў і знойдзена чацвёра грамадзян, якія лічыліся зніклымі. Апроч таго, па дактылакартах, якія прадставілі беларускім экспертам-крыміналістам калегі са Смаленскай вобласці, былі ідэнтыфікаваны 13 неапазнаных трупаў.

Увогуле, за перыяд правядзення аперацыі на прасторах СНД былі затрыманы 379 грамадзян, якія адшукваюцца, з якіх 48 — падазраюцца ў злачынствах, здзейсненых некалькі гадоў таму. Апроч таго, сумесныя намаганнямі сышчыкі знайшлі 238 асобаў, якія лічыліся зніклымі без вестак, эксперты ідэнтыфікавалі 20 неапазнаных трупаў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»
по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Борисовском райисполкоме

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства первого этажа (общ. пл. 915,3 кв.м) административного трехэтажного здания, расположенного по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 82. Начальная цена 449 600 580 бел. руб. Задаток в размере 5 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Объект продается без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 27.11.2007 г. в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.11.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактные телефоны: (8017) 2246134, (80177) 739327.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства нежилого помещения общей пл. 240,4 кв.м, расположенного в многоквартирном жилом доме № 45 по ул. Юбилейная в г. Мядель. Начальная цена снижена на 20 % и составляет 42 541 722 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.04.2007 г. Аукцион состоится 13.11.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 12.11.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЯДЗЕРНАЯ ЗБРОЯ ІРАНА

Кіраўнік Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі Махамед Эль-Барадэй заявіў, што на стварэнне атамнай бомбы Ірану патрабуецца ад трох да васьмі гадоў, паведамляе Рэйтар.

Паводле слоў Эль-Барадэя, з такой высновай згодныя разведвальныя службы многіх краін.

ГРУЗІЯ «ПРАТЭСТУЕ» СУПРАЦЬ АЛІМПІЯДЫ Ў СОЧЫ

Былы прэзідэнт Грузіі Эдуард Шэварднадзе прапануе сусветнай грамадскасці байкатаваць Алімпіяду ў Сочы ў 2014 годзе, калі Расія не ўрэгулюе канфлікт у Абхазіі. Як перадае агенцтва «Навіны-Грузія», аб гэтым экс-прэзідэнт заявіў падчас нядаўняй сустрэчы з былым міністрам замежных спраў Германіі Гансам Дзітрыхам Геншэрам.

«У размове з Геншэрам я пахваліў Пуціна за вяртанне грузін у Гальскі раён (Абхазія — заўвага Lenta.Ru), але таксама адзначыў, што гэта толькі пачатак. Калі Расія не вырашыць пытанне з Паўднёвай Асеціяй і Абхазіяй, яна павінна быць пакарана так, як і Савецкі Саюз у 1980 годзе за ўвядзенне войскаў у Афганістан», — расказаў Шэварднадзе.

Раней паведамлялася, што спікер грузінскага парламента Ніно Бурджанадзе заявіла, што ў выпадку прыцягнення Абхазіі да падрыхтоўкі да Алімпіяды ў Сочы паставіць пад сумненне правядзенне Гульняў.

БАРСУКОЎ — СТРАЛЯЦЬ, НОРАК — ЛАВІЦЬ

Галоўны навуковы супрацоўнік брытанскага ўрада Дэвід Кінг прапанаваў пачаць адстрэл барсукоў у раёнах, дзе назіраецца высокае захворванне буйной рагатай жывёлы, каб спыніць распаўсюджванне бугаёвых сухотаў.

Раней урад адмовіўся пайсці на гэты крок, да якога заклікалі фермеры і ветэрынары. Барсукі з'яўляюцца натуральнымі пераносчыкамі гэтай хваробы. Аднак вучоныя адзначылі, што адстрэл жывёл не апраўдае сябе, таму што барсукі будуць разносіць вірус на другіх рэгіёнах, а займацца іх знішчэннем у нацыянальным маштабе эканамічна немэтазгодна.

А ў дацкім горадзе Асп з жывёлагадоўчай фермы збеглі 5 тысяч норак. Паліцыя мяркуе, што звяркоў выпусцілі актывісты руху за правы жывёл. Супрацоўнікі і мясцовыя жыхары цэлы дзень лавілі норак на гарадскіх вуліцах. Паліцыя пакуль нікога не затрымала, але прапанова аб удзеле актывістаў узнікла таму, што раней за імі было некалькі такіх выпадкаў. У прыватнасці, абаронцаў правоў жывёл падазраюць у вызваленні 2,5 тысячы норак у жніўні ў Фінляндыі.

НА ФАБРЫЦЫ ФЕЕРВЕРКАЎ ЗАГІНУЛІ 16 ЧАЛАВЕК

16 чалавек загінулі і не менш за 15 атрымалі раненні ў выніку выбуху, які адбыўся на фабрыцы феерверкаў на паўднёвым захадзе Кітая.

Трагедыя адбылася на прадпрыемстве, якое знаходзілася каля горада Чунцын. Выбух быў такім моцным, што разбурыў не толькі пабудовы на тэрыторыі фабрыкі, але і значна пашкодзіў жылыя дамы, якія знаходзіліся побач. Атрады выратавальнікаў учора яшчэ працягвалі праводзіць работы па разборцы развалінаў, бо пад імі яшчэ могуць знаходзіцца людзі.

СПАЧАТКУ АЖАНІЦЕСЯ, ПОТЫМ ЗА РУКІ ТРЫМАЙЦЕСЯ

Паліцыя нораваў Ірана будзе караць маладыя нежанатыя пары, якія на публіцы будуць трымацца за рукі, цалавацца і дэманстраваць іншыя знакі прывязанасці адно да аднаго.

Законы ісламскай рэспублікі забараняюць жанчыне з'яўляцца ў грамадскіх месцах з мужчынам, які не з'яўляецца членам яе сям'і. Тым не менш, многія іранцы гэтых правілаў не прытрымліваюцца і сустракаюцца ў месцах грамадскага адпачынку, што выклікае занепакоенасць уладаў. У кастрычніку 27-гадовая студэнтка медыцынскага факультэта скончыла жыццё самагубствам у камеры ізалятара часовага ўтрымання, пасля таго як яе арыштавалі ў парку разам з бойфрэндам.

Для ўсіх узростаў. І пасад

Статыстыка сведчыць, што рэгулярна займаецца фізкультурай амаль кожны сёмы грамадзянін Беларусі, прычым сяброўства са спортам ніякім чынам не залежыць ад узросту, віду прафесійнай дзейнасці ці пасад. І яшчэ раз пераканацца ў гэтым давялося літаральна днямі: у алімпійскім комплексе «Стайкі» пад Мінскам прайшла першая Рэспубліканская спартакіяда работнікаў арганізацый Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта.

Усяго ў арганізацыях Кіраўніцтва справамі сёння працуюць 23 тыс. чалавек, 360 з якіх сабраліся ў «Стайках» абараняць спартыўны гонар сваіх калектываў. На працягу трох дзён спаборніцтвы праходзілі па розных дысцыплінах: валейболе, міні-футболе, настольным тэнісе, дартсе, штурханні гіры, перацягванні каната, більярдзе. Прычым канкурэнцыя за ўзнагароды аказалася па-сапраўднаму жорсткай. Зборныя Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» і гасцініцы «Мінск» узнімаліся на п'едэстал адразу ў двух відах — валейболе і міні-футболе. А прадстаўнікі «Беларускіх латарэй» занялі першае месца сярод жанчын і другое сярод мужчын у дартсе.

Арганізатары паклапаціліся аб шматлікіх «заахвочвальных» прызах — самаму заўзятаму балельшчыку, удзельніку спаборніцтваў, які выступіў у найбольшай колькасці дысцыплін, самаму знаходлівому і самаму «ўзроставаму» спартсмену...

Ул. інф.

ISSN 1990 - 763X

07203>

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.10.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 150,00
1 еўра	3 054,83
1 латвійскі лат	4 353,11
1 літоўскі літ	884,76
1 чэшская крона	112,42
1 польскі злоты	835,24
1 расійскі рубель	86,27
1 украінская грыўня	425,45

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,9225
10 UAH	49,3632
1000 BYR	11,5784
EUR	35,3999

Курс у гандлёвых кампаніях (на 23.10.2007 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу завяршыць рэканструкцыю Тэатра оперы і балета ў снежні 2008 года

У Беларусі тэатры оперы і балета ў 2008 годзе зноў аб'яднаюцца. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падтрымаў гэту прапанову ў час даклада міністра культуры Уладзіміра Мацвейчука, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Паводле слоў Уладзіміра Мацвейчука, гэта просьба саміх калектываў тэатраў. Акрамя таго, у 2008—2009 гадах у сувязі з вяртаннем калектываў у новы будынак прадугледжана выдзяленне фінансавых сродкаў для абнаўлення сцэны, касцюмаў, рэпертуару.

Аляксандр Лукашэнка цікавіўся ходам рэканструкцыі будынка ТА «Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь». Як паведаміў міністр культуры, спецыяльная камісія 19 кастрычніка пачала прыёмку першай чаргі будынка тэатра. Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу завяршыць рэканструкцыю ў снежні 2008 года.

Прэзідэнту таксама было даложана аб выніках выканання яго даручэнняў, дадзеных Міністэрству культуры ў верасні 2006 года.

У час даклада ішла размова і аб арганізацыі работы музеяў. Аляксандр Лукашэнка даручыў Міністэрству культуры сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук у наступным годзе стварыць канцэпцыю новага музея. Плануецца, што нацыянальны гістарычны музей з'явіцца на базе Нацыянальнага музея гісторыі і культуры. Ён павінен стаць адной з вядучых устаноў культуры рэспублікі. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў ідэю капітальнага рамонту і рэстаўрацыі аднаго з будынкаў музея на Фрунзе, 19. У 2008 годзе на гэтыя мэты будуць выдзелены фінансавыя сродкі.

Прэзідэнт таксама паставіў задачу прадоўжыць работу па ўдасканаленню фестывальнага руху. У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» павінны прымаць удзел толькі лепшыя выканаўцы як з блізкага і далёкага замежжа, так і беларускія.

Кіраўнік дзяржавы даручыў перагледзець канцэпцыю праводзімага ў Маладзечне Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі. Ён павінен стаць адным з вядучых рэспубліканскіх фестываляў, на якім будзе прадстаўлена ўся разнастайнасць беларускай культуры.

Прэзідэнт даручыў Мінкультуры і абласным выканаўчым камітэтам у 2008—2009 гадах правесці творчыя акцыі і выстаўкі, прысвечаныя 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Такія творчыя мерапрыемствы стануць яшчэ адной магчымасцю калектывам і выканаўцам з рэгіёнаў праявіць сябе.

У час даклада былі разгледжаны і пытанні кадравага забеспячэння ўстаноў культуры. Прэзідэнт паставіў задачу набіраць на кіруючыя пасады як у самім Міністэрстве, так і ў падпарадкаваных яму арганізацыях энергічных, прафесійна падрыхтаваных спецыялістаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Нарадзіла дома

Жыхарка вёскі Ярцавічы Бярозаўскага раёна па рэлігійных меркаваннях прыняла рашэнне нараджаць дома. Роды прыняў муж, а потым выклікаў «хуткую», каб засведчыць факт нараджэння дзіцяці. Медыкі забралі маці і дзіця ў райбальніцу. Стан іх здавальняючы. Але медыцынскія работнікі лічаць такую рызыку неапраўданай і неабдуманай.

Яна СВЕТАВА.

ГРАМАДСТВА ЦІКАВІЦЦА БЕЛАРУСКІМ ПРАВАПІСАМ

Дэпутацкая трыбуна

Для арганізацыі шырокага грамадскага абмеркавання праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» па прапанове дэпутатаў ён быў у жніўні гэтага года размешчаны на сайце Міністэрства адукацыі. «Занадта асцярожны» і «рэвалюцыйны», «вельмі неабходны» і «зусім непатрэбны», «хутчэй прыняць» і «адкласці прыняцце змен у правапісе» — вось толькі некаторыя з узаемавыключаючых выказванняў, якія мы знайшлі ў лістах, дасланых у нашу парламенцкую Камісію па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу. Разынка яшчэ і ў тым, што амаль тры чвэрці лістоў былі напісаны не выкладчыкамі мовы і літаратуры, не мовазнаўцамі па адукацыі, а матэматыкамі, радыёфізікамі, біёлагамі, хімікамі, юрыстамі. Відавочна, што дадзены праект становіцца вельмі цікавым для ўсяго нашага грамадства. Цяжка нават ахапіць кола ўсіх паступіўшых да нас пытанняў, меркаванняў, сумненняў, выказаных з нагоды зместу гэтага дакумента. Але ж на найбольш значных з іх дазволю сабе спыніцца больш падрабязна.

Ёсць выказванні аб тым, што на дадзены момант з мовазнаўчага і з юрыдычнага поглядаў адсутнічаюць перадумовы для складання новага арфаграфічнага зводу. Але ж гэта не новы, а ўдасканалены звод. А наконт непатрэбнасці і адкладвання прыняцця змен у правапісе аўтарам лістоў адкажам словамі прадмовы да Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі 1959 года, рэдактарамі якіх з'яўляліся вядомыя кожнаму беларусу акадэмікі Кандрат Крапіва і Пятро Глебка: «З'яўляючыся рэгламентуючым сродкам жывой мовы, правапіс не можа працяглы час заставацца нязменным. Бесперапыннае развіццё і ўдасканаленне мовы... выклікае необходнасць перыядычна ўдакладняць правапіс, прыводзіць яго ў адпаведнасць з сучасным станам мовы. Беларускі правапіс, пабудаваны ў значнай меры на фанетычным прынцыпе, асабліва чуллівы да гэтых змен у мове, і таму ён павінен перыядычна ўдасканальваць свае правілы». Дарэчы, удакладненні правапісу 1933 года адбыліся праз 26 гадоў, а прапануемыя зараз — амаль праз 50. Што ж тычыцца асцярожнасці і рэвалюцыйнасці, то зварот да той жа прадмовы таксама будзе слушным: «Звод правілаў, якім бы поўным і дасканалым ён ні быў, не можа, аднак, ахапіць усіх выпадкаў напісання часта адасобленых, адзінкавых слоў». Менавіта таму, на бягучай восеньскай сесіі, а калі больш канкрэтна, то 24 кастрычніка, будзе разгледжана канцэпцыя праекта закона аб беларускім правапісе і сам праект у першым чытанні. А напружаная праца над зместам правіл яшчэ наперадзе. І мы павінны быць і будзем вельмі асцярожнымі ў зменах, бо ведаем, што пасля прыняцця закона памылкі вельмі цяжка выправіць. Скажу больш, зараз абмяркоўваем пытанне аб тым, каб у тэксце закона існавала прававая норма, якая б дазваляла ўносіць у правілы нязначныя змены па-за межамі закона, магчыма той жа пастановай ураду.

Прачытаўшы адзін з лістоў, мы былі моцна збянтэжаныя, бо нават уявіць не маглі, што з прыняццем некаторых норм арфаграфіі можна пакрыўдзіць душэўныя пачуцці асобных грамадзян. Праект прадугледжвае заканадаўчае замацаванне напісання назваў вышэйшых божастваў у рэлігійных культах, а таксама біблейскіх асоб з вялікай літары: *Бог, Алах, Прасвятая Дзева Марыя, Буда, Брахма, Святы Павел (апостал).* Здавалася б, што ж тут дрэннага. Па-першае, больш простымі будуць правілы напісання божастваў і біблейскіх асоб. Уявіце сабе, у перапісцы з прадстаўніком іншай краіны вы дапускаеце памылку ў напісанні бажаства, якому пакланяецца народ гэтай краіны. Міжнародны канфлікт забяспечаны. А па-другое, паважлівыя адносіны да пачуццяў усіх вернікаў, незалежна ад таго, з якой рэлігійнай верай атаясамлівае сябе чалавек, уласцівы кожнаму беларусу. Гэта вельмі важная рыса дазваляе нам ганарыцца тым, што ў нашай краіне, у адрозненне ад шэрагу іншых, няма міжрэлігійных канфліктаў. Многія з сорамам успамінаюць той час, калі знішчалі цэрквы і касцёлы, калі за веру людзей пазбаўлялі пасад, не давалі магчымасці вучыцца ў інстытутах. Здавалася б, усё зразумела, але ж... Вось вытрымкі з аднаго з лістоў: «Мы ўспрымаем магчымае прыняцце такой нормы заканадаўства неабгрунтаваным і недапушчальным для сучаснага грамадства ўціскам яго няверуючай часткі. Ахоўванне рэлігійных пачуццяў вернікаў не павінна ператварацца ў насілле над пераканаННямі і пачуццямі носьбітаў матэрыялістычнага светапогляду, якія ў выпадку зацвярджэння адзначанай нормы, могуць быць вымушанымі стаць непаслядоўнымі яе выканаўцамі. Нельга каб на змену ваяўнічаму атэізму да нас ішла агрэсіўная рэлігіязацыя». Вось так, проста і катэгарычна. Не хочам пісаць слова *Бог* з вялікай літары і ўсё, кропка... Што тут сказаць. Не хочаш пісаць — не пішы. Ёсць яшчэ людзі, на шчасце іх жменька, якія не хочуць пісаць з вялікай літары і такія словы, як *Радзіма, Беларусь, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Востраў Слёз...* Але ж, калі ты сапраўдны беларус, то паважай усё, што звязана з народам Беларусі, з яго гісторыяй, жыццём, верай. Ніхто не будзе табе перашкаджаць у атэістычных поглядах. Будзь атэістам, не маліся, не хадзі ў царкву, касцёл ці сінагогу, але ж паважай тых, хто робіць гэта, хто верыць у Бога, бо сапраўдныя вернікі да кожнага чалавека адносяцца з павагаю, у тым ліку і да цябе...

Адразу адрынулі мы і яшчэ адну радыкальную прапанову — для спрашчэння правапісу ўзвесці ў абсалют правіла «як чуем, так і пішам». Справа ў тым, што ад прыроды не ўсе аднолькава вымаўляюць адно і тое ж слова. Мяне падтрымаюць вучні, якія добра ведаюць, што ў аднаго настаўніка дыктоўка пішацца добра, бо нават незнаёмыя словы ім вымаўляюцца зразумела, а ў другога — наадварот, знаёмае не пазнаць. Не аднолькава мы ўспрымаем і на слых. Успомніце дзіцячую гульню «сапсаваны тэлефон» (дзеткі, седзячы адзін каля аднаго, шэпчуць на вуха суседу адно і тое ж слова. Пакуль яно дойдзе ад першага да апошняга, то ператворыцца зусім у іншае)...

Душою мы прымаем неабходнасць замацавання адзіных правіл напісання *—оў* у родным склоне множнага ліку (слоў ці *словаў, моў* ці *моваў),* а таксама змяненні прынцыпаў выкарыстання флексій *—а/-у* роднага склону адзіночнага ліку. Бо блытаніна з імі велізарная. Але ж навукоўцы нам пярэчаць — гэта марфалогія, а не арфаграфія і пунктуацыя.

Дзякуючы аўтару аднаго з лістоў, у час падрыхтоўкі законапраекта да разгляду ў першым чытанні выявілася яшчэ адно вельмі важнае пытанне, таксама звязанае з уплывам прапануемых зменаў у беларускім правапісе на іншыя бакі жыцця краіны. А менавіта, як паўплываюць змяненні на тэрміналогію навуковай і навукова-тэхнічнай літаратуры?.. Бо, вядома ж, мастацкая і навуковая літаратуры маюць адрозненні. Пісьменнік ці паэт могуць прэтэндаваць на «словатворчасць», на змяненні ў напісанні слоў, навуковец — не, бо ёсць нормы і правілы напісання навуковых тэрмінаў і назваў, характэрныя не для асобнай краіны, а для сусветнага супольніцтва. Гэта ў адказ на радыкальную прапанову развіцця з прынцыпам падзелу слоў на свае і замежныя, і «зрабіць асноваў тое, што слова, якое трапіла ў кантэкст беларускай мовы, падпарадкоўваецца яе правілам нароўні з іншымі словамі, незалежна ад паходжання». Не ўсё так проста, як падаецца. Змены могуць прывесці да таго, што вучоныя перастануць разумець адзін аднаго, бо ў навуковай і навукова-тэхнічнай літаратуры пераважаюць запазычаныя словы замежнага паходжання. *Электронвольт* можа стаць *электранвольтам*, *небаскроб — хмарачосам*, *перпендыкуляр — старчаком.* Зноў такі, выходзячы з прынцыпу «не нашкодзь», ад імя Камісіі мы накіравалі ў Нацыянальную акадэмію навук Беларусі ліст, у якім папрасілі стварыць кампетэнтную камісію з навукоўцаў, якая б магла даць адназначны адказ на пытанне аб тым, акажуць правілы негатыўны ўплыў на зносіны ў навуцы і тэхніцы ці не. А калі негатыўны момант існуе, то даслаць канкрэтныя прапановы па ўдасканаленні правіл. Таму замацаванне законам сферы дзейнасці, дзе патрабуецца выкарыстанне моўнага нарматыву, пакуль таксама ў стане абмеркавання. Дарэчы, ужо распрацавана камп'ютэрная праграма па выпраўленні тэкставых памылак, і яе распаўсюджанне залежыць ад прыняцця змен у Правілы арфаграфіі і пунктуацыі.

Мы вельмі ўдзячны ўсім, без выключэння, аўтарам лістоў, бо напісаўшы ў адрас Камісіі, яны выказалі сваё неразуладушша да лёсу мовы беларускага народа, а гэта сведчыць аб іх высокай грамадзянскасці. Праца над праектам будзе доўжыцца, і мы з задавальненнем будзем знаёміцца і далей з прапановамі па ўдасканаленню беларускага правапісу, за выключэннем тых, у якіх прасочваюцца ідэі аб ператварэнні праблем арфаграфіі і пунктуацыі ў сродак барацьбы за палітычныя погляды. Мы, дэпутаты, працуем у парламенце дзеля згоды ў грамадстве і лічым, што толькі парадак і спакой найлепшым чынам спрыяюць паляпшэнню жыцця чалавека, у тым ліку і носьбіта беларускай мовы.

Старшыня Пастаяннай камісіі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

ДАКЛАД МАЦІЯСА ПЛАТЦЭКА

Беларусь і свет

Днямі ў Мінскім адукацыйным цэнтры (МАЦ) імя Іаганеса Рау з дакладам выступіў прэм'ер-міністр федэральнай зямлі Брандэнбург Маціяс Платцэк

У беларускую сталіцу ён прыбыў для ўдзелу ў другім міжнародным дыспуце памяці сябра Беларусі Іаганеса Рау — былога прэм'ер-міністра самай вялікай па колькасці насельніцтва і самай эканамічна развітой зямлі ФРГ Паўночны Рэйн-Вестфалія. З 1999 па 2004 год — федэральнага прэзідэнта Германіі. У свой час Рау шмат зрабіў для наладжвання стасункаў маладой беларускай дзяржавы з палітычнымі, дзелавымі коламі ФРГ, яе шматлікімі грамадскімі арганізацыямі. Невыпадкова МЗС Беларусі выступіла з ініцыятывай прысвоіць МАЦ імя Іаганеса Рау пасля яго заўчаснай смерці.

Тэма выступлення Маціяса Платцэка «Палітычная і эканамічная трансфармацыя ў Еўропе на прыкладзе зямлі Брандэнбург» выклікала вялікую цікавасць. Паслухаць вядомага палітыка з ФРГ прыйшлі тыя, хто прафесійна займаецца праблематыкай беларуска-германскіх адносінаў, дэпутаты парламента, дыпламаты, навукоўцы, палітолагі.

Сярод тых, хто ўважліва слухаў нямецкага госця і выступіў, былі міністр замежных спраў Сяргей Мартынаў і Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт. Калі апошні ў асноўным гаварыў аб значэнні хрысціянскай спадчыны Іаганеса Рау, яго ролі як царкоўнага дзеяча ва ўсталяванні прыязных адносінаў немцаў з народамі Еўропы, то Сяргей Мартынаў быў больш канкрэтным і прагматычным. Ён высока ацаніў узровень адносінаў нашай краіны і зямлі Брандэнбург, вынікі іх узаемадзеяння. З Брандэнбургам, паводле слоў Сяргея Мартынава, у Беларусі на ўсходзе Германіі склаліся прыкладна такія ж інтэнсіўныя стасункі, як і з зямлёй Паўночны Рэйн-Вестфалія на захадзе ФРГ.

Улічваючы, што Маціяс Платцэк упершыню знаходзіўся ў нашай краіне, міністр палічыў мэтазгодным нагадаць удзельнікам дыспуту, што наша МЗС разглядае яго візіт як яшчэ адзін крок на шляху ўмацавання беларуска-германскіх сувязяў. Міністр адзначыў, што для нас, у прыватнасці, уяўляюць інтарэс здабыткі зямлі Брандэнбург па пераходзе на рынкавыя ўмовы гаспадарання, у трансгранічным супрацоўніцтве, у станаўленні малога і сярэдняга бізнэсу, у сферы рэсурсазберажэння і эканоміі энерганосьбітаў.

Але шырокія кантакты і абмен вопытам магчымыя толькі ва ўмовах адкрытага дыялогу. Ён больш эфектыўны інструмент пераадолення супярэчнасцяў, чым любыя санкцыі і абмежаванні. У працэсе пошуку новых шляхоў нашага ўзаемадзеяння з Еўропай важны і прынцыповы ўклад можа ўнесці менавіта Германія з улікам дасягнутага ўзроўню супрацоўніцтва ў розных сферах, лепшага ведання беларускіх рэалій і таго гістарычнага фактара, які цесна нас звязаў. З гэтай нагоды наша краіна зацікаўлена ў развіцці поўнамаштабнага супрацоўніцтва з Германіяй, сказаў Сяргей Мартынаў.

Нагадаем, жыхары Беларусі і цяперашняй новай усходняй зямлі Брандэнбург маюць тысячы сувязяў, якія былі закладзены яшчэ ў часы існавання СССР і ГДР. Як былы яе грамадзянін Маціяс Платцэк (ён на дыспуце выступіў у ролі асноўнага дакладчыка) выдатна памятае тыя часы.

Цяпер Германія іншая, але палітыка і палітыкі павінны ўсяляк садзейнічаць аб'яднанню, а не расколу народаў і дзяржаў, гаварыў прамоўца. На яго думку, у жыцці не бывае без супярэчнасцяў, якія трэба ўпарта і мэтанакіравана пераадольваць. Менавіта гэтаму вучыў Іаганес Рау.

Маціяс Платцэк даволі падрабязна расказаў аб гістарычным мінулым сваёй роднай зямлі, акрэсліў сённяшнюю сітуацыю ў Брандэнбургу, назваў верагодныя шляхі супрацоўніцтва з нашай краінай. У прыватнасці, у галіне энергетыкі. У гэтай зямлі Брандэнбург з Беларуссю, лічыць прэм'ер-міністр, шмат агульнага. Напрыклад, у эканамічнай сферы, у галіне сельскай гаспадаркі. І гэты фактар неабходна выкарыстоўваць.

Маціяс Платцэк, як прыхільнік ідэй Іаганеса Рау, выказаўся на карысць вырашэння супярэчнасцяў рознага характару на аснове дыялогу, дарэчы, што было ў духу дыспуту ў Мінску.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ДАРОГІ, ДАРОЖНІКІ І ФІНАНСАВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Што можна сказаць пра стан рэспубліканскіх і мясцовых дарог?

— Сёлета плануецца адрамантаваць бягучым рамонтам каля 60 працэнтаў дарог агульнага карыстання, заяўленых у праграме — каля 3,5 тысячы км. Капітальным рамонтам будуць ахоплены 667 км дарог агульнага карыстання. Па прычыне недахопу фінансавых сродкаў не ўяўляецца магчымым выканаць капрамонт аўтадарог М-5, М-7, М-8 і М-11. Разам з тым з апераджэннем будзе праведзены рамонт дарог М-1/Е30, М-2. Згодна з даручэннем урада, за сродкі крэдыту ААТ «ААБ Беларусбанк» у 2007—2008 гадах будзе ажыццяўляцца комплексны рамонт аўтадарог М-1/Е30. Плануецца пабудаваць або рэканструяваць і ўвесці ў эксплуатацыю 123 км дарог агульнага карыстання, 1242 пагонныя метры мастоў.

— Якія работы выконваюцца ў межах праграмы адраджэння і развіцця вёскі?

— Будзе адрамантавана і рэканструявана 1778,8 км мясцовых дарог, што адпавядае заданню. Сёлета на ўтварэнне дадатковай інфраструктуры аграгарадкоў з рэспубліканскага дарожнага фонду выдаткуюваецца 242 млрд рублёў. За гэтыя сродкі будуць упарадкаваны тэрыторыі збожжаачышчальных комплексаў і зернетакоў, заасфальтаваны пад'езды да іх, пабудаваны новыя сховішчы для закладкі і захоўвання здробненага або плюшчанага зерня павышанай вільготнасці.

— Які ўклад у бяспеку руху робіць «Белаўтадар»?

— У мінулым і гэтым годзе мы ўладкавалі і адрамантавалі амаль 150 км тратуараў і пешаходных дарожак у населеных пунктах і на падыходах да іх. Для раздзялення транспартных і пешаходных патокаў, арганізацыі пешаходнага руху заасфальтавалі 60 км узбочын. Аднавілі 125 км асвятлення ўчасткаў дарог, замянілі каля 33 тысяч старых дарожных знакаў, адрамантавалі 76 пагонных метраў дарожнай бар'ернай агароджы, уладкавалі і рэканструявалі шэраг пляцовак для аўтобусных прыпынкаў, аўтапавільёнаў, пляцовак для адпачынку. Абнавілі гарызантальную разметку пакрыццяў усіх рэспубліканскіх дарог. У выніку колькасць дарожна-транспартных здарэнняў на рэспубліканскіх дарогах знізілася за 9 месяцаў гэтага года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага на 4,2 працэнта, колькасць загінулых — на 2,2 працэнта, параненых — на 6,6 працэнта. Дарэчы, нельга не сказаць пра новае слова ў бяспецы дарожнага руху. Гэта тросавая бар'ерная агароджа. Як вядома, у нашай краіне традыцыйна прымяняецца металічная агароджа. За многія гады эксплуатацыі яна даказала сваю эфектыўнасць і неаднойчы выратоўвала вадзіцелям жыццё. Такая канструкцыя выключае магчымасць выезду транспартнага сродку на паласу сустрэчнага руху, аднак у выпадку наезду на яе часта фіксуюцца выпадкі сур'ёзных пашкоджанняў аўтамабіляў, траўмы вадзіцеляў і пасажыраў. Даволі дарагой з'яўляецца і працэдура аднаўлення металічнай агароджы. Тым часам у Скандынаўскіх краінах, напрыклад, замест металічнага «бар'ера» даволі шырока выкарыстоўваецца тросавы аналаг. Ён раўнамерна паглынае ўдар і значна змякчае яго. Да таго ж, менш каштуе. Яшчэ летась мы закупілі пэўны аб'ём імпартнай тросавай агароджы і ўстанавілі яе працягласцю 12 км на аўтадарогах М-1/Е30 Брэст—Мінск—мяжа Расійскай Федэрацыі і М-6 Мінск—Гродна. Нават такая невялікая працягласць устаноўленай агароджы ўжо даказала сваю эфектыўнасць. У ДТЗ, якія тут мелі месца быць, сур'ёзна не пацярпеў ніводзін чалавек. Мы плануем значна пашырыць практыку ўстаноўкі такой агароджы, у тым ліку замяніць некаторыя элементы яе канструкцыі аналагамі айчыннай вытворчасці.

— Раскажыце, калі ласка, аб укараненні новых тэхналогій на аўтатрасах краіны.

— У галіне ўзвядзення мастоў перспектыўным накірункам з'яўляецца будаўніцтва маналітных збудаванняў. Па такой тэхналогіі сёлета ўзведзены пуцеправод на аўтадарозе М-2 Мінск—Нацыянальны аэрапорт «Мінск». Мяркуецца, што гэта практыка атрымае актыўнае развіццё. Пры наладцы абарончых слаёў на маставых збудаваннях добра зарэкамендавала сябе мембранная тэхналогія, з дапамогай якой можна процістаяць уздзеянню вады, утварэнню трэшчын і г.д. У якасці пакрыцця выкарыстоўваецца і асфальтабетон, прыгатаваны на аснове бітуму, мадыфікаванага палімерамі. Яго даўгавечнасць амаль у 2 разы вышэйшая за традыцыйныя пакрыцці. Працягваецца выкарыстанне і шчэбнева-мастычных асфальтабетонаў, якія павялічваюць даўгавечнасць дарожных пакрыццяў пры руху транспартнага патоку з цяперашняй інтэнсіўнасцю і грузанапружанасцю. Упершыню ў рэспубліцы сёлета прымяняецца тэхналогія выкарыстання тонкага абарончага пакрыцця з асфальтабетоннай сумессю на мадыфікаваным бітуме па аналогіі з «Novachip». Такое пакрыццё з'явіцца на 50 км аўтадарогі М-1/Е30. Гэта тэхналогія дазваляе адкрыць рух транспарту па новым пакрыцці за кароткі час, яна служыць удвая даўжэй, з'яўляецца рэсурса- і энергазберагальнай. У далейшым мы будзем пашыраць практыку выкарыстання новых тэхналогій, але, спадзяюся, ужо зараз карыстальнікі дарог адчулі перавагі сучасных метадаў вядзення дарожнай гаспадаркі.

— Дзякуй за гутарку і дазвольце ад імя «Звязды» павіншаваць вас з прафесійным святам, а таксама даць вам магчымасць сказаць шчырыя словы сваім калегам.

— Я хацеў бы выказаць працаўнікам дарожнай галіны словы ўдзячнасці за іх вельмі патрэбную працу, за адданасць гэтай справе. Жадаю і наваспечаным спецыялістам, і ветэранам галіны поспехаў ва ўсіх пачынаннях. Магу заверыць карыстальнікаў аўтамабільных дарог у тым, што найважнейшыя транспартныя артэрыі краіны знаходзяцца ў надзейных руках.

Гутарыла Святлана БАРЫСЕНКА.

Бухгалтерский баланс на 01.10.2007

ЗАО «Трастбанк», г. Минск, ул. Игнатенко, 11

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2007 г.	2006 г.
1	2	3	4	5	6
1.	АКТИВЫ				
2.	Денежные средства	1101	1	2 950,2	2 199,1
3.	Средства в Национальном банке	1102	2	3 012,6	4 233,2
4.	Ценные бумаги:	1103		7 219,8	4 044,7
	для торговли	11031	3	-	-
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	-	-
	в наличии для продажи	11033	3.2	7 219,8	4 044,7
5.	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	18 012,6	11 873,8
6.	Кредиты клиентам	1106	5	56 835,6	69 883,1
7.	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	98,0	59,4
8.	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	22 207,3	18 459,4
9.	Прочие активы	1109	8	5 134,2	6 723,5
10.	ИТОГО активы	110		115 470,3	117 476,2
11.	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА				
12.	Средства Национального банка	1202	9	-	-
13.	Кредиты и другие средства банков	1205	10	35 765,4	28 472,6
14.	Средства клиентов	1206	11	33 880,4	43 026,2
15.	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		-	-
16.	Прочие обязательства	1209	12	8 070,5	12 227,2
17.	ВСЕГО обязательства	120		77 716,3	83 726,0
18.	КАПИТАЛ				
19.	Уставный фонд	1211	13	14 501,0	14 501,0
20.	Эмиссионный доход	1212		-	-
21.	Резервный фонд	1213		2 754,2	2 405,8
22.	Накопленная прибыль	1214	14	2 558,4	2 642,4
23.	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	17 940,4	14 201,0
24.	ВСЕГО капитал	121		37 754,0	33 750,2
25.	ИТОГО обязательства и капитал	12		115 470,3	117 476,2
26.	ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ				
27.	Требования	1301	16	73 841,0	49 235,6
28.	Обязательства	1302	17	45 791,0	38 586,1

Отчет о прибыли и убытках на 01.10.2007

ЗАО «Трастбанк», г. Минск, ул. Игнатенко, 11

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	01.10.2007	01.10.2006
1	2	3	4	5	6
1.	Процентные доходы	2011		9 663,3	7 232,4
2.	Процентные расходы	2012		6 190,7	4 123,6
3.	Чистые процентные доходы	201	18	3 472,6	3 108,8
4.	Комиссионные доходы	2021		6 328,0	5 423,1
5.	Комиссионные расходы	2022		472,0	345,1
6.	Чистые комиссионные доходы	202	19	5 856,0	5 078,0
7.	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	805,9	634,5
8.	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	1,2	-48,0
9.	Доход в форме дивидендов	205		6,6	-
10.	Чистые отчисления в резервы	206	22	1 511,8	1 432,6
11.	Прочие доходы	207	23	2 228,6	2 565,5
12.	Операционные расходы	208	24	9 501,5	8 405,9
13.	Прочие расходы	209	25	664,4	581,3
14.	Налог на прибыль	210		275,9	411,7
15.	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ОТЧЕТНОГО ГОДА**			**417,3**	**507,3**

Генеральный директор ЗАО «Трастбанк» А.Д. Осмоловский
Главный бухгалтер Н.В. Бродик

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 14 от 27 октября 2006 г.

Лясны звярок — не цацка!

На фермерскай гаспадарцы «Астравецкае», што ў вёсцы Ізабеліна Астравецкага сельскага Савета з лесу выйшаў янотападобны сабака і, як у свае ўладанні, накіраваўся на тэрыторыю гаспадаркі.

Тамтэйшыя работнікі з радасцю сустрэлі ляснога «госця». Ды не толькі сустрэлі, а пачалі па чарзе браць яго на рукі, фатаграфавацца са «звярком». Нават жартавалі, што добрая шапка на зіму з яго атрымаецца...

Хтосьці з кемлівых патэлефанаваў у раённую ветэрынарную службу. Яе спецыялісты прынялі рашэнне: янота ўсыпіць! Як аказалася, гэта было своечасова і правільна: узятая экспертыза пацвердзіла, што янот быў шалёны. 7 чалавек, якія кантактавалі з ім праходзяць курс лячэння супраць шаленства.

Аляксандр СЯНЮЦЬ.

Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯБЁЛА.



Аўтаадказчык

АБКАТКА ЗІМОВАГА АБУТКУ

Хачу загадзя памяняць летнія шыны на зімовыя. Але сябры раяць дачакацца снегу на дарогах. Ці маюць яны рацыю?

Сяргей Заплужны, *г. Гомель.*

Не, вашы сябры памыляюцца, як і большасць айчынных аўтааматараў. Масавы пераход на зімовыя шыны ў нашай краіне звычайна адбываецца толькі пасля выпадзення снегу. Інакш кажучы, пакуль снег не выпадзе, беларускі аўтааматар не пераабуецца. Хоць спецыялісты раяць мяняць летнія шыны на зімовыя ўжо пры тэмпературы плюс 7 градусаў. Справа ў тым, што кожнаму, нават самаму вопытнаму шафёру, патрэбен пэўны час, каб прыстасавацца да новага абутку свайго «жалезнага каня», памяняць стыль кіравання. Варта нагадаць, што зімовыя шыны (з шыпамі альбо без іх) патрабуюць акуратнага абыходжання і вельмі беражлівай эксплуатацыі пры першых 100 кіламетрах. У прыватнасці, падчас абкаткі зімовага абутку нельга рэзка тармазіць, разгон і павароты трэба таксама рабіць плаўна і асцярожна.

Дарэчы, многія аўтааматары эканомяць і ставяць зімовыя шыны толькі на вядучыя колы. Але такая скупасць можа вылезці праз бок. Справа ў тым, што машынай з рознымі шынамі падчас рэзкіх тармажэнняў і ў іншых экстранных выпадках фактычна немагчыма кіраваць. Таму лепш набыць свайму транспартнаму сродку адразу ўвесь камплект зімовага абутку.

Аўтакансультацыя

ЗРУЧНА І БЯСПЛАТНА

Наведвальнікі гіпермаркета «Гіпа» маюць магчымасць атрымаць бясплатныя кансультацыі па набыцці аўтамабіляў і па многіх іншых пытаннях.

Днямі ў памянёным гіпермаркеце адкрыўся офіс холдынга «Атлант-М». Адметна, што эксперты холдынга будуць аказваць дапамогу падчас выбару кліентам аўтамабіля любой маркі і мадэлі, а не толькі тых транспартных сродкаў, якія ёсць у наяўнасці ў аўтацэнтрах «Атлант-М».

Аўтапрам

СЕМ ПЛЮС ПЯЦЬ

Кіраўніцтва «АўтаВАЗа» плануе аб'яднаць дзве мадэлі сваіх машын у адну. Распрацоўшчыкі возьмуць усё лепшае ад вельмі папулярных у савецкія часы «пяцёркі» і «сямёркі» і зноў запусцяць іх у масавы выпуск, але пад іншай назвай. Плануецца, што гібрыд памянёных аўто атрымае назву «Лада-Класіка».

Аўтадаследаванне

МАРУДНЫ ЛОНДАН

Брытанская сталіца прызнана самым марудным горадам краін Еўрасаюза. Да такой высновы прыйшлі даследчыкі, якія з дапамогай спадарожнікавай навігацыйнай сістэмы вызначалі сярэднюю хуткасць перамяшчэння ў 30 буйнейшых гарадах ЕС. Такім чынам, у Лондане сярэдняя хуткасць руху аўтамабіля складае 19 км/г. На другім месцы ў гэтым своеасаблівым «рэйтынгу маруднасці» Берлін, дзе можна разагнацца да 24 км/г, на трэцім — Варшава: 26 км/г. А вось «самым шпаркім» горадам у Еўрасаюзе з'яўляецца шатландскі Глазга, на вуліцах якога машыны імчаць з хуткасцю 84 км/г.

Аўтагонкі

СОНЦА ІМ ДАПАМОЖА

У Аўстраліі стартавалі гонкі аўтамабіляў на сонечных батарэях. Удзел у спаборніцтвах бяруць 38 транспартных сродкаў. Камандам з 17 краін свету неабходна будзе праехаць 3 тыс. кіламетраў.

Аўтакур'ёз

ПАМЯНЯЛА «MUSTANG» НА БУЛЬДОГА

У жыхаркі амерыканскага горада Сан-Антоніа згубіўся сабака. Напачатку жанчына абяцала ўзнагароду ў памеры 500 долараў асобам, якія адшукаюць і вернуць яе бульдога. Аднак на гэтую абвестку ніхто не адгукнуўся. Тады жанчына паведаміла, што ў якасці падзякі за знойдзенага сабаку падорыць спартыўны аўтамабіль «Ford Mustang» коштам амаль 10 тыс. долараў. Гэты стымул аказаўся

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

24 кастрычніка 2007 г. № 41 (95)

ЧЫНОЎНІКІ СУПРАЦЬ ЧЭРГАЎ

Мясцовая ўлада авалодвае сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі

Ці памятаеце вы вялізныя чэргі ў кабінеты да чыноўнікаў? Дзіўнае пытанне, адкажуць іншыя, і ўзгадаюць доўгія гадзіны чакання і пакутлівыя блуканні па шматлікіх калідорах дзяржаўных установ. Бюракратычная машына яшчэ да нядаўняга часу ў шэрагу выпадкаў працавала зусім не ў інтарэсах «звычайнага» чалавека. Прычым такое становішча многім падавалася проста непераадольным...

Колькі «жыве» папера?

Аднак кардынальныя змяненні сістэмы ўсё ж адбыліся. Пачатак адміністрацыйнай «перабудове» быў пакладзены ў верасні 2005 года, калі ўбачыў свет вядомы Указ кіраўніка дзяржавы № 452. З таго часу пачалося ўдасканаленне стылю работы дзяржаўнага апарату. Лагічным працягам стаў Указ № 152, які з'явіўся ў сакавіку мінулага года. Гэтым дакументам зацверджаны пералік адміністрацыйных працэдур, якія выконваюцца рознымі ўстановамі, куды людзі звяртаюцца для афармлення неабходных папер. Усяго вызначана 414 працэдур, якія датычацца самых розных сфер — ад жыллёва-камунальнай да «сацыялкі». Быў устаноўлены і максімальны тэрмін зваротаў людзей і выдачы патрэбных дакументаў, а таксама памер плацяжоў за тую ці іншую даведку.

— Удасканаленне нарматыўна-прававой базы для арганізацыі работы паводле прынцыпу «аднаго акна» працягваецца — Указам кіраўніка дзяржавы № 402 ад 6 верасня гэтага года быў істотна пашыраны пералік адпаведных адміністрацыйных працэдур, — адзначае галоўны спецыяліст аддзела пісьмаў і арганізацыі прыёму грамадзян кіраўніцтва справамі Мінскага аблвыканкама Юлія Туміловіч. — Указам вызначаны тэрміны дзеяння даведак і дакументаў, якія выдадзены па заявах грамадзян. Цяпер чалавек дакладна ведае, на працягу якога часу сапраўдная тая ці іншая афіцыйная папера. Пэўная частка адміністрацыйных працэдур выконваецца на платнай аснове. І тут узнікалі пэўныя праблемы, паколькі раней чалавек разлічваўся пасля выканання дзяржаўнымі ўстановамі адпаведных дзеянняў. Здаралася, што заяўнік не прыходзіў па заказаныя дакументы і ўсе выдаткі па іх афармленні несла тая ці іншая арганізацыя. Цяпер прынцып змяніўся: калі ад чалавека прымаецца заява, то адначасова патрэбна зрабіць папярэднюю аплату. І толькі пасля гэтага накіроўваецца неабходны запыт.

З першых вуснаў

На Міншчыне, як, дарэчы, і ў іншых рэгіёнах, рэгулярна праводзяцца «гарачыя» лініі, падчас іх жыхары могуць атрымаць адказы на надзённыя пытанні, што называецца, з першых вуснаў — ад кампетэнтных спецыялістаў. Вось ужо на працягу больш чым паўгода (з 12 красавіка) на афіцыйным Інтэрнэт-сайце Мінскага аблвыканкама працуе асобны раздзел «Адно акно».

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ХТО Ў ВЫЙГРЫШЫ АД ІНІЦЫЯТЫВЫ?

Наш карэспандэнт не толькі пабываў на лепшай турыстычнай сядзібе Віцебскага раёна «Задзвінне», што за 25 кіламетраў ад Віцебска на беразе Заходняй Дзвіны, але і стаў сведкам абмеркавання ў сельскім Савеце адпаведных праблем і новых турыстычных праектаў.

Амаль ужо год муж і жонка: Анатоль Сяргеевіч і Вольга Міхайлаўна Тулянкіны з вёскі Задзвінне Віцебскага раёна займаюцца прыёмам турыстаў. Актыўна дапамагае ім сын Міхаіл — 11-класнік 1-й віцебскай гімназіі.

Гэта фантастыка — гаварылі іншаземцы

Анатоль Сяргеевіч, калі мы пазнаёміліся, адразу адзначыў, што займаюцца яны агратурызмам, бо цікава, але ж не мараць аб вельмі вялікім «патоку» гасцей. Ён падлічыў, што ўжо прыняў больш за 100 чалавек з Беларусі, Расіі, Кітая, Польшчы, Іспаніі і г.д. Калісьці ён наведаў шмат краін, дзе засталося шмат сяброў — вось яны і прапануюць сваім знаёмым наведаць «Задзвінне». Гаспадары сядзібы, дзе адначасова могуць адпачыць 10 чалавек, з'яўляюцца членамі беларускай асацыяцыі агратурызму. Значыць, адпаведная інфармацыя ёсць на спецыяльным сайце і ў рэкламнай прадукцыі. Вольга Міхайлаўна расказала, што скончыла сёлета спецыяльныя курсы для арганізатараў турызму. Менавіта яна і была ініцыятарам арганізацыі сямейнага аграбізнэсу. Такія кліенты, якім хочацца за горад, каб толькі гарэлкі папіць, ім не патрэбныя. Таму і не ўсіх запрашаюць. І маюць рацыю, бо шмат працы ўклалі ў стварэнне непаўторнай атмасферы на сваёй сядзібе, якой ужо амаль 20 гадоў. Многа цікавага прыдумалі, каб адпачынак у «Задзвінні» прыезджыя запомнілі надоўга. Аддаюць перавагу людзям сямейным. Вольга Міхайлаўна нават плануе стварыць клуб гасцей. (Цікавая ідэя!) Гаспадары шчыра рады тым, хто хоча ацаніць прыгажосць прыроды, утульнасць у доме і гасціннасць, а яшчэ разнастайную, як кажуць, культурную праграму. Напрыклад, калі ёсць такое жаданне ў гасцей, запрашаюць арнітолага, які можа звадзіць у лес і на балота, паказаць рэдкіх птушак, у тым ліку і драпежнікаў, расказаць шмат чаго пра іх жыццё. Наогул, у лес арганізуюцца паходы па грыбы і ягады — іх тут шмат. Дарэчы, на ўчастку некаторыя кусты ягад спецыяльна не абіраюць, каб карміліся птушкі. Вольга Міхайлаўна падкормлівае качак на рацэ. Гасціць прылятаюць лебедзі, падплывае да сядзібы бабёр.

Яшчэ тут можна купіць вырабы майстроў народных рамёстваў. У вёсцы Курына — цэнтры сельсавета — турыстам вельмі падабаецца «беларускі куточак», створаны ў будынку бібліятэкі Вольгай Рыбаковай, якая тут і працуе. З бяросты яна робіць усякія вырабы, што ідуць «на ўра». У бібліятэцы каля 120 экспанатаў: рарытэтныя бязмен, звон, вугальныя прасы, фуган, гарлач, якому больш за 100 гадоў, піла, карыта і інш... Невялічкая калекцыя традыцыйных прадметаў быту беларусаў ёсць і ў самой сядзібе. А ля яе — рай: толькі вяргінь больш за 70 гатункаў!

У «Задзвінні» могуць прапанаваць некалькі варыянтаў адпачынку. Можна прыехаць на столькі, на колькі пажадаеш, правесці выхадныя з сябрамі, проста папраўіць здароўе ў цудоўнай лазні, перад наведваннем якой гаспадары прадаставяць усе неабходныя «аксесуары». За дадатковую плату можна прайсці сеанс масажу. (Адпаведная падрыхтоўка ёсць у сына гаспадароў). Пасля лазні пачастуюць гарбатай на травах. А як прыемна будзе закаханым правесці на сядзібе рамантычны вечар! Спыняюцца тут і паляўнічыя. Недалёка ад вёскі Задзвінне знаходзіцца музей — сядзіба знакамітага мастака Рэпіна. У пасёлку Руба зімой вельмі падабаецца лыжнікам — спецыяльныя трасы тут падрыхтаваны і абкатаны не адзін год. Ёсць у «Задзвінні» веласіпеды, лодкі, два аўтамабілі: УАЗ і ГАЗ, што пройдуць паўсюль.

Што датычыцца крэдытаў, уладальнікі сядзібы адзначаюць, што цяпер, дзякуючы прывабным умовам крэдытавання, яны сталі даступныя. Наогул, патрабаванні для тых, хто хоча заняцца арганізацыяй сельскага турызму, невялікія. Трэба мець домік у вёсцы, дзе ёсць не болей за пяць абсталяваных пакояў для гасцей. Каб пачаць бізнэс, неабходна заплаціць усяго адну базавую велічыню ў сельвыканкам і прадставіць квітанцыю ў падатковую інспекцыю. Работнікі сельвыканкама пасля даследавання санітарна-гігіенічных умоў даюць дазвол на прыём гасцей. А што з гэтага будзе мець сельскі Савет?

Турызм не папаўняе бюджэт

«Задзвінне» — адзіны аб'ект аграэкатурызму на тэрыторыі Курынскага сельсавета. Ды і ва ўсім Віцебскім раёне ўсяго тры прыватныя сядзібы для турыстаў. Чаму? — пацікавіўся я ў прадстаўнікоў улады.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

АДКРЫТЫ ФОРУМ

ЗВЯРТАЙЦЕСЯ ПРАВІЛЬНА — І ВАС ПАЧУЮЦЬ

У не такія далёкія савецкія часы быў вельмі папулярны лозунг «кліент заўсёды мае рацыю» — у дачыненні да работы ўстаноў гандлю і сферы паслуг. І хоць цяжка было мець рацыю, стоячы перад пустымі паліцамі, лозунг, як сцяг, лунаў над кожнай установай, якая сябе паважала.

Чаму ўспомніла пра гэта? Ды таму, што сёння кожны з нас таксама выступае як «кліент» у дачыненні да «паслуг», якія прадастаўляюць мясцовыя органы ўлады. Вада, дарогі, святло, ацяпленне кватэр, рамонт пад'ездаў і дахаў, належны ўзровень адукацыі і медабслугоўвання, сацыяльная дапамога і працаўладкаванне — вось далёка не поўны пералік таго, што павінна забяспечваць нам улада.

Мы ж, як спажыўцы гэтых паслуг, маем права быць задаволенымі ці не задаволенымі іх узроўнем і якасцю і ў выпадку незадаволенасці звяртацца да мясцовай улады са сваімі прэтэнзіямі. Многія так і робяць, пачынаючы вырашэнне праблемы менавіта з наведвання мясцовага кіраўніцтва. Але пэўная катэгорыя грамадзян, першапачаткова не давяраючы «пророкам в своем Отечестве», адразу хапаецца за пяро і паперу — і вось ужо ляцяць у сталіцу пісьмы са скаргамі на халодныя батарэі і «худыя» дахі, на дрэнныя дарогі і звалкі смецця...

Між тым, звароты, якія датычацца падобных праблем, павінны вырашацца на месцах. Менавіта дзеля гэтага і быў распрацаваны Указ № 498 «Аб дадатковых мерах па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асобаў». Ён перакладае адказнасць за вырашэнне большасці пытанняў, з якімі звяртаюцца людзі, на мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. Цяпер усе звароты, якія паступаюць у тыя ці іншыя органы дзяржаўнай улады, спачатку павінны быць разгледжаны на нізавым узроўні. А для непасрэдных зносінаў з чыноўнікамі Указ устанаўлівае адзіны дзень прыёму — сераду. Наколькі сугучныя прапанаваныя навацыі з настроем кіраўнікоў пярвічнага звяна ўлады?

Сцяпан ВАЖЫНСКІ, старшыня Закозельскага сельскага Савета дэпутатаў Драгічынскага раёна:

— Я вам скажу, што кожную сераду ў мяне і так прыёмны дзень — з 8 да 12, а потым з 17 да 20. А ўвогуле прыём грамадзян я праводжу, акрамя серады, па панядзелках і пятніцах. Але калі вы думаеце, што ў астатнія дні або ў суботу ці нядзелю я ад гэтага свабодны, то памыляецеся. Вось сядзіш у нядзелю дома, а камусьці раптам спатрэбілася даведка на рынак. Безумоўна, выручаем. Гэта, напэўна, спецыфіка ўсёй вёскі. Сумлення не хопіць чалавеку адмовіць. Прыйдзе бабулька з палачкай, а я ёй — даруйце, дзень непрыёмны? У прыёмныя дні я, зразумела, стараюся быць на месцы, але не заўсёды атрымліваецца. У такіх выпадках на дзвярах кабінета вывешваем аб'яву аб тым, што прыёмам грамадзян у сувязі з адсутнасцю старшыні займаецца сакратар сельвыканкама.

Добра, што цяпер разбірацца са зваротам ці скаргай трэба будзе «знізу даверху», пачынаючы ад пярвічнага звяна ўлады і — калі там не здолелі вырашыць пытанне — далей. Гэта правільна. А то многія займелі моду ледзь што — адразу скардзіцца ў Адміністрацыю Прэзідэнта. Вось у мяне не так даўно быў выпадак. Цыганская сям'я, у якой ніхто ніколі ў жыцці не працаваў, пажадала ўзяць крэдыт на будаўніцтва жылля. Зразумела, ім адмовілі. Пасля гэтага жанчына (з дапамогай добразычліўцаў) напісала петыцыю Аляксандру Рыгоравічу... Ды і не адна яна такая. Хоць, на мой погляд, 90 працэнтаў усіх пытанняў можа вырашацца на месцы — не на ўзроўні сельскага Савета, дык на ўзроўні раённых уладаў.

Натуральна, будаўніцтва станцыі абезжалезвання вады — гэта, відаць, праблема ўсяго Палесся — не пацягне ні сельсавет, ні раён. А вось вуліцу расчысціць ад снегу ці аварыйнае дрэва спілаваць — наша задача. Умомант, за лічаныя гадзіны я гэтага не зраблю — ну няма ў мяне тэхнікі спецыяльнай. Тут трэба крыху пачакаць. Галоўнае, што ўсё гэта абавязкова вырашыцца. Не трэба адразу бегчы званіць на «прамую лінію» ці «гарачы тэлефон»!.. Мы ж нікуды не схаваемся ад сваіх абавязкаў, для гэтага сюды і прыйшлі.

> Разбірацца са зваротам ці скаргай трэба будзе «знізу даверху»

Таіса ЛЕОНЧЫК, старшыня Беларуцкага сельскага Савета дэпутатаў Лагойскага раёна:

— Прачытала Указ і парадавалася таму, што нарэшце звароты грамадзян будуць разглядацца «па іерархіі». Калі раней грамадзянін мог звярнуцца ў Адміністрацыю Прэзідэнта ці ў абласную інстанцыю, абмінуўшы мясцовыя, то цяпер без заключэння адпаведных уладных структур пярвічнага ці раённага ўзроўню звароты разглядацца там не будуць. Усё павінна вырашацца па правілах.

Безумоўна, колькасць скаргаў у органы ўлады пярвічнага ўзроўню ў сувязі з гэтым павялічыцца. У нас — дакладна, бо сельсавет вельмі складаны, шмат садовых таварыстваў, дачных участкаў. Але мы ўжо прывыклі працаваць з вялікай колькасцю зваротаў грамадзян, нас гэта не палохае.

Якога характару звароты? Вялікая іх частка датычыцца вулічнага асвятлення, калі больш дакладна — яго недаўгавечнасці. Новыя лямпачкі гараць тыдзень-два, што гаворыць пра іх невысокую якасць. Летась шмат скаргаў было звязана з работай водаправода, адсутнасцю вады, але да канца года гэта пытанне вырашылася. У шасці населеных пунктах (там, дзе водазабеспячэнне цэнтралізаванае) мы зрэзалі старыя воданапорныя вежы і паставілі замест іх сучаснае абсталяванне — частотныя пераўтваральнікі, якія рэгулююць ціск і падачу вады, да таго ж, эканомяць электраэнергію.

Звароты ў вышэйшыя інстанцыі ад жыхароў нашага сельсавета датычыліся будаўніцтва станцый абезжалезвання. Ёсць у нас такія населеныя пункты (гэта пытанне вывучалася разам са спецыялістамі санстанцыі), дзе ўтрыманне жалеза ў вадзе ў шмат разоў перавышае норму. Людзі звярталіся да намесніка прэм'ер-міністра Віктара Буры з нагоды выдзялення сродкаў на будаўніцтва станцый, уключэння гэтых аб'ектаў у рэспубліканскую праграму «Чыстая вада». На жаль, мы спазніліся, у сувязі з чым цяпер давядзецца пачакаць...

На мой погляд, падобныя звароты цалкам апраўданыя, бо райвыканкам наўрад ці ў стане знайсці такія грошы — адна станцыя каштуе 70 млн рублёў, а нам іх патрэбна тры...

Аляксандр СЯНЧУК, старшыня Лугава-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў Мінскага раёна:

— Я чытаў Указ з пункту гледжання старшыні Савета, якому даводзіцца мець справу з вялікай колькасцю зваротаў. Тое, што серада будзе адзіным абавязковым днём асабістага прыёму грамадзян, для мяне, напрыклад, палёгка. Сёння ў мяне два прыёмныя дні (панядзелак і пятніца), ды яшчэ ў суботу даводзіцца працаваць.

Вось на мінулым тыдні мне патэлефанавалі з адной раённай арганізацыі, папрасілі паведаміць па тэлефоне інфармацыю і даць пэўныя тлумачэнні. Трымаю ў руках тэлефонную трубку, тлумачу... А ў прыёмнай у гэты час наведвальнік чакае — нервуецца, ясна дае мне зразумець, што незадаволены... Але ж я таксама вяду размову не на тэму «дзе мы з табой вечарам сустрэнемся?» — я вырашаю сур'ёзнае пытанне. Я для чаго вам гэта расказваю? Няхай серада будзе загружана «ад і да» праблемамі людзей, але гэта будзе IX дзень. І мяне, магчыма, менш будуць адрываць па іншых пытаннях.

Прыём грамадзян увогуле павінен быць больш упарадкаваным, на мой погляд. Асабліва ў вялікіх сельсаветах. А то сяджу ў выканкаме ў 8 гадзін вечара ў непрыёмны дзень, раблю свае справы — ідуць людзі. Чаму ідуць? Таму што «ў старшыні святло гарыць». І яны думаюць: а ці не зайсці мне, ці не вырашыць сваё пытанне, раз ён усё роўна тут?.. Трэба адыходзіць ад такога стаўлення да нашай работы. Падтрымліваю «іерархічную лесвіцу» для зваротаў — ад ніжэйстаячай структуры да вышэйстаячай. У прынцыпе сёння, і вы гэта ведаеце таксама, вялікая колькасць скаргаў не пацвярджаецца. Гэта праўда. З адной такой я ціпер разбіраюся. У аднаго грамадзяніна каля мяжы ўчастка пабудаваны гараж і хлеў. І ў яго суседа цераз мяжу тое самае было. Потым хлеў у суседа згарэў, і ён на гэтым месцы ўзвёў аналагічную пабудову з дошак. Дык вось першага грамадзяніна гэты факт чамусьці не ўзрадаваў — як так, самавольнае будаўніцтва! Тлумачу яму: чалавек аднавіў тое, што ўжо мела месца па тэхпашпарце. Але грамадзяніна гэты адказ не задаволіў, ён паабяцаў паскардзіцца вышэй. Ды калі ласка! Мы ўжо далі яму адказ, што факты, выкладзеныя ў яго звароце, не пацвердзіліся.

Наталля КАРПЕНКА.

ТЭМА ДНЯ

ШКЛОЎСКІЯ ЎРОКІ

Ці выправіла памылкі мясцовая ўлада?

19 кастрычніка ў Шклоўскім раёне прайшло выязное пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Яго тэмай стала выпраўленне памылак: два гады таму Шклоўшчыну наведаў Аляксандр Лукашэнка і выказаў шмат крытычных заўваг. Што зроблена за гэты час, якія меры прыняты, як наладжана праца з людзьмі — паказвалі і расказвалі ў Шклоўскім раёне.

Шклоў

Пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання адкрыў старшыня Савета Рэспублікі Генадзь Навіцкі. Ён сказаў, што прэтэнзіі да мясцовых уладаў, якія выказаў кіраўнік краіны два гады таму, сталі праграмай дзеяння і новым этапам для органаў улады ўсёй рэспублікі. Таму выязное пасяджэнне праводзіцца для таго, каб паглядзець, ці выпраўлены памылкі, а таксама і скарыстацца вопытам Шклоўскага раёна ў вырашэнні важных пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Барыс Батура распавёў членам Савета пра сацыяльна-эканамічнае развіццё Магілёўскай вобласці — выкананне прагнозных паказчыкаў і інвестыцыйныя праекты.

— Самая галоўная задача — гэта павелічэнне даходаў людзей, — зазначыў кіраўнік Магілёўшчыны. — Яшчэ пяць гадоў таму па даходах на душу насельніцтва вобласць займала апошняе месца ў краіне. А цяпер — «залатую сярэдзіну». Вось гэта мы і лічым самым галоўным дасягненнем.

Паводле слоў старшыні Шклоўскага райвыканкама Валерыя Іванова, павялічыліся даходы і ў жыхароў Шклоўшчыны. Цяпер сярэдні месячны заробак у раёне складае 580 тысяч рублёў, альбо 270 долараў.

Рыжкавічы

Праграма выязнога пасяджэння была вялікая. Спачатку госці пабывалі ў Рыжкавіцкім сельсавеце, дзе іх сустракала старшыня Святлана Васільева. Святлана Сямёнаўна працуе тут больш за 30 гадоў, і як яна сама кажа — «работа ладзіцца».

Рыжкавіцкі сельсавет — прыгарадны і вялікі. У яго складзе — больш за два дзесяткі населеных пунктаў, у якіх жыве амаль тры тысячы чалавек. Яго асаблівасцю з'яўляецца адсутнасць базавай сельскай гаспадаркі. Затое на тэрыторыі ёсць сем фермерскіх гаспадарак, некаторыя даволі буйныя, і сельсавет імкнецца супрацоўнічаць з імі. Яны ставяцца да праблем людзей і сельвыканкама з разуменнем і дапамагаюць чым могуць.

Безумоўна, праблем у Рыжкавіцкім сельсавеце хапае: Святлану Васільеву непакоіць, што насельніцтва старэе і людзі адмаўляюцца ад зямельных надзелаў, хоць раней зямля ў прыгарадзе Шклова была самай дэфіцытнай у раёне. Памяншаецца колькасць жывёлы, якую трымаюць вяскоўцы.

Затое не знікае з парадку дня праблема рамонту і чысткі калодзежаў, якіх на тэрыторыі сельсавета каля сотні. Так, усе яны ў рабочым стане, дагледжаныя, але справа ў тым, што не знаходзяцца ні на чыім балансе. Іх абслугоўванне сёння залежыць ад разумення праблемы кіраўніцтвам раёна і яго добрай волі. Праблему калодзежаў і калонак, увогуле водных сетак у вёсцы яшчэ давядзецца вырашаць.

— Два гады таму прагучалі прэтэнзіі Аляксандра Лукашэнкі ў адрас нашага раёна, і з таго часу шмат што змянілася, — упэўнена Васільева. — Вельмі добра, што на сельскія Саветы звярнулі ўвагу.

Па-першае, змянілася аблічча саміх сельсаветаў: у Рыжкавічах кабінеты прывялі ў парадак, зрабілі рамонт, і цяпер Савет выглядае дастойна.

Па-другое, змянілі рэжым працы. Усё зроблена для таго, каб наведвальніку было зручна прыехаць, атрымаць дакументы і кансультацыі.

Прынцып «адно акно» ўкаранёны. Для таго каб атрымаць пашпарт, чалавеку дастаткова прынесці толькі фатаздымак, а ўсё астатняе аформяць на месцы і самі адправяць у пашпартны стол, каб не марнаваць час людзей, не ганяць іх. Вяскоўцы задаволены і менш скардзяцца, сцвярджаюць у Рыжкавічах.

Стаматалогія

Удзельнікі Савета наведалі стаматалагічнае аддзяленне цэнтральнай раённай бальніцы. Менавіта да гэтай установы было шмат прэтэнзій два гады таму ў жыхароў раёна.

Нараканні выклікала дрэнная матэрыяльная база. Стаматалогія размяшчалася ў старым драўляным будынку. Арганізацыя лячэння была наладжана такім чынам, што няшчасным пацыентам даводзілася ездзіць у іншы канец горада, каб зрабіць здымак, а потым вяртацца да доктара на лячэнне.

Цяпер для людзей створаны ўсе ўмовы. Будынак адрамантаваны ў еўра-стылі. Працуе новае абсталяванне. Работа арганізавана ў дзве змены. За дзень тут прымаюць у сярэднім 150 чалавек — на паўсотні болей, чым раней. У шклоўскую «стаматалогію» прыязджаюць лячыць і пратэзіраваць зубы нават з суседніх сельскіх раёнаў — Круглянскага і Аршанскага.

Александрыя

Гэтым аграгарадком захапляліся ўсе госці без выключэння. Сельвыканкам, фізкультурна-аздараўленчы комплекс (са спартыўнай залай, басейнам і футбольным полем пад дахам), сельская ўрачэбная амбулаторыя, вучэбна-педагагічны комплекс «Дзіцячы садок—сярэдняя школа», крама, цэнтр культуры і вольнага часу — усё гэта зрабіла вялікае ўражанне.

Нічога ад звычайнага патрыярхальнага ўяўлення аб вёсцы ў сучаснай Александрыі не засталося. Гэта абсалютна еўрапейскі населены пункт, дзе вяскоўцы дасягнулі ўзроўню горада і пайшлі, падаецца, яшчэ далей.

Старшыня Александрыйскага сельскага Савета Леанід Ляўковіч расказаў, што цяпер шмат сілаў і сродкаў даводзіцца выдаткоўваць для таго, каб падтрымаць і захаваць у належным стане тое, што ўжо зроблена.

Акрамя гэтага, сельвыканкаму даводзіцца разбірацца з безгаспадарнымі дамамі — каб не псавалі выгляд сучаснай вёскі напаўразбураныя пабудовы. Два дзесяткі такіх хат, якія пуставалі, ужо ліквідаваны. І яшчэ з паўсотняй вядзецца праца. Там, дзе ёсць спадчыннікі і гаспадары, улада ідзе на перамовы і прапануе альтэрнатыву: альбо парадак — альбо знос.

Усе праблемы мясцовай уладзе дапамагае вырашаць гаспадарка — ААТ «Александрыйскае». Гавораць, што яго кіраўнік Віктар Дзюрдзь сам моцна любіць парадак, таму добраўпарадкаванне і культура земляробства ў Александрыі заўсёды на першым плане.

Работа над памылкамі

Пасля агляду Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання падвёў вынікі.

— Я назваў бы сённяшнюю сустрэчу «Праз два гады...», — сказаў старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Панцюхоў. — Гэта своеасаблівая справаздача аб зробленым пасля выяўлення шэрагу істотных недахопаў. І адзін з іх, нагадаю — няўзгодненасць паміж дзвюма галінамі ўлады: выканаўчай і прадстаўнічай. А таксама і праца з насельніцтвам.

Уладзімір Панцюхоў расказаў членам Савета, што была перагледжана ўся сістэма працы. Склад старшынь сельскіх Саветаў абнавіўся на трэць.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ДЫЯЛОГ

ЧАС АДМАЎЛЕННЯ АД СТЭРЭАТЫПАЎ

Адным з самых аб'ёмных і складаных у плане рэалізацыі на практыцы момантаў Указа № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва» з'яўляецца падпункт 8.2 пункта 8, дзе гаворыцца аб інвентарызацыі і перадачы на баланс спецыялізаваных арганізацый унутрывясковых дарог і сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення. Што датычыцца дарог, тут прапаноўваюцца два варыянты: перадаць іх на баланс альбо падраздзяленняў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, альбо — дарожных службаў. З водаканалізацыйнай сістэмай быццам бы ўсё проста — яе павінна забраць ЖКГ. У Маладзечанскім раёне знайшлі іншае выйсце. Падрабязней пра гэта, а таксама пра тэмпы рэалізацыі Указа ў цэлым мы папрасілі расказаць старшыню Маладзечанскага раённага Савета дэпутатаў Луцыю АРЛОВІЧ.

— Першапачаткова ў нашым раёне разглядаўся варыянт перадачы водаканалізацыйнай гаспадаркі на баланс камунальнікаў, — патлумачыла Луцыя Віктараўна. — Мы стварылі адпаведныя камісіі, правялі інвентарызацыю. Аднак калі дэталёва прааналізавалі сітуацыю — прыйшлі да высновы, што самым рацыянальным будзе перадаць раённыя водаправодныя сеткі КУП «Маладзечнаводаканал». Гэта салідная спецыялізаваная арганізацыя, якая раней абслугоўвала толькі сам горад, але ў яе ёсць і адпаведная база, і спецыялісты. Было вырашана пашырыць зону яе абслугоўвання на ўвесь раён.

— А сама арганізацыя як паставілася да такой дадатковай нагрузкі?

— Мы ўсе — дзяржаўныя людзі. Калі райвыканкам прыняў адпаведнае рашэнне — яго трэба выконваць. Кіраўніцтва «Маладзечнаводаканала» ўзважыла ўсе «за» і «супраць», разгледзела матэрыяльна-тэхнічную базу раённай ЖКГ і пагадзілася з намі, што такое выйсце — самае лагічнае. Каб не ўскладняць і не замаруджваць працэс, было вырашана правесці перадачу аб'ектаў па факце, не зважаючы на адсутнасць у шэрагу выпадкаў адпаведнай дакументацыі. Да 1 лістапада гэта работа ў раёне будзе завершана.

— А як вядзецца перадача дарог?

— Гэта складанае пытанне. У азначаным накірунку актыўна працуе Мінскі абласны Савет дэпутатаў, які рэгулярна запрашае нас на свае рабочыя нарады з удзелам прадстаўнікоў дарожных службаў. Апошнія ў якасці галоўнага аргумента супраць прыняцця на свой баланс унутрывясковых дарог спасылаюцца на недахоп сродкаў, патрэбных для іх утрымання. Мы звычайна парыруем: а як жа сёння выкручваюцца сельвыканкамы, у якіх увогуле ніякіх фінансаў на абслугоўванне дарог населеных пунктаў не прадугледжана? Неяк жа выкручваюцца. Звяртаюцца ў СВК, у ЖКГ да тых жа дарожнікаў. Усяго ў нашым раёне 525 км унутрывясковых дарог, 252 км з іх — безгаспадарчыя. Дарожнікі, у якіх ёсць і база, і спецыялісты, проста абавязаны прыняць вуліцы сельскіх населеных пунктаў на свой баланс, а пытанне фінансавання паступова вырашыцца (зразумела, не адразу, але вырашыцца абавязкова). Нашы раённыя водаканальшчыкі падышлі да вырашэння пастаўленай перад імі задачы па-дзяржаўнаму, а дарожныя службы «тармозяць» працэс рэалізацыі Указа Прэзідэнта, абараняюць свае вузкаведамасныя інтарэсы. Ведаю, што пасля выхаду Указа агучваліся прапановы перадаць унутрывясковыя дарогі на баланс ЖКГ, але гэта быў бы нерацыянальны крок. Я разважаю на ўзроўні свайго раёна: для таго, каб перадаць дарогі камунальнікам, неабходна спачатку стварыць участкі ЖКГ, «начыніць» іх тэхнікай і спецыялістамі. І ў выніку атрымаецца наступнае: па галоўнай вуліцы вёскі пройдзе снегаачышчальная тэхніка дарожнай службы, а за ёй — каб пачысціць бакавыя вулачкі — зноў жа з горада пойдзе спецтэхніка камунальнікаў. Двайны расход паліва, двайная амартызацыя. Адназначна недзяржаўны падыход! Пытанне з фінансаваннем павінна быць вырашана на рэспубліканскім узроўні, аднак перадаваць унутрывясковыя дарогі трэба менавіта дарожным службам, а не іншым арганізацыям.

— Ці перададзены ў вашым раёне аб'екты сацыяльнай галіны (дзіцячыя садкі, ДК і г.д.), якія раней знаходзіліся на балансе сельвыканкамаў?

— Вось ужо два гады як усе ўстановы культуры, аховы здароўя і адукацыі ў нас перададзены на баланс адпаведных арганізацый і ведамстваў. Засталося разабрацца з міні-палігонамі, а затым, паступова — з могілкамі — аддаць іх камунальнікам і вызваліць, нарэшце, старшынь ад гаспадарчых праблем. Указ № 21 прызваны змяніць статус прадстаўніка выканаўчай і прадстаўнічай улады пярвічнага ўзроўню. На гэтым і трэба зрабіць акцэнт. Раней як было? Патэлефанавалі людзі старшыні Савета, што ў пэўнай вёсцы няма вады. Яму неабходна знайсці грошы, патрэбнага спецыяліста. Ён сабраўся і паехаў вырашаць гэтае пытанне. Праблема лакальная, але патрабуе затрат часу, сілаў, фінансаў. Прыходзіць чалавек у сельвыканкам, а старшыні на месцы няма — займаецца вадой у Абрамаўшчыне. Сёння старшыня павінен ведаць, што ў пэўным населеным пункце няма вады, давесці гэта да ведама адпаведнай спецыялізаванай арганізацыі і пракантраляваць вырашэнне гэтай праблемы. Прававая база ў нашай краіне апошнім часам значна пашырыла кантрольныя функцыі Саветаў усіх узроўняў. Гэта мае велізарнае значэнне для павышэння статусу старшыні. Не апошнюю ролю тут іграе і матэрыяльна-тэхнічная база, забяспечанасць транспартам, мабільнай сувяззю, аргтэхнікай. Калі ў брыгадзіра ёсць сотавы тэлефон, а ў старшыні сельвыканкама яго няма — пра які аўтарытэт тут можна казаць?

Змяненне статусу мясцовай улады — працэс няпросты. І многае тут залежыць ад самога старшыні. Прыйшоў час змен у свядомасці, у падыходзе да работы, час адмаўлення ад стэрэатыпаў. Старшыні, якія прыйшлі нядаўна, лягчэй адаптуюцца да новых умоў, астатнім цяжэй — разумеце, гэта ж трэба мяняць псіхалогію. І ў першую чаргу змены датычацца ўзаемаадносінаў сельвыканкамаў з кіраўнікамі іншых дзяржаўных органаў, арганізацый і суб'ектаў гаспадарання ўсіх формаў уласнасці. Дабіцца таго, каб па-сапраўднаму сталі паважаць уладу пярвічнага ўзроўню, можна! Па-першае, за кошт кампетэнтнасці, высокай кваліфікаванасці, дасведчанасці, дысцыплінаванасці і ўмення працаваць з людзьмі самога старшыні. А па-другое, за кошт выканання ўсіх палажэнняў Указа № 21.

— На сустрэчах з членамі Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага кіравання пры Савеце Рэспублікі многія старшыні пярвічнага ўзроўню наракаюць на тое, што з 16 прапісаных ва Указе пунктаў папаўнення бюджэту пакуль «працуюць» толькі два: падатак на нерухомасць з фізічных асобаў і падатак на зямлю.

— У нашым раёне аналагічная сітуацыя. Ёсць асобныя сельсаветы, дзе здаюцца ў арэнду нейкія пабудовы і сельвыканкам мае з гэтага пэўны прыбытак. Агратурызм пакуль даходу не дае. Магчыма, з часам з'явіцца даход ад рэалізацыі аб'ектаў нерухомай маёмасці, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці раёна, вобласці. Тады сельвыканкамам можна будзе пакідаць 50 працэнтаў. Аднак гэта аднаразовыя выпадкі, а ім хочацца мець стабільны, пастаянны даход.

— А як наконт даходаў ад продажу зямлі праз аўкцыён?

— Схема работы па азначаным накірунку ў нас яшчэ не адпрацавана. Тут ёсць пэўныя складанасці. Хоць на перспектыву мы разлічваем на гэты даходны артыкул. У Маладзечанскім рэгіёне ён будзе эфектыўным, асабліва ў накірунку руху электрычак (Красненскі, Аляхновіцкі, Граніцкі, Радашковіцкі сельсаветы і г.д.).

— А ці займаюцца сельвыканкамы вашага раёна зборам малака ў насельніцтва?

— Райвыканкам прыняў рашэнне пакінуць гэта за сельгаспрадпрыемствамі. Мы дасканала вывучылі вопыт іншых рэгіёнаў і ўбачылі, што з улікам спецыфікі нашай тэрыторыі мы не зможам забяспечыць такія аб'ёмы закупу, якія б дазволілі перакрыць затраты і выйсці на прыбытак. Справа ў тым, што побач — амаль 100-тысячны горад, 190 дачных кааператываў, жыхары якіх набываюць малако, смятану, тварог. Плюс — электрычкі на Мінск, дзе вясковец таксама можа прадаць сваю прадукцыю.

— Прачытаўшы Указ № 21, некаторыя старшыні пярвічнага і базавага ўзроўню засталіся расчараванымі, бо не знайшлі там адказаў на ўсе свае пытанні.

— Межаў для ўдасканалення няма. Для рэалізацыі палажэнняў Указа патрэбны час (менавіта таму гэты год для нас такі знакавы). Жыццё ўносіць свае карэктывы, гэта нармальна. А Указ проста трэба дасканала вывучыць. І ўзяць яго на ўзбраенне разам з Законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь».

Інга МІНДАЛЁВА.

Маладзечанскі раён.

ШКЛОЎСКІЯ ЎРОКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Кадры вучылі, кожны складаў асабісты творчы план працы. Палепшылася матэрыяльная база сельскіх Саветаў, ідзе далейшае тэхнічнае пераўзбраенне.

Дзейнічае спаборніцтва паміж сельскімі Саветамі і старастамі вёсак. Напрыклад, летась перамог Прудкоўскі сельскі Савет Чавускага раёна: там дамагліся памяншэння колькасці правапарушэнняў больш чым у два разы, сярод непаўнагадовых — у пяць разоў. Там палепшылася дэмаграфічная сітуацыя, не засталося праблемных сем'яў, не было пажараў і гэтак далей.

У Магілёўскай вобласці ажывілі сістэму тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Тут цяпер налічваецца 1840 старастаў і 379 сельскіх камітэтаў. Напрыклад, у вёсцы Капані Чавускага раёна староста Людміла Двужыльная 44 гады выбіраецца дэпутатам: яна летась арганізавала разам з аднавяскоўцамі рамонт ФАПа і дамаглася выезду медыкаў для прыёму людзей. Староста вёскі Зацішша Бабруйскага раёна Яўген Календа сам усталяваў помнік ахвярам вайны і разбіў парк на сваёй зямлі. Дзякуючы намаганням старасты Васіля Котава ў вёсцы Нікуліна Горацкага раёна дасягнулі лепшага ўзроўню закупак малака ад насельніцтва — тры тысячы кілаграмаў на адну карову.

— «Дзяржава для чалавека» — гэта мы і імкнуліся ажыццявіць, — сказаў Уладзімір Панцюхоў. — І насельніцтва адчула змены. З пачатку года ва ўсіх раёнах Магілёўскай вобласці істотна паменшылася колькасць скаргаў і зваротаў — у паўтара разы і вышэй.

Вынікі праверкі

Для таго каб вывучыць сітуацыю ў Шклоўскім раёне, у Савеце па ўзаемадзеянні была створана спецыяльная рабочая група. Яе ўзначаліў старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр Ацясаў.

— Можна толькі пазайздросціць таму, што зроблена, — шчыра сказаў ён, падводзячы вынікі. — І самае галоўнае, пазайздросціць настрою людзей. Калі мы гутарылі з імі, то адзначалі добразычлівае стаўленне да ўладаў. Мы не пачулі ад людзей сур'ёзных прэтэнзій. Таму наша сённяшняя сустрэча ў Александрыі — гэта завяршальная кропка на самай добрай ноце. Безумоўна, ідэальнага ў свеце не бывае, таму некаторыя заўвагі ёсць. Але яны неістотныя. Трэба проста рухацца і працаваць далей.

Напрыклад, падчас наведвання членамі Савета аб'ектаў у Шклове да іх па дапамогу звярнуліся жанчыны з дома № 7 па вуліцы Паркавай. Яны паскардзіліся на праблемы з ацяпленнем дома і добраўпарадкаваннем двара і выказалі спадзяванні на ўвагу ўладаў.

Накірунак працы

Праблемныя пытанні — не канкрэтныя, а агульныя для ўсіх рэгіёнаў — цяпер абмяркоўвае Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання.

— Гэта вельмі карысны і патрэбны орган, — сказаў Уладзімір Панцюхоў. — Раней палаты парламента былі самі па сабе, а мясцовыя Саветы ў рэгіёнах — самі па сабе. Цяпер у нас ёсць орган, які звязаў усе галіны ўлады і дапамагае знаходзіць кансенсус у актуальных пытаннях.

Уладзімір Панцюхоў лічыць, што ёсць яшчэ нямала пытанняў, якія трэба вырашаць. На яго погляд, ёсць недапрацоўкі ў рабоце крамаў аблспажыўсаюза ў сельскай мясцовасці — і ў плане рэжыму, і ў плане асартыменту. Яшчэ неабходна падтрымаць старастаў вёсак, павысіць іх ролю.

Сельскія Саветы, якія сёння працуюць у кантакце са старастамі, — гэта першаснае звяно вертыкалі ўлады, — нагадаў лідар Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў.

Старшыня Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання Генадзь Навіцкі адзначыў, што ўсё ўбачанае ў Шклоўскім раёне на выязным пасяджэнні заслугоўвае ўвагі і распаўсюджвання ў іншых рэгіёнах.

Ілона ІВАНОВА, *Шклоўскі раён.*

ЧЫНОЎНІКІ СУПРАЦЬ ЧЭРГАЎ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Тут можна даведацца пра графікі прыёму грамадзян па асабістых пытаннях кіраўніцтвам абласнога выканаўчага камітэта і яго структурнымі падраздзяленнямі. Размешчаны ўсе неабходныя нарматыўныя дакументы, а таксама пералік працэдур, якія выконваюцца паводле прынцыпу «аднаго акна», і ўся патрэбная інфармацыя на гэты конт (адрасы, кантактныя тэлефоны адказных службовых асобаў, спіс дакументаў, памер аплаты, максімальны тэрмін разгляду і выдачы даведкі альбо іншых звестак і г.д.). Як паведаміла Юлія Туміловіч, акрамя ўсяго іншага, створана спецыялізаваная Інтэрнэт-старонка юрыдычнага аддзела кіраўніцтва справамі Мінскага аблвыканкама, дзе арганізавана тлумачэнне заканадаўства па розных галінах права, а таксама завочна даюцца кансультацыі па надзённых праблемах. Такім чынам, для таго каб высветліць адказ на пытанне, якое вас хвалюе, існуе шмат самых розных варыянтаў. Іншым часам можна пра ўсё аператыўна даведацца, нават не выходзячы з дому.

Іншым часам можна пра ўсё аператыўна даведацца, нават не выходзячы з дому

Паводле інфармацыі Юліі Туміловіч, на абслугоўванне аднаго наведвальніка адводзіцца ў сярэднім 10—20 хвілін (вядома ж, усё ў рэшце рэшт залежыць ад складанасці адміністрацыйнай працэдуры, якая выконваецца ў кожным канкрэтным выпадку).

З чэргамі цяпер змагаюцца... самі чыноўнікі. Для таго каб належным чынам арганізаваць адпаведную работу, прымяняюцца розныя меры. Нярэдка на прыём у дзяржаўную ўстанову можна папярэдне запісацца па тэлефоне, вызначыўшы дакладны час. Такім жа чынам можна заказаць патрэбную даведку. Калі ўзнікае неадкладная патрэба, то прыём наведвальнікаў адбываецца без абедзеннага перапынку.

Аўтамабіль — не раскоша

У Валожынскім раёне налічваецца каля 430 населеных пунктаў. Гэта многа. Адсюль і асаблівасці ў арганізацыі работы ўсёй інфраструктуры. Кожны жыхар павінен атрымаць патрэбную дапамогу — такі тут прынцып. Трэба адзначыць, што адпаведны падыход даволі паспяхова ўвасабляецца ў жыццё. Да стэндаў з надпісам «адно акно» ў райвыканкаме падыходзяць людзі, ля аднаго — некалькі наведвальнікаў, якія запаўняюць патрэбныя паперы. Аказалася, што гэта падатковая інспекцыя — адпаведныя адміністрацыйныя працэдуры заўсёды запатрабаваныя. Ніякай мітусні — кожны з наведвальнікаў дакладна валодае патрэбнай інфармацыяй, як заўважыў адзін з месцічаў, «з «адным акном» і дыхаць стала лягчэй».

— Усё гэта мы выконвалі і раней, толькі цяпер сістэма стала больш упарадкаванай, — лічыць кіраўнік спраў Валожынскага райвыканкама Уладзімір Клішэвіч. — Адпаведнай рабоце нададзены належны статус, што дысцыплінуе і арганізуе дзяржаўныя ўстановы. Спачатку было, безумоўна, цяжкавата, але зараз усё пакрысе прыходзіць у норму, працуем без збояў.

На працягу апошніх гадоў на Валожыншчыне практычна завершана забеспячэнне дзяржаўных устаноў камп'ютарнай, капіравальнай тэхнікай, факсімільнай і мадэмнай сувяззю. Вялікую дапамогу ў гэтым аказаў Мінскі аблвыканкам, які цэнтралізавана закупляў усё неабходнае для рэгіёнаў. Аднак і на месцах не «спалі ў шапку» — на Валожыншчыне за кошт уласных сродкаў поўнасцю забяспечылі сельскія Саветы мабільнымі тэлефонамі. Таксама закупілі для вясковых «урадаў» сем легкавых аўтамабіляў (дзве машыны атрымалі ад аблвыканкама). Раней тэрмін эксплуатацыі машын, якія знаходзіліся на балансе сельвыканкамаў, складаў мінімум 12 гадоў. Цяпер парк (у раёне 17 сельскіх і 1 пасялковы Савет) значна «памаладзеў», а ў першым квартале наступнага года яго абнаўленне будзе поўнасцю завершана. Гэта дазволіць больш аператыўна рэагаваць на звароты вяскоўцаў, вырашаць іх надзённыя пытанні. Тут сапраўды тая сітуацыя, калі аўтамабіль не раскоша, а неабходнасць.

Спытайце ў камп'ютара

Графік прыёму наведвальнікаў скарэктавалі на карысць людзей. Цяпер наведаць патрэбнага спецыяліста, каб аформіць неабходныя паперы ці атрымаць карысную кансультацыю, можна ў любы зручны час. Асобныя аддзелы Валожынскага райвыканкама працуюць па будзнях да 20.00, а па суботах да 13.00 ва ўсіх падраздзяленнях арганізавана належнае дзяжурства. Таму зараз не трэба адпрошвацца з работы, каб наведаць тую ці іншую «канторы». Пасля таго як уступіў у дзеянне Указ № 420, пералік адміністрацыйных працэдур, якія выконваюць спецыялісты райвыканкама, павялічыўся з 34 да 55. Таму нагрузка значна ўзрасла.

Начальнік аддзела кантролю і справаводства Валожынскага райвыканкама Людміла Гаўрылава расказвае, што вялікая колькасць зваротаў звязана з атрыманнем матэрыяльнай дапамогі. Таксама шмат людзей апошнім часам звяртаюцца па пытаннях прыняцця ў эксплуатацыю жылля, якога прыватнікі ўзводзяць усё больш. Сярод найбольш надзённых — зямельныя пытанні, асаблівую актуальнасць адпаведная праблема мае ў вёсках.

— Усяго на нашым узроўні выконваецца амаль тры дзесяткі самых розных адміністрацыйных працэдур, — адзначае старшыня Дорскага сельскага Савета Рамуальда Іваноўская. — Часцей за ўсё людзі прыходзяць па даведкі па прысядзібных гаспадарках і па зямельных пытаннях. Гэтыя дзве пазіцыі складаюць палову ад усіх зваротаў.

Штогод у Дорскі сельскі Савет (на тэрыторыі якога налічваецца крыху больш чым 900 жыхароў) па розных пытаннях звяртаюцца каля 300 чалавек. Па кожным звароце неабходна прыняць канкрэтнае рашэнне — значны аб'ём работы, асабліва, калі ўлічваць тое, што штат сельсавета невялікі. Дапамагае рацыянальная арганізацыя работы і, зразумела, сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі. Дорскі сельвыканкам абсталяваны ўсёй неабходнай аргтэхнікай. Па ініцыятыве Мінскага аблвыканкама была закуплена спецыяльная камп'ютарная праграма «Сельсавет», якая ў найбліжэйшы час будзе ўкаранёная ва ўсіх сельскіх Саветах сталічнай вобласці. На Валожыншчыне актыўна праводзіцца адпаведная работа, да яе прыцягнулі і школьных настаўнікаў інфарматыкі.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Валожынскі раён.

ХТО Ў ВЫЙГРЫШЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Побач жа Віцебск з шагалаўскімі, малевічскімі і іншымі памятнымі месцамі, знакамітым міжнародным фестывалем мастацтваў «Славянскі базар».

— Дзеля гэтага ж працаваць трэба, — пачуў у адказ ад старшыні Курынскага сельскага Савета Аляксандра Рыбакова. — «Неадкладчы я чуў пажаданні розных людзей заняцца гэтай справай, у тым ліку і з Мінска. Маўляў, месцы цудоўныя і г.д. Усё, бяромся! Але ж праходзіць час, больш да мяне з гэтым пытаннем не звяртаюцца. Што датычыцца папаўнення бюджэту сельсавета за кошт развіцця агратурызму, адзначу: калі толькі адну базавую велічыню ўладальнікі плацяць у якасці падатку, які ж гэта прыбытак? Нават, калі б такіх турыстычных «кропак» было 10 ці 20, усё роўна атрымлівалася б мізэрная сума. А толькі на асвятленне населеных пунктаў (усяго ў нас 16 вёсак) нам трэба каля 12 мільёнаў рублёў.

Дарэчы, пра святло на вуліцах. Анатоль Тулянкін падчас размовы з кіраўніком сельскага Савета закрануў праблему вулічнага асвятлення ля сядзібы: «На нашай тэрыторыі добрае асвятленне, а вось выйдзеш за агароджу — цемра. Соромна было з-за гэтага перад іншаземцамі».

Старшыня пракаментаваў: «Ля кожнага дома дарогу светлай не зробіш! Мы і так стараемся многім дапамагчы. Цяжка ў такіх выпадках адмовіць ветэранам і адзінокім старым»

Я стаў сведкам папярэдняй дамоўленасці аб вырашэнні праблемы: Тулянкіны ўстановяць прыстасаванне, якое праз некалькі хвілін пасля таго, як прайшоў чалавек, будзе аўтаматычна выключаць святло.

Далей старшыня і гаспадар сядзібы, калі загаварылі пра планы развіцця турызму, абмеркавалі магчымасць адкрыцця турыстычнай інфраструктуры ў вёсцы Ходарава, што на беразе возера Вымна (Спартыўнае).

— Зімой сюды прыязджаюць сотні рыбакоў. Адначасова тут можна ўбачыць больш за 100 машын, — гаворыць старшыня Савета. — Канешне, было б вельмі добра арганізаваць платную паркоўку, пункт харчавання. Гаспадар «Задзвіння» адразу пажадаў напісаць заяву, каб, як кажуць, працэс пайшоў.

А мясцовым жыхарам прыбытак!

Кухня ў сядзібе «Задзвінне» на 100 балаў. З экалагічна чыстых прадуктаў, што самі вырошчваюць (у парніку падчас нашай сустрэчы я ўбачыў сакавітыя памідоры — гэта ў сярэдзіне кастрычніка!), рыхтуюць такую ежу — пальчыкі абліжаш. Прапаноўваюць турыстам нацыянальныя стравы. Некаторыя госці спачатку адмаўляюцца ад платнага харчавання, бо на вялікай кухні ёсць магчымасць кулінарыць самастойна. Але пасля частавання адразу «здаюцца». І колькі цёплых слоў ад гасцей пачула Вольга Міхайлаўна, не падлічыць. (А калісьці яна працавала ў цырульні, прычоскі рабіла.) У знаёмых вяскоўцаў уладальнікі сядзібы купляюць мёд і іншыя прадукты. Некаторыя госці з задавальненнем набываюць усё гэта, каб адвезці дадому. Зноў жа, прыбытак мясцовым жыхарам...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Віцебскі раён.

СТАТУС АБАВЯЗВАЕ...

У Літвянах — будаўнічы бум. Дакладней — будаўніча-рамонтны. На ўскрайку вёскі вырас квартал новых дамоў аграгарадка. Летась была закладзена яго база, узведзены першыя пабудовы. А сёлета, па словах старшыні Літвянскага сельскага Савета Анатоля Гурбана, пачынаючы з мая ўжо амаль усе будынкі і памяшканні ўстаноў грамадскага прызначэння вёскі знаходзяцца ў рэжыме няспыннага капітальнага рамонту ці на стадыі яго завяршэння.

Гэта прыемныя клопаты, бо ідзе, так бы мовіць, не толькі вялікае аднаўленне вёскі, але і яе паступовае выйсце на якасна новы ўзровень жыцця, — гаворыць Анатоль Іванавіч.

І сапраўды, насуперак вядомай прымаўцы аб тым, што капітальны рамонт падобны на стыхійнае бедства, у Літвянах я не сустрэў нікога, каму б не падабалася гэта будаўніча-рамонтная «ліхаманка». Першай установай, якая паспяхова перажыла звычайныя нязручнасці капрамонту, стаў фельчарска-акушэрскі пункт. Яго загадчыца Валянціна Дабрынеўская, дарэчы, дэпутат двух Саветаў, сельскага і Уздзенскага раённага, з задавальненнем паказвае толькі што адрамантаваныя пакоі. Замест старых з вялікімі шчылінамі рам усталяваны драўляныя шклопакеты вытворчасці «Забудовы». Цяпер стала цяплей, заўважае Дабрынеўская. Яна звяртае ўвагу на новыя сучасныя дзверы, плітку на сценах і падлозе. У ФАПе ёсць усё неабходнае медабсталяванне для работы і аказання першай экстраннай дапамогі.

Дэпутат сельскага Савета з ліку медыкаў — гэта асаблівая катэгорыя народных выбраннікаў. Яна ўвесь час на вачах людзей, у любы момант можа быць запатрабавана. Невыпадкова на дзвярах ФАПа побач з раскладам яго работы пазначаны і хатні тэлефон Дабрынеўскай. Такім чынам яна пастаянна адкрыта для аднавяскоўцаў — як пацыентаў так і выбаршчыкаў.

Валянціна Міхайлаўна працуе і жыве тут ужо больш за дваццаць гадоў. Яна ўсіх тут выдатна ведае і яе ўсе ведаюць. На яе вачах адбываўся сумнавядомы дэмаграфічны крызіс, выкліканы рэзкім пагаршэннем узроўню жыцця вяскоўцаў. А цяпер яна — сведка паступовага пераадолення рэзкага зніжэння нараджальнасці. Зараз толькі ў Літвянах 44 дзіцяці, з іх 5 — да аднаго года. Яшчэ тры цяжарныя жанчыны стаяць на ўліку…

Павелічэнне колькасці нямаўлят Дабрынеўская напрамую звязвае з будаўніцтвам аграгарадка ў Літвянах. І прывядзіць такі даволі распаўсюджаны жыццёвы прыклад. У вёску прыехала маладая сям'я спецыялістаў, якая раней не планавала заводзіць другое дзіця з-за адсутнасці свайго жылля. Але атрыманне новага зручнага і камфортнага дома ў аграгарадку, відаць, паспрыяла перагляду рашэнне. Хутка ў мужа і жонкі з'явіцца другое дзіця. І такія прыклады не адзінкавыя. Бо нішто так не спрыяе ўмацаванню і пашырэнню сям'і, як уласнае добраўпарадкаванае жыллё, пастаянная работа, стабільны і прыстойны заробак, дзіцячы садок побач з домам і г. д.

ФАП месціцца пад адным дахам з дзіцячым садком, у якім ідзе капітальны рамонт. Яго загадчыца, член выканкама сельскага Савета Паліна Шкала прагназуе з цягам часу вяртанне сваёй установы да ранейшай колькасці выхаванцаў, калі ў садку былі тры групы. Рэзервы папаўнення істотныя. Пакуль не ходзяць у садок дзеці да трох гадоў, якіх у Літвянах — 19. Бацькі прывядуць іх у наступным годзе. Такім чынам, тры групы — рэальная перспектыва. У якасці тэхнічнай падрыхтоўкі да верагоднага бэбі-бума днямі з Узды ў садок прывезлі новую пральную машыну-аўтамат.

Зразумела, з будаўніцтвам новых жылых дамоў і прывядзеннем у сучасны стан ранейшай вясковай нерухомасці клопатаў у мясцовай улады значна прыбавілася. Пах свежай фарбы пануе амаль паўсюдна, у тым ліку і ў кабінетах будынка сельскага Савета. Сродкі выдаткаваны салідныя: з усіх крыніц фінансавання ў Літвяны, яго сацыяльную і вытворчую інфраструктуру інвеставаны каля пяці мільярдаў рублёў. Вядома, рычагоў, каб паўплываць на разме ркаванне бюджэтных сродкаў вобласці, сельвыканкам не мае. Але ён можа прасачыць за тым, наколькі мэтанакіравана, ашчадна і своечасова засвойваюцца гэтыя грошы. Скажам, мясцовай уладзе падсілу наладзіць кантроль за якасцю будаўніча-рамонтных работ.

Ёсць і іншыя аспекты ўдзелу сельскага Савета ў фарміраванні асяроддзя і атмасферы аграгарадка. Мясцовай уладзе варта падумаць і аб трапных назвах новых вуліц. Трэба сказаць, што ў Літвянах і раней давалі назвы вуліцам, як гаворыцца, не ад ліхтара. Так, сельвыканкам знаходзіцца па вуліцы Школьнай — бо школа якраз насупраць. На вуліцы Спецыялістаў у свой час сяліліся пераважна маладыя спецыялісты. Вуліца Зарэчная, зразумела, за ракой. Ёсць вуліца Садовая, Маладзёжная і г.д. Гэтыя паэтычныя і са зразумелым вяскоўцам сэнсам назвы лепш не чапаць, лічыць Гурбан. А вось наконт назваў новых вуліц трэба падумаць.

Сёлета ў Літвянах у сувязі з будаўніцтвам аграгарадка з'явіліся дзве новыя вуліцы. Адну ў адпаведнасці з мясцовымі традыцыямі назвалі Палявой — каля поля яна. А ў назве другой — уздоўж яе якраз будуюцца новыя дамы, — вырашылі ўвекавечыць памяць свайго аднавяскоўца Уладзіміра Палікарпавіча Астравуха, маёра Савецкай Арміі, які 20 ліпеня 1984 года загінуў у Афганістане. Аднавяскоўцы аднадушна падтрымалі прапанову сельскага Савета.

Не забывае мясцовая ўлада і адзіноку маці Уладзіміра Палікарпавіча, дапамагае ёй па меры магчымасці. Летась, напрыклад, яе хату абклалі цэглай, памянялі электраправодку, сёлета паставілі новую агароджу... А 14 кастрычніка, у дзень нараджэння Марыі Канстанцінаўны, якое супала з Днём маці, урачыста павішавалі яе з 80-годдзем на спецыяльна арганізаванай вечарыне.

Узвядзенне аграгарадка паўплывала і на знешні выгляд вёскі. На фоне новых прыгожых сучасных дамоў сталі больш відавочнымі агрэхі старой забудовы. З гэтай нагоды члены выканкама і дэпутаты сельскага Савета прыклалі нямала намаганняў, каб вясковыя вуліцы і тэрыторыі вакол сядзіб набылі прывабны і цывільны выгляд. У тым, што ў Літвянах усе вуліцы заасфальтаваны, заслуга мясцовай улады. Як і ў тым, што большасць вяскоўцаў навялі элементарны парадак ля сваіх хат, упрыгожылі двары. З гэтай мэтай была праведзена мэтавая акцыя па рабоце з уладарамі сядзіб. Сам Гурбан, члены выканкама і дэпутаты сельскага Савета абышлі кожны двор. Слухалі заўвагі гаспадароў, нешта раілі, дапамагалі. І многія пагадзіліся з тым, што статус аграгарадка абавязвае трымаць двор і тэрыторыю вакол яго ў належным стане.

Кампанія за чысціню і парадак на вясковых вуліцах падштурхнула да больш рашучых дзеянняў па выяўленню гаспадароў кінутых дамоў. На 1 красавіка г.г. такіх дамоў было 24, цяпер — 12. З нашчадкамі гэтай «нерухомасці» таксама вядзецца работа і ёсць надзея, што падобнага жылля на тэрыторыі Савета хутка не застанецца.

Статус аграгарадка абавязвае мець і сучасныя сродкі сувязі. Скажам, выхад у інтэрнэт. Пакуль ён ёсць толькі ў бібліятэцы. Для масавага карыстання гэтага недастаткова. І вось днямі ў аддзяленне сувязі завезлі новы камп'ютар і аргтэхніку — прынтар, сканер і ксеракс, выдзелілі дадатковую тэлефонную лінію. Аксана Кушнер, якая працуе загадчыцай мясцовай пошты ўсяго тры месяцы, прадбачыць у хуткім часе значны наплыў наведвальнікаў — карыстальнікаў інтэрнэта і электроннай пошты

Тут і так традыцыйна людна. Вяскоўцы ідуць сюды за поштай, газетамі, каб аплаціць паслугі, набыць тавары паўсядзённага попыту. Яны тут трохі танней, чым у краме. Цяпер вось усё часцей заглядваюць вучні старэйшых класаў і маладыя настаўнікі — цікавяцца, калі падключаць камп'ютар да глабальнай сеткі. «Бойкае месца тут у нас будзе», — кажа Аксана.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Уздзенскі раён.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;

САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;

СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292 21 03.

Краіна здароўя

Выпуск № 30 (43)

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25:

30 КАСТРЫЧНІКА:

9.00—12.00 — галоўны акушэр-гінеколаг упраўлення аховы здароўя Марына Аляксандраўна ШКРОБ.

14.00—17.00 — галоўны ўрач Мінскай абласной стаматалагічнай паліклінікі Алег Анатольевіч ЖЫВАЕЎ.

6 ЛІСТАПАДА:

9.00—12.00 — галоўны ўрач МРЭК Мінскай вобласці Юлія Анатольеўна АЎСЯНІК.

14.00—17.00 — галоўны ўрач Мінскага абласнога наркалагічнага дыспансэра Людміла Анатольеўна АНДРЭЕВА.

13 ЛІСТАПАДА:

9.00—12.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы Алена Леанідаўна БОГДАН.

14.00—17.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічай бальніцы Анатоль Іванавіч СЯДЫХ.

БУРШТЫНАВЫЯ ЛЕКІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У ноч на 28 кастрычніка заканчваецца дзеянне летняга часу, і адбудзецца пераход на зімовы час. Стрэлкі гадзінніка перавядуцца на гадзіну раней, і мы атрымаем у нядзелю 60 дадатковых хвілін для сну.
Тым не менш усё не так проста. Шмат людзей скардзяцца на стан здароўя пры пераходзе на іншы час. Тым больш што надыходзіць лістапад — позняя восень, калі прыгожае лісце ўжо абляцела, карычнева-шэрыя фарбы яшчэ не адцяніў белы снег, а калі сонейка прамільгне на хвіліны скрозь нізкія хмары, то і гэта ўспрымаецца як вялікі падарунак прыроды.
Як справіцца з млявасцю і дрэнным восеньскім настроем — пра гэта расказвае мсціслаўская траўніца і народная лекарка Ганна КУЛЯШОВА.

Новы рэжым

— Пераход на іншы час — гэта цяжка таксама і для мяне. Галоўнае, не трэба рабіць рэзкіх рухаў. Чым менш у гэты час будзе хваляванняў і перанапружанняў, тым лепей. Не трэба нервавацца і загружаць сябе стосам праблем. Перад сном паслухайце музыку, спакойна пагутарыце, паглядзіце на свечку. Некалькі дзён стрымлівайце сябе, будзьце ўраўнаважанымі, і ўсё само сабой прыйдзе ў норму.

Я рэкамендую ў гэтыя дні (і не толькі ў гэтыя, а заўсёды) піць чай з зёлкамі — з мятай, мелісай, чаборам.

Дапамагае цудоўны пах хваёвых. Можна папырскаць у доме эўкаліптавым алеем. А яшчэ лепей: сабраць у лесе хвойныя галінкі — елкі альбо сасны, апусціць іх у кіпень, і няхай ідзе свежы натуральны пах. Гэта насычае паветра карыснымі рэчывамі і супакойвае.

А каб раптам не заснуць на працы, раю ратавацца чаем з сунічным лістом, мятай. Можна з'есці, калі млява, кіслы яблык ці апельсін. І самае галоўнае — ведаць меру ў ежы, ні ў якім разе не пераядаць.

Восеньскі аптымізм

Без сонца, вядома ж, усім дрэнна. Але трэба ствараць свет вакол сябе. Асабіста я ратуюся музыкай для расслаблення і гукамі прыроды, а таксама малюнкамі, дзе абавязкова будуць сонца і кветкі. Слухаю прыемную музыку і адчуваю, як пачынаю ўсміхацца і... жыць! Кожнаму, напэўна, трэба ствараць сваё маленькае сонейка. Інакш загнешся.

Калі прыпячэ восеньская дэпрэсія, можна і паплакаць. Гэта дае палёгку. Але самае галоўнае — не перадаваць свой стан іншым, бо яны — не вінаватыя, і ў іх сваіх праблем хапае.

Зрабіце што-небудзь сімвалічнае: намалюйце свае праблемы на лісце і спаліце. Альбо проста распаліце вогнішча і пасядзіце, паглядзіце на полымя, падумаце пра жыццё...

Ведаеце, восень даецца ж нам не проста так. Гэта час падвядзення вынікаў. І трэба разумець, што ў тым месцы, з якога абляцеў жоўты ліст, ужо жыве новая пупышка. А гэта значыць, што жыццё працягваецца. І сонейку трэба адпачыць, яно стамілася. І няхай, а мы зробім вогнішча. І будзе ў нас новая іскрынка. Такое маё ўспрыманне восені.

Вітамінныя зёлкі

Цяпер усе спажываюць вітаміны, якія набываюць у аптэках. Не магу адмаўляць, што гэта дапамагае арганізму ўмацаваць імунітэт, справіцца з прастудамі. Але ўсё ж такі гэта хімічны прэпарат, а чаму б не скарыстацца натуральнымі лекамі? Бо ў кожнай зёлцы ёсць набор вітамінаў.

Безумоўна, зёлкі патрабуюць сілаў і часу — сабраць альбо набыць, варыць, працэджваць. А мы заўсёды выбіраем лягчэйшыя шляхі.

Аднак падумайце пра гэта: зёлкі дораць нам не толькі вылячэнне, але і прыемныя пачуцці, задавальненне. Які водар у хаце, калі гатуеш адвар галінак чорных парэчак ці вішні! А чабор яшчэ і чысціць аўру дома!

Таму палюбіце сябе. Калі ёсць магчымасць абысці хімічны прэпарат — звярніцеся да народнага сродку, да прыроды.

І палюбіце самі гэтыя расліны. Гэта толькі ў чалавечым грамадстве так здараецца, што ты даеш добрае, а табе ў адказ — раўнадушнае ці злое. У прыродзе ўсё лагічна: на дабро і любоў расліна і жывёла адкажуць тым жа.

Вось маленькі парастак, і я яму кажу, што, маўляў, у мяне ёсць праблемы. Я буду цябе даглядаць, а ты дапамажы мне, ты ж здольны, бо больш разумны, зносішся з зямлёй і сонцам. І расліна табе дае ўсё, што можа.

Заступніцы і берагіні

Я ўжо распавядала чытачам «Звязды» пра расліны, якія дапамогуць справіцца з восеньскімі хваробамі. Але хачу засяродзіць увагу яшчэ на некалькіх.

Напрыклад, **чырвоная рабіна**. Яна цяпер саспела — збірайце чырвоныя гронкі, дзе толькі можаце. Рабіна чысціць кроў. І асабліва гэта карысна гараджанам, якія зашлакаваныя шкоднымі выкідамі і хіміяй.

Тут патрэбен напар. У тэрмас змясціць жменьку ягад, заліць кіпенем. Калі няма тэрмаса, падыдзе і слоік, трэба толькі яго захутаць, каб адвар прытаміўся. Піць, калі захочацца. Праўда, будзе трохі гарчыць. Аднак можна і патрываць, бо рабіна амалоджвае ваш арганізм.

Я чытала, што рабіна ачышчае ваду. Гэта вельмі моцны бактэрыцыдны сродак, антысептык. І яшчэ — *раней людзі абавязкова саджалі рабіну каля дома як абарону ад чараў, вядзьмарства. Як бы хто ні жадаў злога твайму дому — яно не пройдзе.*

А **бярозу** называлі берагіняй. Калі заварыць галінкі, лісце, пупышкі, альбо запарыць звычайны бярозавы венік і адварам абдацца (і не змываць вадой), то гэта будзе неверагодная асалода. Выдатны пах, добрая энергетыка, чысціць скуру і лечыць многія скураныя хваробы.

З цёплага бярозавага адвару добра рабіць ванны для ног. Глядзім тэлевізар, а нагам — шчасце. Трэшчыны зацягваюцца, скура адпаліраваная.

І за адным разам узгадаем **яблыню**. Яна лічыцца адной з самых мудрых і добрых раслін. Яе галінка — вітамінізаваная, *яблык для сардэчнікаў нічым не замяніць, а пяць яблычных семачак даюць сутачную дозу ёду.* Так што калі дзеці точаць зубы аб антонаўку, гэта толькі на карысць.

Дары восені

Не забудзьцеся пра чорную рэдзьку. Дзеці шмат кашляюць восенню, і вылечыць іх ад кашлю можна не хімічнымі пасілкамі, а натуральнай агароднінай. Многія маці ведаюць гэты спосаб, але я яшчэ раз нагадаю.

Дзіцяці і самому будзе цікава пагуляць з чорнай рэдзькай. Бярэцца шклянка з вадой, куды трэба апусціць хвост рэдзькі. Зверху сярэдзіну выразаем і ў варонку кладзём мёд альбо, калі алергія на мёд, то цукар.

Рэдзька пачынае цягнуць ваду, і ў варонцы збіраецца вадкасць, якая добра разбівае макрату. Гэты сок трэба піць кожныя тры гадзіны. Смачна, і дзіцяці цікава — сам то мёду пакладзе, то цукру насыпле. Так кашаль і міне.

***Журавіны** здымуць жар, вылечаць гнайнікі, выведуць радыенуклідаў.* Як вядома, журавіны растуць на балотах, дзе больш радыяцыі. Але трэба імкнуцца сабраць альбо набыць радыяцыйна чыстыя журавіны. За мінулым часам над гнойнымі ранамі доўга не меркавалі, а адразу прыкладалі журавіны. А мая бабуля распавядала, што аднойчы сям'я ўгарэла на пажары, дык ім закладалі ў вушы журавіны і нібыта гэтым выратавалі.

Пра **шалфей** нехта з разумных людзей сказаў наступнае: *неразумны той, хто памірае, калі на яго агародзе расце шалфей.* Гэта супрацьзапаленчая і супрацьгрыпозная расліна.

Адна сталовая лыжка лісця і кветак шалфею на адзін кубак сырога малака, гатуе на слабым агні 10 хвілін, потым працэджваецца і гатуе яшчэ столькі ж. Піць перад сном.

Гэта першы сродак супраць ламаты ў суставах, што характэрна для грыпу. Шалфей дапамагае пры кашлі і дае палёгку арганізму, бо танізуе яго.

Квашаная капуста — яе трэба абавязкова палюбіць. Я чула неаднойчы, што *квашаная капуста нават псарыяз вылечвае.* Гэта адзіны харч, які ў працэсе браджэння не забівае вітаміны, а, наадварот, выпрацоўвае.

Аднойчы ў дзяцінстве, калі я захварэла, бабуля прынесла квашаную капусты. Мне так хацелася піць, што я нацадзіла з яе расолу. І што вы думаеце — тэмпература стала спадаць.

Так што не грэбуйце кіслай капустай. Яна вітамінізуе арганізм і прачысціць страўнікавы тракт.

А жанчынам парэкамендую маску з квашанай капусты. Абкладаем твар і шыю, мінуючы вобласць вачэй, і адпачываем хвілін 10—15. Калі пачало шчыпаць — лепш змываць. І не вадой, а нятлустым малаком. Гэта маска больш падыходзіць для праблемнай і тлустай скуры. Яна ачысціць поры і падцягне скуру лепей за любы імпартны ліфтынг.

Я жадаю ўсім добрай восені. Каб без змарнення, а з думкамі пра будучую вясну. Трэба карыстацца дарамі прыроды і памятаць пра тое, што *варта дарыць свету дабрыню — і тады ён табе адкажа тым жа.*

Запісала Ілона ІВАНОВА.
г. Мсціслаў.

Працу пчаляра часта называюць салодкай. Асабліва ў тыя дні, калі з сотаў выкачваецца спелы мёд. Але пчалярская праца — найперш цярплівы і ўважлівы штодзённы догляд і клопат — у любое надвор'е і пару года. Людміла ПРОДАН **(на здымку)** з невялікай вёскі Хвайнік з той катэгорыі людзей, якія цалкам аддадзены прафесіі. Даглядаючы пушчанскі пчальнік, яна атрымлівае ад працы сапраўдную асалоду. Нездарма штогод яе пчаліныя домікі поўныя мёду. Бачачы, як ладзіцца праца ў гаспадыні, верыцца, што і сапраўды самая салодкая праца — менавіта ў пчаляроў.

Пружанскі раён.

«Трэба больш спаць!»



Горацкі біяэнегатэрапеўт Валянцін Таранаў дае свае парады — як аблегчыць пераход на зімовы час.

— Усё звязана з біялагічнымі рытмамі, і зрушэнне іх нават на гадзіну хваравіта ўспрымаецца арганізмам.

Я ўпэўнены, што гэтую праблему трэба сур'ёзна вывучаць. І мне падаецца, што эканомія энергіі, якой мы сябе цешым, не акупляецца стратай здароўя людзей. Таму што кожны другі чалавек як мінімум зведвае сур'ёзны дыскамфорт у пачатку перабудовы, пераходу на іншы час. Я мяркую, што калі прааналізаваць колькасць няшчасных выпадкаў на вытворчасці, аўтакатастроф у гэтыя перыяды, медыцынскіх ліставых непрацаздольнасці, наведванняў паліклінік, загружанасці стацыянараў, то лічбы пакажуць — пераход на іншы час негатыўна адбіваецца на здароўі людзей.

Што ж рабіць, каб абараніцца? Перадусім, трэба больш спаць. Таму што ў такія пераходныя перыяды найбольш церпяць адпачынак, сон. Трэба раней класціся спаць. Нават калі не хочацца, браць у рукі лёгкі раман, пачытаць 15—20 хвілін, каб выклікаць стомленасць вачэй, і сон прыйдзе.

Плюс да гэтага — харчаванне, рацыянальнае і здаровае. А таксама немалаважна пазбягаць стрэсаў на працы. На жаль, не ўсе кіраўнікі калектываў разумеюць, што ў перыяд пераходу на новы час трэба з падначаленымі сябе паводзіць асабліва мякка і карэктна. Як, дарэчы, і круглы год.

Запісала Ілона ІВАНОВА.
г. Горкі.

Дзіцячы прыём

У залежнасці ад розных фактараў інфекцыі паводзяць сябе па-рознаму

Вірусы — спрадвечныя спадарожнікі чалавека і заўсёдныя яго ворагі. Асаблівую небяспеку нясуць яны дзецям. Інфекцыйная захваральнасць сярод дзяцей у 2—3 разы вышэйшая, чым сярод дарослага насельніцтва.

Як захаваць здароўе будучага пакалення? Як распазнаць першыя прыкметы хваробы? Як зараз у рэспубліцы складваецца сітуацыя ў адносінах да інфекцыйных захворванняў сярод дзяцей? Аб гэтым — наша размова з дацэнтам кафедры дзіцячых інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта кандыдатам медыцынскіх навук Анатолем АСТАПАВЫМ.

— Адзначу, што ў залежнасці ад розных фактараў захваральнасць «паводзіць» сябе па-рознаму. Напрыклад, з кожным годам ідзе да зніжэння захваральнасць кішэчнымі інфекцыямі, асабліва дызентэрыяй. Апошняя ўспышка захворвання была зарэгістравана некалькі гадоў таму.

На першае месца сярод кішэчных інфекцый пачынаюць выходзіць ротавірусныя кішэчныя інфекцыі, асабліва сярод дзяцей. Але зараз у рэспубліцы распрацоўваецца прэпарат для іх прафілактыкі. Я лічу, што для прафілактыкі гэтых хвароб шмат зрабіла санітарна-эпідэмічная служба, якая правяла дасканалую рэвізію ўсіх малочных прадпрыемстваў рэспублікі. У выніку на іх было заменена абсталяванне на больш сучаснае, адпаведна стала лепшай і якасць малочнай прадукцыі для дзяцей.

Ёсць значныя поспехі ў барацьбе з вірусным гепатытам А. Калі раней захворвала да дзесяткаў тысяч людзей, то зараз гэта толькі сотні хворых. Гэта звязана перш за ўсё з тым, што зараз па эпідэмічных паказчыках робіцца вакцынацыя супраць гепатыту А. Раней прышчапляліся толькі ад гепатыту В. Сёння дзецям, у пераважнай большасці, робяць абедзве гэтыя прышчэпкі.

У сярэдзіне 90-х гадоў мінулага стагоддзя постсавецкая прастора перажыла вельмі цяжкую эпідэмію дыфтэрыі. А прычына была ў тым, што людзі перасталі рабіць прышчэпкі ад дыфтэрыі, спасылаючыся на іх шкоднасць. Гэтая бязглуздая думка і прывяла да таго, што дыфтэрыя пайшла «гуляць» па прасторах. Нам у той час удалося хутка і актыўна разгарнуць проціэпідэмічныя мерапрыемствы, правесці вакцынацыю насельніцтва. Зараз у рэспубліцы рэгіструецца да 10 выпадкаў хваробы і толькі сярод дарослых. Але праблемы могуць узнікнуць, калі людзі будуць адмаўляцца ад прышчэпак. Нагадаю, каб стрымліваць захваральнасць на дыфтэрыю, прышчэпліваць неабходна не толькі дзяцей, але і дарослых, прышчэпку трэба паўтараць праз кожныя 10 гадоў. Прышчэпкі супраць адзёру, паратыту, поліміеліту, краснухі дазваляюць нам кантраляваць гэтыя хваробы.

У нас некалькі павялічылася колькасць захворванняў на інфекцыйны мононуклеоз. Сустракаецца ён у асноўным у дзяцей. Пры гэтай хваробе павялічваюцца лімфатычныя вузлы, пячонка і селязёнка, пашкоджваюцца міндаліны, цяжка дыхаць, храп у сне. На жаль, вакцыны супраць гэтага захворвання пакуль няма.

Як урача-інфекцыяніста і як чалавека мяне вельмі хвалюе праблема, звязаная з такой хваробай, як менінгіты. Колькасць захворванняў на менінгіт не зніжаецца. Хвароба можа выклікацца, акрамя менінгакоку, і іншымі мікробамі, такімі як пнеўмакок, гемафільная палачка. Інфекцыя таксама выклікаецца вірусам звычайнага герпесу, сімптомы часта расцэньваюць як прастуду. Але вірус можа выклікаць і пашкоджанне цэнтральнай нервовай сістэмы. Вельмі важна своечасова і правільна паставіць дыягназ і шпіталізаваць дзіця.

Звычайна хвароба пачынаецца з высокай тэмпературы, галаўнога болю і ванітаў. Бацькі пачынаюць даваць малому гарачкапаніжальныя прэпараты, тэмпература падае. Дарослыя супакойваюцца. А потым дзеянне лекаў спыняецца, зноў высокая тэмпература, ваніты, галаўны боль, у 80 працэнтаў хворых з'яўляюцца высыпанні. А потым развіваецца шок і хворае дзіця можа загінуць на працягу адных сутак.

Часцей за ўсё захворваюць дзеці да аднаго года. На 100 тысяч дзяцей гэтага ўзросту прыпадае 80 выпадкаў менінгіту. Ад года да двух — 25—30 выпадкаў. Ад 3 да 6 гадоў яшчэ менш. А вось сярод дарослых на 100 тысяч насельніцтва захворваюць 1—2 чалавекі.

Сітуацыя ўскладняецца яшчэ і тым, што існуе некалькі тыпаў менінгакокаў А, С і В. Ад першых двух вакцына ёсць, ад В — няма. У нас жа ў асноўным і цыркулюе менінгакок тыпу В.

— Ці ўплывае сезоннасць на развіццё пэўных інфекцый?

— Сезоннасць вельмі выразна прасочваецца. Восенню, калі фарміруюцца дзіцячыя калектывы ў школах і садках, мы маем справу з паветрана-кроплевымі інфекцыямі. Летам і восенню, калі шмат садавіны і гародніны, многае залежыць ад санітарна-гігіенічных навыкаў дзяцей. Без ведання і захоўвання гэтых правілаў, высокая верагоднасць падчапіць кішэчную інфекцыю.

Менінгакок мае ссунутую сезоннасць. Хоць гэта і паветрана-кроплевая інфекцыя, у асноўным на яе хварэюць зімой і вясной. Хутчэй за ўсё, прычына таму — аслаблены імунітэт.

У жніўні—верасні, а таксама ў маі—чэрвені ў лясах пачынаюць гаспадарыць кляшчы. Яны з'яўляюцца крыніцай такога сур'ёзнага захворвання, як хвароба Лайма. Інфекцыя перадаецца з укусамі кляшчоў, 30 працэнтаў з якіх у нашай рэспубліцы інфекцыяваныя.

Насельніцтву трэба асцярожна адносіцца да гэтага захворвання. Яно вельмі каварнае. Востры перыяд праходзіць адносна лёгка, на месцы ўкусу ўзнікае пачырванненне. А праз 10 дзён узбуджальнік рассейваецца па ўсім арганізме і можа выклікаць пашкоджанні суставаў, сэрца, скуры, нервовай сістэмы. І тады справіцца з хваробай вельмі цяжка.

— Якія сімптомы ў дзіцяці павінны насцярожыць бацькоў, пры якіх яны могуць западозрыць інфекцыю і хутка звярнуцца да ўрача?

— Безумоўна, гэта высокая тэмпература, моцны галаўны боль, ваніты, дысфункцыя кішэчніка. Асабліва, калі дыярэя працяглая, ні ў якім разе нельга доўга займацца самалячэннем, трэба выклікаць урача.

Вольга ШАЎКО.

ЦІ СТАНЕ СЯМЕЙНЫ ЎРАЧ КЛЮЧАВОЙ ФІГУРАЙ У БЕЛАРУСКАЙ МЕДЫЦЫНЕ?

Надзённае

Ідэя ўкаранення ў айчынную сістэму аховы здароўя ўрачоў агульнай практыкі з'явілася яшчэ ў першай палове 90-х гадоў і прайшла шлях ад поўнага яе адмаўлення да поўнага разумення. Праўда, многія і сёння памылкова называюць участковых тэрапеўтаў урачамі агульнай практыкі. Актуальным пытанням агульнаўрачэбнай практыкі была прысвечана Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя, якая прайшла днямі на базе Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі.

— Урач агульнай практыкі — гэта ўрач-універсал, — тлумачыць намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла Жылевіч. — Навуковыя і тэхналагічныя дасягненні апошніх дзесяцігоддзяў прывялі да стварэння новых медыцынскіх спецыяльнасцяў і вузкай спецыялізацыі аказання медыцынскай дапамогі. Мы ўвогуле празмерна захапіліся вузкай спецыялізацыяй. І сёння адчуваем востры дэфіцыт ва ўрачах, якія валодалі б агульнымі ведамі і маглі самастойна вызначаць, калі пацыенту немагчыма абысціся без кансультацыі вузкага спецыяліста. Урач агульнай практыкі павінен у першую чаргу мець выдатнае клінічнае мысленне і адналькава добра ведаць хваробы ўсіх узростаў, прайсці падрыхтоўку па амбулаторнай хірургіі, гінекалогіі, неўралогіі, аталарынгалогіі, ведаць паліятыўную медыцыну і многае іншае.

Дарэчы, у Еўрапейскім рэгіёне імкліва расце пералік лячэбна-прафілактычных мерапрыемстваў, якія пераносяцца на ўзровень першаснай медыцынскай дапамогі. Некаторыя віды стацыянарнай дапамогі, якія традыцыйна ажыццяўляліся медперсаналам у бальніцах, перасоўваюцца на першасны ўзровень шляхам прымянення схемы «стацыянар у хатніх умовах». Акрамя таго, аказанне экстраннай дапамогі ў многіх выпадках забяспечваюць таксама ўрачы агульнай практыкі. Увогуле ўвесь заходні свет ужо даўно зрабіў стаўку на ўрача агульнай практыкі або на сямейнага ўрача.

Старажытныя грэкі казалі, што ва ўрача ёсць тры лячэбныя інструменты — гэта слова, расліна і нож, ставячы на першае месца слова.

Урач, які адначасова працуе з усёй сям'ёй, мае шмат пераваг перад тым жа ўчастковым тэрапеўтам ці педыятрам. Па-першае, ён мае магчымасць працяглага дынамічнага назірання (ад нараджэння і на працягу ўсяго жыцця пацыента), па-другое, добра ведае бытавыя ўмовы, у якіх жывуць яго пацыенты, іх генетычную спадчыннасць, псіхалагічны мікраклімат у сям'і, ад якога ў немалой ступені залежыць не толькі душэўнае, але і фізічнае здароўе чалавека, і, галоўнае, карыстаецца ў сваіх пацыентаў даверам. Аўтары дакументальнага фільма «Тайны крамлёўскай медыцыны» ў выніку аналізу шматлікіх дакументальных фактаў прыйшлі да высновы, што кіраўнікі краіны жывуць на 20 гадоў больш, чым звычайныя расіяне, дзякуючы медыцынскаму абслугоўванню сямейным урачом, пастаяннаму дыспансэрнаму назіранню і санаторна-курортнаму лячэнню.

Аўтары фільма «Тайны крамлёўскай медыцыны» прыйшлі да высновы, што кіраўнікі краіны жывуць на 20 гадоў больш, чым звычаныя расіяне, дзякуючы медыцынскаму абслугоўванню сямейным урачом, пастаяннаму дыспансэрнаму назіранню і санаторна-курортнаму лячэнню.

На думку начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Ігара Броўкі, сямейны ўрач — гэта найбольш выгадная фігура ў сістэме аховы здароўя: і з эканамічнага пункту погляду, і ў плане павышэння якасці медыцынскай дапамогі, якая аказваецца насельніцтву. І зусім невыпадкова менавіта з урачамі агульнай практыкі звязваюць у нашай краіне будучыню сельскай медыцыны. У бліжэйшыя два гады ўся амбулаторная дапамога ў сельскай мясцовасці павінна быць пераведзена на агульную ўрачэбную практыку.

Падрыхтоўкай сямейных урачоў у Беларусі займаецца Беларуская медыцынская акадэмія паслядыпломнай адукацыі, дзе з 1999 года актыўна дзейнічае кафедра агульнай урачэбнай практыкі. За час яе існавання (на пачатак 2007 года) перападрыхтоўку на ёй прайшлі 679 чалавек і 35 чалавек закончылі клінічную ардынатуру. Займаецца БелМАПА таксама і маніторынгам эфектыўнасці ўкаранення агульнай урачэбнай практыкі. Яго вынікамі з удзельнікамі канферэнцыі падзяліўся рэктар акадэміі Генадзь Хулуп. У параўнанні з сярэднерэспубліканскімі паказчыкамі ў рэгіёнах абслугоўвання ўрачамі агульнай практыкі адзначаецца змяншэнне патрэбы ў кансультацыях вузкіх спецыялістаў у 3,5 раза, зніжэнне ўзроўню шпіталізацыі на 50 працэнтаў і зніжэнне колькасці выклікаў «хуткай дапамогі» — на 47 працэнтаў. Ёсць і яшчэ адзін надзвычай важны паказчык: колькасць завершаных выпадкаў лячэння, калі адзін урач самастойна, без прыцягнення іншых спецыялістаў, вядзе лячэнне да поўнага выздараўлення пацыента, дасягае ва ўрачэбу агульнай практыкі 80 працэнтаў.

Галоўны пазаштатны спецыяліст Міністэрства аховы здароўя па агульнай урачэбнай практыцы Валянцін Русовіч пераканаўся, што менавіта сямейныя ўрачы павінны стаць галоўнымі праваднікамі прафілактычнай работы ў сістэме аховы здароўя. Усё ж такі 80 працэнтаў насельніцтва хоць бы раз у год наведваюць свайго ўчасковага ўрача або ўрача агульнай практыкі. Акрамя таго, урач агульнай практыкі не радзей чым два разы ў год праводзіць падвараванне абходы. І кожнае наведванне ўрача можа і павінна быць выкарыстана для кансультацыі па ладу жыцця, прафілактычнага агляду і абследавання. Першасная прафілактыка павінна займаць да 30 працэнтаў працоўнага часу ўрача агульнай практыкі, а не 5—10 працэнтаў, як сёння. І прафілактычная работа павінна эканамічна матываваца. Сёння ж, не сакрэт, медыцынскія работнікі лічаць для сябе больш важнай лячэбна-дыягнастычную работу. Іншымі словамі, наша сістэма аховы здароўя ідзе не напарадзе хваробы, калі яе яшчэ можна папярэдзіць, а ззаду, калі хваробу ўжо трэба лячыць.

Адміністрацыйны разбор скаргаў становіцца прычынай затоенай крыўды і павялічвае недавер у адносінах паміж урачом і пацыентам.

У немалой ступені эфектыўнасць прафілактычнай работы залежыць ад наяўнасці даверу да ўрача. Але ёсць у нашай медыцыне праблема, якую чамусьці не прынята абмяркоўваць.

— Нашых замежных калег вельмі здзіўляе тая акалічнасць, што ўсе кансультацыі праходзяць у нас у прысутнасці медыцынскай сястры, а гэта вельмі перашкаджае ўстанаўленню даверлівых адносінаў, і не спрыяе шчырай размове пацыента і ўрача, асабліва калі пацыент мае залежнасць ад алкаголю, ці, напрыклад, калі падлетак хоча атрымаць ад урача інфармацыю па пытаннях рэпрадуктыўнага здароўя, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі Валянцін Русовіч.

Цяжка спрачацца з меркаваннем, што калі чалавек прыходзіць параіцца з доктарам ці паведаміць яму аб сваіх інтымных праблемах, то рабіць гэта трэба толькі самнасам з урачом. Асабліва калі размова ідзе аб сельскай мясцовасці, дзе «навіны» распаўсюджваюцца з фантастычнай хуткасцю... Магчыма, не ўсе ведаюць, але за мяжой памочніца ўрача сустракае пацыента, перадае яму картку і праводзіць у кабінет да ўрача, але размова адбываецца з урачом за закрытымі дзвярыма. У нас жа нярэдка медыцынская сястра выконвае функцыю сакратаркі ці стэнаграфісткі...

Даўно праверана на практыцы, што прымусіць чалавека змяніцца амаль што немагчыма. Урач можа толькі дапамагчы пацыенту прыняць уласнае рашэнне, не навязваючы яму сваёй волі. А для гэтага ўрач павінен быць вельмі дыпламатычным, задаваць пытанні толькі ў далікатнай форме, не асуджаць пацыента, не абяцаць яму хуткага вырашэння ўсіх праблем, тактычна схіліць яго да самакрытыкі і сфарміраваць устаноўку на актыўнае аднаўленне здароўя. Вырашальную ролю пры гэтым можа адыграць асоба самога ўрача. Яшчэ старажытныя грэкі казалі, што ва ўрача ёсць тры лячэбныя інструменты — гэта слова, расліна і нож, ставячы на першае месца слова. Сёння вядомыя таксама працэнтныя суадносіны вярбальных і невярбальных сродкаў у камунікацыі: 7 працэнтаў займаюць словы, 38 працэнтаў — танальнасць і інтанацыя гаворкі, а 55 працэнтаў — выраз твару, становішча цела і жэсты. Прасцей кажучы, і жэстыкуляцыя, і позірк, і міміка, і моўная інтанацыя ўрача і медыцынскай сястры павінны адпавядаць сітуацыі, аказваць на пацыента заспакаяльнае ўздзеянне. У Нідэрландах, напрыклад, удзельная вага медыцынскай псіхалогіі ў праграмах дадыпломнай падрыхтоўкі ўрачоў агульнай практыкі складае 25 працэнтаў. Вынікі падрыхтоўкі вельмі строга ацэньваюцца камісіяй выкладчыкаў, і да 30 працэнтаў маладых урачоў з-за дрэнных камунікатыўных зносінаў не могуць прадоўжыць паслядыпломную падрыхтоўку па сямейнай медыцыне. Асноўным крытэрыем пры адборы будучых урачоў агульнай практыкі з'яўляецца мастацтва зносінаў.

На жаль, але канфліктнасць адносінаў урача і пацыента стала ў нашай краіне звычайнай штодзённай з'явай. А адміністрацыйны разбор скаргаў становіцца прычынай затоенай крыўды і павялічвае недавер у адносінах паміж урачом і пацыентам. Нашмат прадуктыўней для ўрача было б выслухаць гісторыю жыцця пацыента, асабліва з улікам таго, што большасць хранічных захворванняў чалавека маюць сацыяльную або псіхасаматычную прыроду.

Эмацыянальнае перанапружанне, выкліканае сацыяльнай незапатрабаванасцю і сямейнай неўладкаванасцю, прыводзіць да развіцця саматафорных расстройстваў і псіхасаматычнай паталогіі. А медыкаментознае лячэнне дадзенай паталогіі без псіхатэрапеўтычнага суправаджэння — абсалютна бесперспектыўны занятак. Некалькі гадоў таму свет абляцела фраза: «Негатыўная эмоцыя — аснова саматычнага нездароўя». Паводле ацэнак спецыялістаў, кожны трэці пацыент паліклінік — гэта псіхасаматычны хворы, якому патрабуецца індывідуальная медыка-псіхалагічная і псіхатэрапеўтычная дапамога. А паводле інфармацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, больш за палову хворых на дэпрэсію лечацца ва ўрачоў агульнай практыкі і не трапляюць у поле зроку псіхіятраў. Саматычныя скаргі могуць настолькі пераважаць у клінічнай карціне, што ўрач нават не падазрае ў хворага наяўнасць псіхічнага расстройства.

Першасная прафілактыка павінна займаць да 30 працэнтаў працоўнага часу ўрача агульнай практыкі, а не 5—10 працэнтаў, як сёння.

Як канстатавала Людміла Жылевіч, у Беларусі сёння не толькі ўрачы першаснага звяна, але і ўрачы вузкіх спецыяльнасцяў дрэнна арыентуюцца ў распазнаванні псіхічных расстройстваў, іх дыягнастычныя магчымасці — вельмі абмежаваныя, а лячэнне абмяжоўваецца прызначэннем пацыентам транквілізатараў і снатворых лекавых сродкаў. У сувязі з гэтым прапануецца распрацаваць адукацыйныя праграмы ў галіне псіхіятрыі, наркалогіі, медыцынскай псіхалогіі і суіцыдалогіі для ўрачоў першаснага звяна і павялічыць аб'ёмы паслядыпломнага выкладання псіхіятрыі і наркалогіі.

Цікавае даследаванне правялі ў Баранавіцкім дзяржаўным цэнтры па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі сярэдніх медыцынскіх кадраў. На працягу двух месяцаў там даследаваўся стан псіхалагічнага здароўя слухачоў цэнтра. У ходзе даследавання высветлілася, што высокі ўзровень псіхалагічнага здароўя маюць толькі 24 працэнты слухачоў, сярэдні ўзровень — 62 працэнты і нізкі ўзровень — 14 працэнтаў. Варта патлумачыць, што для сярэдняга ўзроўню псіхалагічнага здароўя характэрная прысутнасць эмацыянальнай узбудлівасці, няўпэўненасць у сабе, сваёй прафесіі, некаторыя праблемы ў зносінах, нерашучасць і раздражняльнасць. Агульнавядома, што работа медыкаў суправаджаецца вялікай колькасцю негатыўных эмоцый, а эмацыянальны стан медыцынскіх работнікаў аўтаматычна адбіваецца на пацыентах. Таму сёння самы час падумаць пра арганізацыю псіхалагічнай рэабілітацыі для медыцынскага персаналу ў лячэбных установах на месцы работы.

Сярод іншых праблемных момантаў на канферэнцыі звярталася ўвага на неабходнасць распрацоўкі такой сістэмы аплаты працы, якая б адлюстроўвала спецыфіку працы ўрача агульнай практыкі, аб'ёмы, складанасць і якасць медыцынскай дапамогі, якая аказваецца насельніцтву. Пакуль што прэстыжнасць працы ўрачоў першаснага звяна застаецца зусім невысокай. Выпускнікі медыцынскіх універсітэтаў, якія прыязджаюць у сельскую мясцовасць па размеркаванню, разглядаюць работу ў першасным звяне як трамплін перад вузкай спецыялізацыяй. Ідэалогія сямейнай медыцыны павінна фарміравацца яшчэ ў студэнцкія гады. А часовая праца ў першасным звяне супярэчыць асноўным прынцыпам сямейнай медыцыны — неперарыўнасці і доўгатэрміновасці назірання за сваімі пацыентамі, што ў значнай меры забяспечвае якасць і эфектыўнасць аказваемай меддапамогі. Першых вынікаў прафілактычнай работы не трэба чакаць на наступны ж дзень — для гэтага могуць спатрэбіцца гады і нават дзесяцігоддзі, тым не менш, калі сямейны ўрач стане галоўнай фігурай у медыцыне, прычым не толькі ў сельскай мясцовасці, але і ў гарадах, то істотны якасны «прарыў» у дэмаграфічнай сітуацыі абавязкова адбудзецца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Дырэктар камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Аблдарпраект» Міронія ГУЦЬКО:

«КОЖНЫ НАШ ПРАЕКТ — ГЭТА ПРЫГОЖЫЯ ВУЛІЦЫ, ДОБРЫЯ ДАРОГІ, ДОЎГАЧАКАНЫЯ МАСТЫ...»

Да свайго прафесійнага свята — Дня аўтамабіліста і дарожніка — КУП «Мінскаблдарбуд» вырашыў выправіць, можна сказаць, гістарычную несправядлівасць. Справа ў тым, што многія дарожныя арганізацыі маюць Музеі дарожнай славы, а ў мінскіх абласных дарожнікаў дагэтуль такога не было. Хоць многія справы людзей у ярка-аранжавай форме «Мінскаблдарбуда» безумоўна вартыя таго, каб імі ганарыцца.

...На базе Заслаўскага ДРБУ сабрана старая тэхніка, на якой некалі працавалі дарожнікі Міншчыны, экспанаты па кожнай арганізацыі аблдарбуда... Цалкам заслужана з'явіцца тут і экспазіцыя даччынага прадпрыемства аб'яднання КУП «Аблдарпраект». Праекціроўшчыкі прадставяць наведвальнікам музея славутую машынку «Фелікс», лагарыфмічную лінейку, якая давала істотную хібнасць, першыя ЭВМ. Даволі яркім экспанатам музея мог бы стаць старэнькі РЭМ (размнажальная тэхніка), які падчас работы капціў так, што жыхары дома, дзе размяшчаўся «Аблдарпраект», з зайздроснай рэгулярнасцю «страчылі» скаргі ў санэпідэмстанцыю. На жаль, ветэрана ўжо здалі ва ўтыль...

З таго часу шмат што змянілася. На «ўзбраенне» праекціроўшчыкам паступілі дзесяткі сучасных машын і спецыялізаваных праграм. Колішні невялічкі аддзел комплекснага праектавання аблдарбуда, які выпускаў усяго 2—3 праекты за месяц, ператварыўся ў магутную мабільную праектную арганізацыю, якая выпускае за год больш за тысячу праектаў!

«Паважаныя калегі! Гэты год стаў сапраўднай праверкай нашага калектыву на трываласць і прафесіяналізм, якую мы вытрымалі з гонарам. Больш як 1000 праектаў падрыхтавана нашым прадпрыемствам на сёння. Большасць з іх выкананы ў мінімальныя тэрміны, часта ва ўрон асабістаму часу і жыццю, але на карысць нашай агульнай вельмі патрэбнай справы. За кожным з праектаў стаяць канкрэтныя аб'екты інфраструктуры, многія з якіх людзі чакалі не адзін год.

Ад усёй душы жадаю ўсім, хто звязаў свой лёс з высакароднай прафесіяй дарожніка, часцей чуць цалкам заслужаныя словы ўдзячнасці ад тых, для каго вы працуеце. Няхай гэта нялёгкая праца прыносіць вам радасць, а наперадзе вас чакае толькі шырокая, прыгожая і шчаслівая дарога!»

Да добраўпарадкавання ўнікальнага аб'екта на вёсцы — аграгарадка Цімкавічы — прыклалі руку і спецыялісты КУП «Аблдарпраект».

— Сёння на прадпрыемстве працуюць 150 супрацоўнікаў. Кожнага са спецыялістаў мы імкнёмся забяспечыць персанальным камп'ютарам. Усе машыны аб'яднаныя адзінай лакальнай сеткай, — расказала **дырэктар КУП «Аблдарпраект» Міронія Міхайлаўна ГУЦЬКО.** — Удалося абнавіць і свой аўтапарк. Практычна забыліся аб ранейшых праблемах, звязаных з выездам спецыялістаў на аб'екты. Нашы разведвальнікі на электрычках, аўтобусах, «папутках» ужо не ездзяць. А некалі гэта было звычайнай рэччу.

У тым ліку і аснашчанасць сучаснай тэхнікай дапамагае нам спраўляцца з каласальнай нагрузкай. Ужо каторы год запар наш калектыў рыхтуе дакументацыю больш як па тысячы аб'ектаў. Сёлета гэты сімвалічны рубеж значна перакрыты ўжо сёння. Так, праекты не буйныя, але ад таго патрабуюць не меншай увагі і адказнасці.

Як вядома, у свой час наша арганізацыя была створана для забеспячэння патрэб у праектаванні аўтамабільных дарог Мінскай вобласці. Таму, натуральна, усе асноўныя праграмы Мінскаблдарбуда ў нас праходзяць па-за чаргой. У перыяды, калі асноўны заказчык не можа нас поўнасцю загрузіць работай, бяром і пабочныя заказы. У абавязковым парадку выконваем таксама заказы ЖКГ і Упраўленняў капітальнага будаўніцтва Мінскай вобласці.

Калі гаварыць аб Праграме адраджэння і развіцця вёскі, трэба адзначыць, што ў цэнтральным рэгіёне праекты практычна ўсіх аб'ектаў у яе рамках выконваюцца нашым прадпрыемствам. Сярод іншых сёлетніх буйных заданняў — добраўпарадкаванне гарадоў Барысаў і Мар'іна Горка па праграме, зацверджанай Мінскім аблвыканкамам, бягучы і капітальны рамонт вуліц у Стоўбцах, пад'езды да буйных сельгаспрадпрыемстваў у аграгарадку Будагова Смалявіцкага раёна і ў вёсцы Заазер'е Лагойскага раёна... Дадаткова, у сувязі з падтапленнем, працавалі на добраўпарадкаванні Залінейнага раёна Барысава.

Даволі аб'ёмная і значная работа чакае прадпрыемства ў кастрычніку-лістападзе: вось-вось павінна выйсці рашэнне аблвыканкама аб даследаванні аграгарадкоў, якія будуць добраўпарадкоўвацца ў 2008 годзе. Гэта значыць, што нашым спецыялістам трэба будзе абследаваць кожную вуліцу, дарогу, пад'езд, вызначыць від рамонту, падлічыць яго кошт... Пры гэтым на «палявыя» даследаванні адводзіцца вельмі кароткі тэрмін. Не больш часу будзе і на ўсе разлікі. Мяркуецца абследаваць 59 аграгарадкоў, аднак для нас яны «выльюцца» ў сотні аб'ектаў.

Колькасць раённых праектна-разведвальных сектараў пакуль застаецца ранейшай, аднак мы актыўна працуем над тым, каб іх пашырыць. Больш за тое, нас у гэтым імкненні падтрымаў і генеральны дырэктар аб'яднання, і кожнае ДРБУ не супраць таго, каб выдзеліць пакой пад праектна-разведвальны сектар... Аднак тут нам давялося сутыкнуцца з сур'ёзнай праблемай — на раёнах не стае кваліфікаваных спецыялістаў. Пастаянна ў газетах змяшчаем аб'явы аб наборы супрацоўнікаў. Плёну пакуль не шмат.

Яшчэ ў нашых планах аднавіць сектар, які некалі працаваў ў Барысаве. Плануецца, што ён будзе абслугоўваць і суседнія раёны: Крупскі, Бярэзінскі. З кадрамі пакуль таксама ёсць пытанні, але ўсё ж Барысаў — буйны горад — магчыма, там гэту праблему будзе вырашыць прасцей.

З праекціроўшчыкамі ёсць цяжкасці і ў сталіцы. Здараецца, бяром маладых спецыялістаў, навучаем, а праз пару гадоў іх зманьваюць камерцыйныя фірмы... Ёсць і станоўчыя прыклады. Колькі гадоў Лабараторна-дыягнастычны цэнтр у Нясвіжы ўзначальвае малады кіраўнік Васіль Аляксандравіч Лаўцоў. Праявіў сябе з самага лепшага боку, шмат над сабой працуе і ўвогуле спецыяліст вельмі высокага ўзроўню.

— Міронія Міхайлаўна, на якія вашы структурныя падраздзяленні сёлета лягла асноўная нагрузка?

— Усё наша прадпрыемства я параўнала б з адным дакладна адладжаным механізмам. У ім няма нязначных ці малаважных дэталяў — кожны на сваім месцы, і ад працы кожнага залежыць агульны вынік. Асноўныя аддзелы, на якія прыйшлася максімальная нагрузка, гэта аддзелы інжынернай разведкі, горных работ, дарожнага праектавання і праектавання штучных збудаванняў. Вялікую падтрымку ім аказвае вытворча-тэхнічны аддзел.

Наш аддзел дарожнага праектавання буйнейшы на прадпрыемстве — у ім працуюць амаль 50 чалавек. Частка дарожнікаў працуе на месцах, у сектарах дарожнага праектавання, што ў Вілейцы, Маладзечне, Слуцку, Дзяржынску, Чэрвені, Нясвіжы. І працуе, трэба сказаць, даволі плённа. Улічваючы станоўчую якасць іх праектаў, апошнім часам на месцах выконваюцца не толькі аб'екты бягучага рамонту, але і капітальнага, і нават будаўніцтва. Усе сектары ўкамплектаваны неабходнай камп'ютарнай тэхнікай, забяспечаны спецыялізаванымі праграмамі. Вядома ж, не перашкодзіў бы ім і свой транспарт, але гэта пакуль у перспектыўных планах.

На месцы таптацца нам ні ў якім разе нельга. З году ў год павялічваецца колькасць аб'ектаў, растуць аб'ёмы, больш становіцца складаных і адказных заданняў, расце і ўзровень нашых спецыялістаў. Сёння мы гатовы закрыць усе патрэбы ў праектаванні і аблдарбуда, і Мінскага аблвыканкама. Дарогі трэцяй, чацвёртай, пятай, шостай катэгорыі — гэта наша ніша, у якой мы даволі паспяхова працуем. Ёсць у нас і больш сур'ёзныя аб'екты, але, хутчэй, як выключэнне. У Мінску існуе галіновы інстытут — «Белдзіпрадар» — вельмі салідная шматвопытная арганізацыя, да ўзроўню якой мы імкнёмся, але не можам складаць канкурэнцыю.

Сёння ў «Аблдарпраекце» працуе зладжаны касцяк шматвопытных спецыялістаў. Нягледзячы на гэта нельга сказаць, што ў арганізацыі ўтварыўся нейкі застой. Кожны год у калектыў уліваюцца маладыя спецыялісты. 13 чалавек, якія працуюць на прадпрыемстве, сёння вучацца ў ВНУ краіны. У асноўным гэта БНТУ, факультэт транспартных камунікацый. Акрамя таго, нашы спецыялісты пастаянна павышаюць кваліфікацыю, наведваюць усе галіновыя семінары. Калектыў КУП «Аблдарпраект» малады і ў добрым сэнсе амбіцыйны. Людзі хочуць, а галоўнае ўмеюць працаваць. Часам, не лічацца ні з выхаднымі, ні са святочнымі днямі. Адным словам спецыялісты, вартыя ўсялякай павагі і ўдзячнасці.

«ПАДЫХОД ДА КОЖНАГА АБ'ЕКТА — ІНДЫВІДУАЛЬНЫ»

Як мы ўжо сказалі вышэй, асноўная нагрузка сёлета лягла на жаночыя плечы аддзела дарожнага праектавання. Так, на такім адказным участку ў «Аблдарпраекце» працуюць у асноўным прадстаўніцы прыгожай паловы.

— За дзевяць месяцаў гэтага года аддзелам выканана праектна-каштарыснай дакументацыі на адзін мільярд 360 мільёнаў рублёў. Гэта каля тысячы вялікіх і малых аб'ектаў па ўсёй Мінскай вобласці, — расказала **начальнік аддзела Тацяна КАВАЛЬСКАЯ.** — Увогуле наша дзейнасць вельмі разнастайная — ахоплівае рамонт, будаўніцтва, рэканструкцыю як мясцовых, так і рэспубліканскіх дарог, пад'езды да сельскагаспадарчых аб'ектаў, раёнаў індывідуальнай забудовы, аграгарадкоў і праезды ў іх...

— Асаблівая складанасць нашай работы заключаецца ў тым, што па аб'ектах, над якімі мы працуем, не існуе тыповых рашэнняў — падыход да кожнага індывідуальны, — адзначыла **галоўны інжынер праекта Святлана ДУБІНІНА.** — Трэба ўлічваць усе акалічнасці, у тым ліку і зручнасць для жыхароў. Таму для прыняцця праектных рашэнняў на ўсе аб'екты, акрамя разведвальнікаў, як правіла выязджаюць і галоўныя інжынеры праекта.

Кіраўнік групы Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ, ГІП Святлана ДУБІНІНА і начальнік аддзела дарожнага праектавання Таццяна КАВАЛЬСКАЯ.

«НЕ КОЛЬКАСЦЮ, А ЎМЕННЕМ»

Нягледзячы на сваю малаколькаснасць — працуе ўсяго пяць чалавек — аддзел праектавання штучных збудаванняў выконвае вельмі вялікі аб'ём работы. Спецыялізацыя аддзела — абследаванне і праектаванне рамонту і будаўніцтва малых і сярэдніх штучных збудаванняў, у асноўным мастоў. І ў гэтым маставікі поўнасцю закрываюць патрэбу асноўнага заказчыка — КУП «Мінскаблдарбуд». Ёсць і іншыя заказчыкі, а значыць і перспектывы для далейшага развіцця аддзела. Як расказаў **начальнік аддзела Георгій КАЗАРЦАЎ,** сярод апошніх праектаў аддзела — мост на пад'ездзе да малочнатаварнай фермы ў вёсцы Заазер'е Лагойскага раёна. Гэта адзіны аб'ект, выкананы сёлета ў рамках праграмы адраджэння вёскі.

За гэты год таксама запраектавана будаўніцтва чатырох новых мастоў — у Любанскім, Смалявіцкім (у межах райцэнтра) і Стаўбцоўскім раёнах. Выканалі маставікі і некалькі капрамонтаў. Літаральна днямі здалі праект капітальнага рамонту моста ў Вілейскім раёне.

Працягвае працаваць аддзел і па рэспубліканскай сістэме «Белмост», што ствараецца ў Дэпартаменце «Белаўтадар», у рамках якой праводзіць дыягностыку мастоў, што знаходзяцца на балансе Мінскаблдарбуда. Праграма прадугледжвае збор інфармацыі аб колькасці і стане мастоў. Пасля таго як база даных будзе поўнасцю створана, сістэма дазволіць вызначыць аптымальную чарговасць рамонту мастоў, колькасць неабходных для гэтага сілаў і сродкаў. Калі гаварыць пра аблдарбуд Мінскай вобласці, то на яго балансе сёння налічваецца 661 мост. З іх пакуль абследавана каля 40 працэнтаў. Паводле слоў Георгія Казарцава, да канца года аддзел павялічыць гэту колькасць да 50 працэнтаў.

— Гэту работу выконваем у асноўным сіламі аддзела. Летась прыцягвалі субпадрадчыкаў, аднак нас не ўсё задаволіла. Сёлета справімся сваімі сіламі.



Начальнік аддзела праектавання штучных збудаванняў — ГІП Георгій КАЗАРЦАЎ (у цэнтры) і інжынеры Андрэй КАЛАТОНЧЫК і Аляксей МІХАЙЛАЎ.

«ЯКАСЦЬ ПРАЕКТАЎ ПАЦВЕРДЗІЛІ СЕРТЫФІКАТАМ»

Асноўныя задачы Вытворча-тэхнічнага аддзела — правядзенне адзінай тэхнічнай палітыкі ў галіне якасці і канкрэтных патрабаванняў да гатовай прадукцыі, а таксама забеспячэнне высокага тэхнічнага ўзроўню праектных рашэнняў.

Як расказала **вядучы інжынер Наталля ВАСІЛЬЕВА,** у 2002 годзе КУП «Мінскаблдарбуд» атрымаў сертыфікат менеджменту якасці СТБ ISO 9001-2001.

Аднак мы хацелі атрымаць яшчэ і свой асобны сертыфікат на праектаванне. І вось у студзені гэтага года «Аблдарпраект» паспяхова атрымаў гэты дакумент.

На сёння сертыфікат з'яўляецца не нейкім сімвалам здавальнення амбіцый, а вельмі важным дакументам, на наяўнасць якога ўсе нашы заказчыкі звяртаюць увагу ледзь не ў першую чаргу. Працаваць без сертыфікату ў сучасных умовах проста немагчыма.

На прадпрыемстве таксама распрацавана свая сістэма кіравання аховай працы. Увогуле ў Беларусі па інтэграванай сістэме менеджменту якасці, кіравання аховы працы, абароны навакольнага асяроддзя сертыфікавана не так многа прадпрыемстваў. Для нас гэта таксама толькі перспектыўныя планы.

Сяргей ПРОТАС,
Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Аляксея СУПРУНА і БЕЛТА.

«Працуем у рытме камсамольскай будоўлі»

Асноўная задача, якая сёлета стаяла перад нашым прадпрыемствам — стварэнне дадатковай інфраструктуры ў аграгарадках, — расказаў галоўны інжынер Віктар ДУБАТОЎКА. — Мы працавалі над 806 аб'ектамі у 94 аграгарадках Міншчыны. Акрамя таго, «Аблдарпраект» працаваў па праграмах устройства пад'ездаў да месцаў індывідуальнай забудовы, развіцця і рамонту дарог і вуліц гарадоў, гарадскіх пасёлкаў і сельскіх населеных пунктаў, праграмах Мінскага аблдарбуда — нашага асноўнага заказчыка, па якіх выканана 484 праекты.

У аграгарадках былі як аб'екты бягучага, так і капітальнага рамонту. На месцы выязджалі разведвальнікі і праекціроўшчыкі, праводзілі абследаванне, узгаднялі свае праектныя рашэнні з заказчыкамі, якімі, як правіла выступалі Упраўленні капітальнага будаўніцтва райвыканкамаў. Актыўны ўдзел у агульнай справе бралі і старшыні сельскіх Саветаў. Вось у выніку такой сумеснай работы і з'яўляліся праекты добраўпарадкавання аграгарадкоў. Сярод асноўных аб'ектаў — пасялковыя вуліцы, цэнтральныя сядзібы, пад'езды да фермаў, зернепляцовак, самі зернепляцоўкі, мехдвары, тэрыторыі фермаў і комплексаў, малочнатаварных фермаў...

Пры праектаванні аб'ектаў велізарную дапамогу нам аказалі нашы памочнікі на месцах — прадстаўнікі ДРБУ. У самы «гарачы» перыяд частку работы па аграгарадках яны фактычна ўзялі на сябе, за што мы калегам вельмі ўдзячныя. Справа ў тым, што ў пік сезона, калі «Аблдарпраект» працаваў з нагрузкай, якая перавышала нармальную ў некалькі разоў, мы б і не супраць былі ўзяць некага на субпадрад. Аднак іншыя праектныя арганізацыі традыцыйна працуюць па гадавых планах — укліняцца вельмі цяжка. Да таго ж кошт праектаў для іх быў мала прывабным — у асноўным да мільёна рублёў. Так што мы заставаліся першай і апошняй інстанцыяй і, лічу, з гонарам выйшлі з гэтай сітуацыі. Акрамя ўсяго вышэй названага, прадпрыемства прымала заказы і ад іншых арганізацый. У асноўным гэта былі яшчэ леташнія аб'екты: 10 кіламетраў капітальнага рамонту дарогі М-7 Мінск—Ашмяны— мяжа Літоўскай Рэспублікі (заказчык РУП «Гроднаўтадар»), рэканструкцыя цэнтральнай напружанай вуліцы (Магілёўскай) у Оршы, капітальны рамонт вуліцы Ф. Скарыны ў Мінску (зараз ужо рыхтуецца каштарысная дакументацыя).

Сярод сёлетніх буйных аб'ектаў я адзначыў бы інжынерную абарону тэрыторыі Залінейнага раёна Барысава ад падтаплення. Там у нас тры вуліцы: Прафінтэрна, Кавалерыйская, 9-ты Залінейны завулак. Заказчыкам выступіла гарадское УКБ.

Так атрымліваецца, што ні адзін тэрміновы, можна сказаць «пажарны» аб'ект на Міншчыне не абыходзіцца без удзелу «Аблдарпраекта». Мы ідзём насустрач заказчыкам і імкнёмся дапамагчы. Але ўсё ж такі хацелася б размеранасці. Завяршаючы сезон, імкнёмся працаваць з «Мінскаблдарбудам», каб ужо ў найбліжэйшы час ішлі заданні на будучы год. Працаваць як сёлета ці летась фактычна ў аўральным рэжыме вельмі складана. Таму, паўтаруся, хацелася б забяспечыць сабе бесперабойную нармальную работу на працягу ўсяго года, падыходзіць да яе выканання планава. У кіраўніцтва аб'яднання разуменне нашых праблем ёсць.

— Віктар Баляслававіч, як вы ставіцеся да прапаноў павялічыць ці нават падвоіць колькасць супрацоўнікаў «Аблдарпраекта»?

— Нават улічваючы рост колькасці аб'ектаў, па якіх нам даводзіцца працаваць, не лічу такі крок правільным на 100 працэнтаў. Чаму? Пры размеркаванні заданняў больш-менш раўнамерна па году і плануючы рабоце мы аптымальна закрываем тыя аб'ёмы, што нам паступаюць, уласнымі сіламі.



Бухгалтар Наталля КАМЯК, галоўны бухгалтар Людміла КАЗАК, бухгалтар Святлана ГОВЗБІТ і намеснік галоўнага бухгалтара Алена БАДУН.

Начальнік аддзела горных работ Мікалай ЦІХАНАЎ і інжынер-геолаг Віктар ЛЕБЕДЗЕЎ.

Супрацоўнікі вытворча-эканамічнага аддзела інжынеры Алена СТРЭЛЬСКАЯ, Людміла ХРЫПАЧ, вядучы спецыяліст Таццяна АЎСЯННІКАВА і эканаміст Таццяна НІЧАЙ.

Кіраўнік праектнай групы Таццяна ФІЛІМОНАВА, ГІП Людміла АРЦЁМЕНКА, ГІП Жанна ХІЧЭЎСКАЯ, кіраўнік групы Вольга ЛУСКАТАВА, малады спецыяліст Аксана ЧЭРНЯЎСКАЯ і вядучы спецыяліст Анатоль ЕСМАН.

Начальнік аддзела інжынерных разведванняў Яўген ЗАХАРАНКА, кіраўнік групы Аляксандр БАЛАБОЛАЎ, інжынер Вольга ПАПРУГА і кіраўнік групы Арцём АСТАШЭВІЧ.

Кіраўнік групы афармлення, камплектацыі і выпуску праектаў Наталля САФРАНОЎСКАЯ, інжынеры Анжэла БЕЛАЯ, Анжэла ДРЭВАЦЕНЬ і тэхнік Валянціна ПРЫТЧЫНА.

Кіраўнік групы Жанна ПЯТРОЎСКАЯ, вядучы інжынер Антаніна МІЦКЕВІЧ і інжынер Марыя КУДЛО.

Дзённік падарожніка

НА ЗАХАД — З МІРАМ

(Працяг. Пачатак у нумарах за 18—20, 23 кастрычніка.)

Знаёмства з Цудам свету — Мачу-Пікчу

Каб дабрацца да запаведнага месца, адкуль пачынаецца ўзыходжанне на гэтае легендарнае месца, дзе штодня бываюць дзесяткі тысяч турыстаў з усяго зямнога шара, беларусам давялося пераадолець шматкіламетровы пераезд на аўтобусе з Куска ў поўнай цемры па крутых звілістых горных перавалах да чыгуначнай станцыі, а потым на цягніку ў «прыгарад» Мачу-Пікчу. Ужо адсюль, пасля інструктажа мясцовага экскурсавода, на камфартабельным маламесным аўтобусе праз прасечаныя ў джунглях Амазонкі дарогі мы будзем дастаўлены на вышыню 2500 тысяч метраў, а потым пешшу «прагульвацца» на пік гэтай гары. І ўжо адтуль перад нашымі поглядамі раскінецца згублены горад інкаў Мачу-Пікчу — акружаны дзівоснай цішынёй, на крутой гары, што абмываецца ракой Урубамба. Бадай ніхто са сведкаў гэтага цуду не скажа супраць таго, што Мачу-Пікчу — гэта адзін з найпрыгажэйшых на планеце археалагічных манументаў і наймагутнейшы энергетычны цэнтр Паўднёвай Амерыкі. Ён лічыцца містычным месцам, якое стварае дадатную жыццёвую энергію. Кожны з турыстаў беларускай групы скарыстаў магчымасць дакрануцца да «энергетычнага» каменя, каб зарадзіцца энергіяй як мінімум да канца паездкі.

Дарэчы, не так даўно VIP-турыстам Мачу-Пікчу быў зорка Галівуда, папулярны амерыканскі акцёр Леанардо Ды Капрыа. Праўда, на час наведвання гэтага гістарычнага месца знакамітай асобай уваход турыстам быў забаронены — Ды Капрыа «прагульваўся» па Мачу-Пікчу без чужых вачэй.

Назва горада паходзіць з мовы кечуа і ў перакладзе азначае «старая вяршыня гары». Горад Мачу-Пікчу быў пабудаваны поўнасцю з каменя. У ім дакладна вылучаюцца два сектары: гарадская зона, дзе размешчаны храмы, палацы, знешнія прыступкі і крыніцы з вадой; сельскагаспадарчая — зона, дзе пабудаваны велізарныя ступеньчатыя тэрасы для земляробства.

Увогуле, гісторыя адкрыцця Мачу-Пікчу да гэтага часу загадкавая.

Над пустыняй — на смалёце

Адна з вельмі цікавых і загадкавых экскурсій у Перу для замежных турыстаў — гэта гадзінны палёт на лёгкім самалёце над пустыняй Наска, дзе з вышыні птушынага палёту можна разглядзець выявы птушак, звяроў і павукоў, створаных загадкавай цывілізацыяй Наска больш за два тысячагоддзі таму. Для таго каб гэтая мара здзейснілася, патрэбна зрабіць 4-гадзінны марш-кідок на аўтобусе з Лімы ў горад Іку. Мяркую, што яго назва ўжо знаёма многім беларусам. Крыху больш за месяц таму менавіта Іка прыняла на сябе раптоўны ўдар стыхіі: тут адбыўся адзін з самых разбуральных землятрусаў на зямлі за апошні час. Кажуць, што месцамі

Некалькі тысяч гадоў пасля знішчэння цывілізацыі інкаў горад быў проста згублены ў гушчыні трапічнага лесу, які густа ахутаў усю гарыстую мясцовасць. Мясцовыя жыхары быццам бы ведалі аб існаванні горада-загадкі, дакладней, яго развалінах, задоўга да таго, калі ў 1911 годзе гід Мелчор Артэага прывёў прафесара Хайрэма Бінгема да Мачу-Пікчу.

Паводле слоў нашага гіда Лены, горад Мачу-Пікчу, верагодней за ўсё меў рэлігійнае прызначэнне. Той жа Бінгем знайшоў могілкі, дзе пахаваны толькі жанчыны. Таму існуе меркаванне, што гэта быў велізарны манастыр для маладых жанчын і сховішча ўладыкі Куска.

Дарэчы, і гід Артэага, і амерыканец Бінгем, дабіраліся да горада не за 15 хвілін, як мы на аўтобусе, а амаль тыдзень пешшу па патаемнай сцяжыне інкаў, якая выходзіла з Куска і выводзіла ў пасяленне Мачу-Пікчу Гэтая пешая вузкая дарожка існуе і зараз, з'яўляючыся адным з найважнейшых ў свеце турыстычных маршрутаў. Яго можна прайсці за 4 дні (3 начлегі) альбо за 2-3 дні з двума начлегамі, пабываўшы на вышыні: 2600 метраў — мінімальнай, 4200 метраў — максімальнай.

Узыходжанне на Мачу-Пікчу і спуск у гарадок Агуас Кальентас, адкуль пачынаюцца ўсе турыстычныя маршруты на адно з Сямі Цудаў Свету, безумоўна, стала знакавай падзеяй для ўсёй беларускай групы. Мы насамрэч зарадзіліся дадатнай энергіяй, што было вельмі важна перад заўтрашнім вылетам ў Ліму, дзе нас чакала экскурсія ў Музей золата і дзе днём пазней пачынаўся тэнісны турнір Кубка Дэвіса.

Кандэлябр як чарговая загадка цывілізацыі інкаў

Яшчэ адной загадкай можна лічыць велізарны малюнак на скале ў выглядзе кветкі. Гэта так званы кандэлябр. Ён дакладна бачны з акіянскай прасторы. Дарэчы, гатэль на беразе Ціхага акіяна, дзе першапачаткова планаваўся начлег беларускіх турыстаў, аказаўся поўнасцю разбураны. Пацярпелі ў абсалютнай большасці тыя збудаванні, якія былі ўзведзены без захавання неабходных будаўнічых нормаў і выкарыстання адпаведных будаўнічых матэрыялаў.

Тым не менш, мястэчка Паракас жыве, дзякуючы турыстычнаму наплыву. Штодня валацугі з многіх рэгіёнаў свету імкнуцца паглядзець не толькі знакаміты кандэлябр, але і праплыць на катэры

з паўгадзіны на паўночны ўсход ад Паракаса і на востраў Балестас, каб пабачыць велізарныя чароды птушак, калоніі альбатросаў, бакланаў, марскіх коцікаў і нават невялікіх пінгвінаў.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

(Заканчэнне ў наступным нумары.)

Тытунёвая кантрабанда

Буйную партыю кантрабандных цыгарэт затрымалі лідскія памежнікі.

Паводле звестак прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, у лесе непадалёк ад беларуска-польскай мяжы нашы памежнікі спынілі грузавік «Вольва», якім кіраваў грамадзянін Польшчы. Падчас агляду транспартнага сродку ў ім было выяўлена 72 тысячы пачкаў цыгарэт расійскай вытворчасці агульным коштам больш за 70 мільёнаў рублёў. Высветлілася, што тытунёвыя вырабы кантрабандысты планавалі рэалізаваць на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Польшчы.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Не даехалі

Супрацоўнікі Бярозаўскага РАУС каля вёскі Сокалава на аўтамагістралі Брэст—Мінск спынілі дзве аўтамашыны. У «Хундаі» і «Фордзе» сядзелі 15 грамадзян Кітая. Пашпарты ў іх былі, а вось беларускіх візаў яны не мелі.

Везлі іх жыхары Баранавічаў. Нелегалаў затрымалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Усміхнёмся!

На пляжы:

— Мамаша, гэта не ваш сыночак закапаў у пясок мой капялюш?

— Не, вы што! Мой вунь там — прапальвае павелічальным шклом ваш надзіманы матрац.

☺

Цікава, якога колеру хамелеон, калі ён глядзіцца ў люстэрка?

☺

— Сынок! Ты нас з мамай любіш? Любіш? Ну не саромейся, скажы — любіш?!

— ...

— Адказвай, мярзотнік, калі цябе дарослыя пытаюцца!

☺

Злодзей у судзе. Суддзя:

— Падсудны, патлумачце суду, чаму вы, узламаўшы сейф, узялі з яго толькі грошы, а не ўпрыгажэнні?

— Пан суддзя, вы зараз гаворыце прама як мая жонка...

☺

Калі ў мужа выраслі рогі, значыцца не ўсе мужчыны ўчора глядзелі футбол.

Хозяйственный суд Могилевской области
06 ноября 2007 года в 10.00
путем проведения повторных публичных торгов с понижением стоимости на 20 % продает арестованное имущество РУСП «Совхоз «Круглянский» Круглянского района — двухэтажное здание специализированной розничной торговли 1993 года постройки, общей площадью 377 кв. м, расположенное по адресу: г.п. Круглое, ул. Заслонова, 13, стоимость имущества после переоценки — 104 067 200 руб.

Лицо, желающее принять участие в торгах, обязано дать подписку о том, что нет препятствий, предусмотренных законодательством, для приобретения имущества, и внести на депозитный счет хозяйственного суда № 3642910890659 в филиале 700 ОУ АСБ «Беларусбанк» г. Могилева, код 536, УНП 700233927, сумму в размере 10 процентов оценки стоимости продаваемого имущества. Сумма, внесенная лицом, купившим имущество с торгов, зачисляется в счет покупной цены. Остальным участникам торгов предварительно внесенные ими суммы возвращаются после окончания торгов, если иное не установлено законодательством.

Торги состоятся в г.п. Круглое, ул. Заслонова, 13. За справками обращаться по тел. 32 70 52.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.53	17.53	10.00
Віцебск —	7.46	17.40	9.54
Магілёў —	7.44	17.44	10.00
Гомель —	7.37	17.44	10.07
Гродна —	8.08	18.09	10.01
Брэст —	8.05	18.13	10.08

Месяц

Поўня 26 кастрычніка.

Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Зінаіды, Льва, Піліпа;*

К. *Антаніны, Марты, Антона, Марціны, Рафала .*

Надвор'е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+9 — +7 °C	МАСКВА	+7 — +9 °C
ВІЛЬНЮС	+9 — +11 °C	РЫГА	+8 — +10 °C
КІЕЎ	+8 — +10 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+5 — +7 °C

Без ападкаў

Дзве даты

24 кастрычніка

1857 год — выпускнікі Кембрыджа заснавалі ў Шэфілдзе першую ў свеце футбольную каманду. Хто б ведаў тады, што футбол вельмі хутка стане «гульнёй мільёнаў».

1945 год — уступіў у сілу статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. ААН была створана 51 дзяржавай (у ліку заснавальнікаў — Беларусь), якія заявілі аб сваёй рашучасці захаваць мір шляхам развіцця міжнароднага супрацоўніцтва і стварэння калектыўнай бяспекі. Сёння членамі ААН з'яўляюцца больш як 200 краін свету.

Цытата дня

«Юнак хацеў бы захаваць вернасць, ды не захоўвае; стары хацеў бы здрадзіць, ды не можа».

Оскар Уайльд (1854—1900), англійскі пісьменнік.

Згублены дыплом УВ-І № 028515, выдадзены Беларускім дзяржаўным інстытутам народнай гаспадаркі на імя Шкнай Дзмітрыя Веніямінавіча, лічыць **несапраўдным**.

Выстава

Хачу сукенку як у князёўны! Не апрануць, дык паглядзець...

Якая модніца не марыла б прымераць на сябе каралеўскую сукенку? Ну хоць бы ў думках... З такім настроем толькі і ісці на выставу гістарычнага касцюма ў Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі. Вось тут усе знаходкі, асаблівасці стылю і сілуэта розных эпох можна ацаніць і, што называецца, адчуць розніцу паміж строямі былых стагоддзяў і сённяшняй вопраткай.

Што насілі ў Еўропе XVI стагоддзя, ці як магла б выглядаць беларуская модніца дзвесце ці трыста гадоў таму, што можна было апрануць на баль яшчэ ў XIX стагоддзі? На гэтыя пытанні можа даць адказы выстава і людзі, якія стваралі ўсе касцюмы, што прадстаўлены на ёй. Рэканструкцыяй гістарычных касцюмаў у нашай краіне займаюцца майстры прадпрыемства «Люсерж», у якім за 14 гадоў існавання ўжо назапашаны цікавы вопыт распрацоўкі і вытворчасці сцэнічнага касцюма.

Усе строі распрацоўваюцца ў спецыяльнай дызайн-студыі пад кіраўніцтвам мастака-дызайнера Любові Казловай. Моду розных эпох даводзілася вывучаць, вядома ж, абапіраючыся на творы мастацтва, якія знаходзяцца ў Дрэздэнскай карціннай галерэі, італьянскай Уфіцы і Эрмітажы. Беларускія моднікі, пэўна ж, імкнуліся не адставаць. Уяўленне пра тое, што насілі ў тыя часы на нашых землях, таксама можна скласці з твораў беларускага мастацтва, партрэтаў нашых шляхцічаў. А калі ўсё падсумаваць, то можна сказаць, што новага ўносіла ў стыль і сілуэт строяў кожная эпоха і што асаблівага ўносіла ў моду кожная краіна. На выставе можна скласці ўражанне пра сярэднявечную моду самых розных краін свету — Францыі, Англіі, Італіі, Іспаніі, Расіі. Якія колеры, якія былі дэталі, якія аксесуары, што да чаго падыходзіла... Карацей, вось дзе можна атрымаць адказы на пытанні, якія непакояць моднікаў сакон веку. Да 12 снежня гэта яшчэ можна пабачыць.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Карэспандэнт даследуе праблему

ПА АДЗІН БОК БАРЫКАД

Маленькіх кацянят у «Фаўну горада» прыносяць амаль кожны дзень.

У рэдакцыю газеты прыйшоў ліст ад грамадскай арганізацыі абароны жывёл «Ратаванне» з просьбай «выратаваць прытулак для жывёл па вуліцы Гурскага ў Мінску». Праблема ў тым, што гэтую арганізацыю просяць «вызваліць памяшканні».

Там, на Гурскага, па адным адрасе існуюць дзве арганізацыі: Камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Фаўна горада» і грамадская арганізацыя «Ратаванне». У 2004 годзе «Ратаванне» арганізавала прытулак для бяздомных жывёл у «Фаўне» (тады гэта быў Пункт прыёму і часовага ўтрымання жывёл). За дапамогу жывёлам з іх не бралі плату за так званую «арэнду» памяшканняў.

Няма сумненняў, што «Ратаванне» — добрая і патрэбная арганізацыя. За свой кошт яна толькі за апошнія тры гады прастэрылізавала каля 1000 жывёл, якіх утрымліваюць пенсіянеры і малазабяспечаныя грамадзяне. Каля 500 сабак і катоў, дзякуючы гэтай арганізацыі, знайшлі сабе новых гаспадароў. Сёння ў прытулку жывуць каля трох дзесяткаў сабак і больш за два тузіна кошак. Гэтыя жывёлы таксама прастэрылізаваныя, пралечаныя і вакцінаваныя. Прыкладна палова з іх — забраныя з «Фаўны», астатнія — частка бяздомныя, якім патрэбна шукаць гаспадароў, а частка з аўтастаянак і дач: іх пасля стэрылізацыі і выходжвання вяртаюць на «грамадскую» службу. Сама арганізацыя існуе за кошт ахвяраванняў ад насельніцтва. У 1999 годзе арганізацыя стала членам Сусветнага таварыства абароны жывёл (WSPA) і членам Асацыяцыі каралеўскага таварыства па прадухіленні жорсткага абыходжання з жывёламі (RSPCA, Вялікабрытанія).

Прадпрыемства «Фаўна горада» — нешта накшталт антаганіста «Ратаванню». Ёсць прастамоўная трапная назва ў першай — «жывадзёрка». Да нядаўняга часу прастамоўная назва амаль цалкам адпавядала дзейнасці прадпрыемства. Жывёл адлоўлівалі на вуліцах без перабору: і беспритульных, і хатніх. Зарплата ў «лаўцоў» была здзельная, гэта значыць, што на жывёл тыя глядзелі больш як на грошы, а не як на жывых істотаў. Потым сабак і кошак прывозілі ў Пункт прыёму, дзе ўтрымлівалі пяць дзён. Калі за гэты тэрмін па меншага брата ніхто не звяртаўся, яго вялі ў пакой эўтаназіі. Да прыкладу, за апошнія тры месяцы «лаўцы» ў «Фаўну» прывезлі 563 сабакі і 827 катоў. Яшчэ 226 сабак і 117 катоў прынеслі самі гаспадары.

Як здараецца, што людзі сваіх гадаванцаў прыносяць у такое страшнае месца? Прычын шмат. Напрыклад, незапланаванае патомства. Гаспадар, каб не забіваць шчанят альбо кацянят самому, прывозіць іх у Пункт часовага ўтрымання жывёл. Былі і іншыя выпадкі. Прынёс школьнік дамоў кацяня. Бацькі, каб малое больш так не рабіла, прымушаюць яго завезці кацяня на Гурскага. Бацькоў не хвалюе, што іх дзіця вымушана будзе падпісаць згоду на забойства маленькага сябра...

Вось так і жывуць дзве арганізацыі разам, у адным будынку: адна забівае, другая ратуе. І, напэўна, у такім яднанні супрацьлегласцяў была нейкая жахлівая праўда нашага жорсткага жыцця. Калі быць дакладным — жыцця, якое мы, людзі, зрабілі жорсткім. І па сваім маладушшы самі ад сябе гэта схавалі.

Да некаторага часу дзве арганізацыі, нягледзячы на супрацьлегласць сваіх мэтаў і дзеянняў, быццам бы мірна суіснавалі. Але вось перада мной ліст ад «Ратавання» з маленнем аб дапамозе: існаванне прыстанішча для безабаронных жывёл пад пытаннем. Кіраўніцтва КУП «Фаўна горада» больш не жадае, каб прытулак «Ратавання» знаходзіўся ў іх будынку.

Што здарылася? У лісце тлумачэнне: змены пачаліся з назначэннем у «Фаўне» новага намесніка дырэктара па забараняльнай дзейнасці Наталлі Бялянавай. З кантэкста ліста вымалёўваўся даволі адмоўны вобраз гэтай жанчыны. Аднак пры сустрэчы аказалася, што гэта даволі інтэлігентная жанчына. Сустрэліся мы непасрэдна на Гурскага ў каморцы ахоўніка, і яна расказала мне свой погляд на сітуацыю, якая склалася вакол жывёл у гэтым месцы.

Некалькі гадоў таму Наталля Аляксандраўна згубіла ў Мінску сабаку. Яна тыдзень шукала яго па некалькіх раёнах, развешвала аб'явы. Потым ёй параілі з'ездзіць на Гурскага. Яна ведала пра гэтую ўстанову, але падсвядома адштурхоўвала ад сябе думку, што туды давядзецца ехаць.

— Я проста шкадавала сябе, — прызнаецца Наталля. — Я ніколі не праходзіла міма кінутага калматага сябра забірала з вуліцы сабаку ці кошку, дома мыла, карміла, а потым шукала ім гаспадара па аб'явах. Адчувала, што ўбачыць вялікую колькасць асуджаных, з якімі яшчэ і вельмі жорстка абыходзяцца, я не гатова.

Аднак тое, што яна ўбачыла ў Пункце, прымусіла яе змяніць свае погляды і нават жыццё. Усё аказалася значна горш, чым яна думала. Наталля Аляксандраўна даведалася, што жывёл забіваюць без седататыўных прэпаратаў... Гэта азначае, што браты нашы меншыя надзвычай пакутуюць у апошнія хвіліны свайго жыцця. Тады Наталля Аляксандраўна вырашыла стварыць сваю заахоўную арганізацыю і прытулак, каб выратоўваць жывёл з Гурскага. Яна ведала, гэтым ужо займаецца грамадская арганізацыя «Ратаванне», але не сумнявалася, што апошняй неабходна «падмацаванне». Наталля Аляксандраўна звярнулася ў Мінгарвыканкам са скаргамі на Пункт часовага ўтрымання жывёл. У адказ яе... запрасілі на пасаду намесніка па заахоўнай дзейнасці на гэта прадпрыемства, каб яна сама паспрабавала змяніць сітуацыю. І яна пагадзілася.

Уладкаваўшыся на новае месца працы, Наталля Аляксандраўна даведалася яшчэ пра больш жахлівыя падрабязнасці жыцця і смерці сяброў чалавека па названым адрасе на вуліцы Гурскага. Напрыклад, яна ўбачыла, як сабаку валакуць у пакой эўтаназіі. Той супраціўляецца ўсімі сваімі сіламі, бо чуе і здагадваецца, што з ім будуць рабіць. У смерці ёсць свой пах. У спецыяльным пакойчыку жывёліну падвешваюць. І гэта відовішча — таксама не для слабанервовых. Потым прыгаворанаму робяць прамы ўкол у сэрца. Перад смерцю жывая істота надзвычай пакутуе ад сутаргаў і болю. У падвешаным стане. І здаецца, што збаўленне не прыходзіць цэлую вечнасць...

— Гэта страшна не толькі для сабак, але і для людзей, — упэўнена Наталля Аляксандраўна. — Чалавеку нельга прапаноўваць займацца насіллем кожны дзень. Потым ён проста пачынае ставіцца да гэтага вельмі спакойна. Такую працу людзям нельга прапаноўваць.

У маі гэтага года Пункт часовага ўтрымання жывёл перайменаваўся ў КУП «Фаўна горада», у статуце якой прапісана мэта — гуманізацыя адносінаў да безнагляднага жывёл. Першае, што зрабілі на новым прадпрыемстве, — увялі фіксаваную зарплату «лаўцам».

— Раней «Лаўцам» галоўнае было даставіць цела жывёлы, — расказвае Наталля. — Было шмат зваротаў ад людзей у грамадскія аб'яднанні, якія бачылі, як «лаўцы» ўдаўкай удушвалі жывую істоту на іх вачах.

Раней, калі сабаку ці ката прымалі, прысутнічаў адзін супрацоўнік Пункта, а зараз — тры. Сёння, калі лаўцы прывязуць мёртвую кошку ці сабаку, ім давядзецца напісаць тлумачальную запіску... На сёння ў КУП «Фаўна горада» прывозяць трупы толькі з «падбору» (гэта калі ЖЭС выклікае забраць з вуліцы жывёліну, якая загінула).

Намеснік дырэктара таксама занялася ўмовамі ўтрымання жывёл, каб зменшыць колькасць інфекцый.

— Тут ужо не проста вірус, а сапраўднае насланне, — гаворыць Наталля Аляксандраўна. — Жывёлы знаходзяцца ў стане стрэсу і з аслабленым імунітэтам, таму вельмі хутка захворваюць і паміраюць. У нас вельмі вялікая колькасць паступлення жывёл — не хапае месца.

Перапоўненыя клеткі — яшчэ адна бяда «Фаўны». І сапраўды, нармальнаму чалавеку ў вальерах немагчыма знаходзіцца больш чым хвіліну — такі невыносны пах, што «вочы рэжа».

Але мне паказалі і іншы вальер, у якім праводзілі аэразольную дэзінфекцыю спецыяльным апаратам, які набыла «Фаўна» якраз з прыходам новага намесніка. Там не было жудаснага смуроду. Менавіта дэфіцыт памяшканняў, паводле слоў Наталлі Аляксандраўны, і стаў прычынай канфлікту паміж «Фаўнай» і «Ратаваннем».

— У падобных установах існуюць правілы ўтрымання жывёл паводле прынцыпу «пуста — занята», — тлумачыць намеснік дырэктара. — Памяшканне запаўняецца жывёламі на працягу сутак ці двух. Там яны затрымліваюцца на тыдзень. Потым вальер трэба ачысціць, каб прадэзінфікаваць, а пасля праведзеных працэдур памяшканне павінна пуставаць яшчэ некалькі дзён. У гэты ж час жывёламі запоўненыя іншыя вальеры. Гэты прынцып дазволіць па чарзе ачышчаць кожны вальер, што дапаможа хутчэй пазбавіцца ад інфекцый.

Акрамя гэтага, Наталля Бялянава вырашыла пакончыць з жорсткай практыкай усыпляць жывёл без седататыўных прэпаратаў. Для таго каб атрымаць дазвол на ўвядзенне прэпарата, патрэбна мець ліцэнзію на ветэрынарную дзейнасць. «Фаўна» ліцэнзію атрымала. Цяпер трэба абсталяваць кабінет ветэрынара. А для гэтага арганізацыі неабходна мець дадатковыя тры пакоі...

— На сёння колькасць жывёл у горадзе рэгулюецца шляхам забойства, дык няхай яны хоць бы памруць без страху і болю, — гаворыць Наталля. — Зразумела, самы разумны спосаб рэгулявання колькасці жывёл — стэрылізацыя. Той жа сабака жыве восемдзесяць гадоў. Зграю сабак, напрыклад, адлавілі, стэрылізавалі і выпусцілі. У дварах яна дажывае свой век і новыя туды не прыбіваюцца. Гэта ўжо даказана. Але, здаецца, наша грамадства не гатовае да гэтага: людзі не хочуць жыць побач з жывёлай.

Рада (2 гады) — вельмі ўраўнаважаны сабака, добры ахоўнік кватэры. Вельмі любіць людзей, асабліва дзетак. Чакае свайго гаспадара ўжо два месяцы.

«Жывадзёрня» больш не хоча быць «жывадзёрняй», яна хоча стаць больш чалавечнай, стварыць добрыя ўмовы для знаходжання жывёл, хоць, магчыма, і ў апошнія іх дні.

Наталля Аляксандраўна не бачыць нічога кепскага ў тым, што «Фаўна» не хоча працягваць тэрмін знаходжання ў будынку арганізацыі «Ратаванне».

— Мы імкнёмся цяпер, каб КУП «Фаўна горада» стала эталонам для пераймання, — гаворыць яна. — Але для гэтага нам патрэбны нашы плошчы.

Людміла Атрашкевіч, старшыня грамадскага аб'яднання «Ратаванне», лічыць, што патрабаванне Наталлі Бялянавай адназначна зробіць існаванне дабрачыннай арганізацыі немагчымым.

— Мы дзевяць гадоў шукалі памяшканне для прытулку, пакуль не знайшлі тут, на Гурскага,— гаворыць яна. — Калі б было куды з'ехаць, мы б ужо даўно з'ехалі. Размова ж не проста пра любое памяшканне. Трэба, каб яно адпавядала шматлікім нормам: вада, святло, вываз адходаў. Вальеры за горадам таксама для нашай арганізацыі непрымальныя. Каб іх пабудаваць, патрэбна шмат грошай, якіх у нас няма. Да таго ж, у «Ратаванне» прыходзяць даглядаць жывёл школьнікі, студэнты і пенсіянеры. Гэтыя людзі не паедуць пакарміць і выгуляць сабаку за горад, яны фізічна гэтага не змогуць зрабіць. А даглядаць жывёл патрэбна кожны дзень.

На жаль, тыя, хто захацеў паклапаціцца аб жывёлах, не знайшлі агульнай мовы паміж сабой, нібыта не чуюць адзін аднаго. Каб вырашыць сваю праблему, яны звярнуліся ва Унітарнае вытворчае прадпрыемства кіравання жылой гаспадаркай Мінгарвыканкама. Пасля перамоў было вырашана заключыць дагавор арэнды памяшкання грамадскаму аб'яднанню «Ратаванне» на адзін год. За гэты час «Ратаванне» павінна знайсці сябе новае памяшканне і адаптавацца да новых умоў.

Але... Умовы дагавора кіраўніцтву прытулку «Ратаванне» не спадабаліся: прызначаны кошт арэнды памяшкання проста вымусіць арганізацыю з'ехаць адразу. І зноў прадстаўнікам Упраўлення жылой гаспадаркай Мінгарвыканкама давядзецца садзіцца разам з дзвюма арганізацыямі за стол перамоў.

Наталля Бялянава ўпэўненая, што за адзін дзень іх праблема не вырашыцца, бо старшыня ГА-АЖ «Ратаванне» пісала і будзе пісаць скаргі ў Мінгарвыканкам. Людміла Атрашкевіч упэўнена, што яе арганізацыю кіраўніцтва КУП «Фаўна горада» проста «выжывае» з плошчаў. Дзве заахоўныя арганізацыі, якія хварэюць за адну і тую ж праблему, сёння ваююць паміж сабой... Падаецца мне, што ў гэтай «вайне» больш за ўсё пакутуюць якраз гуманныя адносіны да братоў нашых меншых. Але гэта сітуацыя дае падставу задумацца і ўладам горада, і звычайным людзям. Раз бяздомных жывёл так шмат, што нават не хапае памяшканняў, каб даць ім годна памерці, то, можа, прыйшоў час пабудаваць яшчэ? А людзям стаць больш адказнымі. Бяздомныя калісьці мелі дом...

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Наталля БЯЛЯНАВА з Бімам, якому тэрмінова патрэбен гаспадар, інакш Біма чакае ўсыпленне.

ДАРОГІ, якія мы выбіраем

Камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Магілёўаблдарбуд» робіць апраўданую стаўку на перспектыўнае развіццё

Дынамічнае сацыяльна-эканамічнае развіццё — без усялякага перабольшвання, сапраўдная адметнасць дня сённяшняга. Прычым датычыцца гэта ўсяго народнагаспадарчага комплексу краіны, які з году ў год паступальна нарошчвае вытворчыя паказчыкі. Такі заўважны рух наперад стаў магчымым у выніку зладжанай працы многіх айчынных прадпрыемстваў, якія ў цяжкія часы здолелі не толькі ўтрымацца, але і стварыць трывалую аснову для актыўнага развіцця. Айчынная эканоміка на ўздыме — такую ацэнку цяперашняй сітуацыі нярэдка можна пачуць ад многіх экспертаў. Гэта той самы фактар, які ў лепшы бок адрознівае нашу дзяржаву на постсавецкай прасторы. Напэўна, менавіта такая сітуацыя з'яўляецца прамым пацвярджэннем правільнасці абранага шляху развіцця — узважанага, прадуманага, без рэзкіх рыўкоў і сацыяльных узрушэнняў.

Ці не галоўны станоўчы момант, які адзначаюць многія, — нашай дзяржаве ўдалося не толькі захаваць свой вялізны навукова-практычны патэнцыял (шэраг краін былога Савецкага Саюза яго хутка страцілі і адразу трапілі «пад уплыў» больш развітых замежных дзяржаў), але і значна яго памножыць. І датычыцца гэта самых розных галін народнагаспадарчага комплексу Беларусі — ад прамысловасці да сельскай гаспадаркі, ад сферы паслуг да самых сучасных вытворчасцяў. Адбываецца мадэрнізацыя — таксама адзін са станоўчых фактараў дня сённяшняга. Дзякуючы тэхнічнаму абнаўленню, укараненню найноўшых тэхналогій, айчынныя прадпрыемствы на роўных канкурыруюць з замежнымі калегамі. Іншымі словамі, нават улічваючы шэраг аб'ектыўных цяжкасцяў, з якімі сутыкаюцца айчынныя вытворцы, эканамічны механізм працуе зладжана і рытмічна.

Змены да лепшага адбываюцца і ў дарожнай галіне. Многія адпаведныя прадпрыемствы паспяхова спраўляюцца з выкананнем усіх найважнейшых паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця. І гэта па-свойму вельмі адметны момант, паколькі стан дарог — рэальнае адлюстраванне тых працэсаў, якія адбываюцца ў эканоміцы. Многія госці, якія наведваюць нашу дзяржаву, адзначаюць добры стан, дагледжанасць беларускіх «стрыт», прычым не толькі буйных трас, але і дарог у глыбінцы. Апошняя пазіцыя — напэўна, адзін з найбольш складаных накірункаў, аднак не менш важны, паколькі гаворка ідзе пра бесперапыннасць транспартных перавозак, забеспячэнне камфорту і бяспекі для людзей, стварэнне належных умоў для працы і жыцця. Нездарма ж работнікі дарожнай галіны актыўна падключыліся да рэалізацыі грунтоўнай Праграмы адраджэння і развіцця вёскі — надзвычай актуальнай і запатрабаванай часам сістэмы мерапрыемстваў. Актыўны ўдзел у гэтай надзённай рабоце прымае і КУП «Магілёўаблдарбуд». Каб даведацца аб тым, як тут справы ладзяцца, мы і накіраваліся на вядомае прадпрыемства. Камандзіроўка атрымалася вельмі змястоўнай — пабачыць і пачуць удалося шмат. Аднак аб усім па парадку...

Сакрэты дбайных гаспадароў

Сетка мясцовых аўтамабільных дарог, якая абслугоўваецца камунальным унітарным прадпрыемствам «Магілёўаблдарбуд», даволі вялікая — паводле апошняй інфармацыі, агульная працягласць складае больш чым 10,3 тысячы кіламетраў. Большая частка (7,1 тыс. км) прыпадае на аўтадарогі з цвёрдым пакрыццём, акрамя гэтага звыш 3 тысяч кіламетраў грунтовых дарог. Такія лічбы сапраўды ўражваюць, паколькі кожны ўчастак патрабуе ўвагі і догляду. Вялікі аб'ём работы — у аграгарадках. Сёлета ў адпаведнасці з Праграмай адраджэння і развіцця вёскі ў Магілёўскай вобласці намечана стварэнне 37 такіх населеных пунктаў новага тыпу. Падыход тут адзін: узровень абслугоўвання і абуладкаванне ў аграгарадках ніколькі не павінны саступаць гарадскім.

— На сёння ўсе населеныя пункты, дзе намечана стварыць аграгарадкі, забяспечаны сувязямі з дарогамі агульнага карыстання па пад'ездах з цвёрдым пакрыццём, — адзначае генеральны дырэктар камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Магілёўаблдарбуд» Мікалай Краўцоў. — Аднак шэраг з іх патрабавалі правядзення рамонтаў, асфальтабетоннага пакрыцця (па гравійных дарогах). Паколькі ўсе дарогі, якія абслугоўваюцца прадпрыемствам, знаходзяцца ў вёсцы, то выкананне праграмы дарожных работ непасрэдна можна з поўным правам аднесці да ўвасаблення ў жыццё праграмы «Мадэрнізацыя аўтамабільных дарог у сельскай мясцовасці». У прыватнасці, у частцы, што датычыцца забеспячэння круглагадовага ўтрымання сеткі мясцовых аўтадарог, правядзення рамонту і рэканструкцыі аўтадарог, якія з'яўляюцца праездамі ад раённых цэнтраў да аграгарадкоў, а таксама ад аграгарадкоў да сельскіх населеных пунктаў і праездамі (вуліцамі), што знаходзяцца на балансе аблдарбуда, у аграгарадках.

Падчас рэалізацыі адпаведнай праграмы за дзевяць месяцаў па аб'ектах, што адносяцца да абуладкавання ў гэтым годзе ў аграгарадках, асвоена 16,8 мільярда рублёў. Усяго выкананы капітальны і бягучы рамонт 173 кіламетраў мясцовых аўтадарог (пры плане на год 160 кіламетраў), зроблена 28 кіламетраў тратуараў. За гэтымі лічбамі — самаадданая, карпатлівая праца работнікаў, якія стваралі (і стварылі) належныя ўмовы для вяскоўцаў. Акрамя таго, «Магілёўаблдарбуд» выступае ў якасці падрадчыка па большасці аб'ектаў дадатковай інфраструктуры з ліку тых, што ўключаны ў Пералік аб'ектаў, якія фінансуюцца ў 2007 годзе па Магілёўскай вобласці за кошт сродкаў рэспубліканскага дарожнага фонду ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 лютага 2007 г. № 69. Работы выконваюцца самыя розныя — гэта рамонт пад'ездаў і тэрыторый малочна-таварных фермаў, пляцовак для захоўвання і сушкі збожжа, рамонт пад'ездаў да іншых вытворчых аб'ектаў, а таксама рамонт аўтамабільных дарог не агульнага карыстання (вуліц), якія праходзяць па тэрыторыі аграгарадкоў. Зараз па адпаведных аб'ектах прадпрыемствам асвоена 21,2 мільярда рублёў.

Аб'ёмы работ, што выконваюцца работнікамі «Магілёўаблдарбуда» ў населеных пунктах, якія намечаны пад абуладкаванне аграгарадкоў, сапраўды ўражваюць. З кожным годам адпаведныя лічбы павялічваюцца, а значыць, з'яўляецца больш магчымасцяў. Зразумела, усё, у рэшце рэшт, залежыць ад выдзялення фінансавых сродкаў. Можна з упэўненасцю канстатаваць, што тут дынаміка станоўчая — калі ў 2005 годзе на абуладкаванне аднаго аграгарадка дарожнікам выдзялялася 200—250 мільёнаў рублёў, то сёлета адпаведныя выдаткі ў сярэднім складаюць 950 мільёнаў рублёў. Гэта адчувальны крок наперад, сведчанне той увагі, якая на дзяржаўным узроўні надаецца адраджэнню вёскі. Удзел работнікаў «Магілёўаблдарбуда» ў рэалізацыі адпаведнай грунтоўнай праграмы заўважны. Калі наведвалі шэраг прадпрыемстваў, аб'ектаў, дзе вядуцца ці былі праведзены работы, у гэтым кожны раз пераконваліся. Узяць, да прыкладу, асобныя аграгарадкі, якія з'явіліся ў Магілёўскім раёне. Чым, здаецца, тут можна здзівіць журналістаў, якім давялося пабываць на гэты раз. Можам сведчыць: усё тут зроблена з вялікай адказнасцю, па-гаспадарску. Як казалі ў размовах работнікі прадпрыемства, калі рабіць, то рабіць добрасумленна. У гэтым, напэўна, і ёсць самы галоўны сакрэт дбайных гаспадароў, якія сапраўды абуладкоўваюць населеныя пункты новага тыпу, здольныя прывабіць многіх людзей. Якім захочацца тут жыць і працаваць, што, на наш погляд, з'ўляецца яшчэ адным пераканальным доказам на карысць перспектывы беларускай вёскі.

За апошнія тры гады ў Магілёўскім раёне былі абуладкаваны дзевяць аграгарадкоў, сёлета работы разгарнуліся ў трох — вёскі Сухары, Раманавічы, Княжыцы і Сумарокава набудуць новы статус. На правядзенне адпаведных работ аднаму з падраздзяленняў камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Магілёўаблдарбуд» — дарожнаму рамонтна-будаўнічаму ўпраўленню № 128 — было выдзелена больш чым 2,4 мільярда рублёў. За якасць і своечасовасць выканання работ хвалявацца не варта — спецыялісты прадпрыемства з усім справяцца як мае быць. Нездарма ж па выніках работы за мінулы год за высокія паказчыкі ў рамонце і будаўніцтве дарог ДРБУ-128 было прызнана лепшым прадпрыемствам у раёне. У кабінеце начальніка — ганаровы сцяг, які дарожнікі, безумоўна, заслужылі законна. Такое высокае прызнанне з'яўляецца рэальным пацвярджэннем прафесіяналізму калектыву. Што можна з упэўненасцю сказаць і пра ўвесь КУП «Магілёўаблдарбуд». Многіх з тых, хто тут працуе, можна назваць сапраўднымі майстрамі сваёй справы, работнікамі, у якіх кожнаму з нас ёсць чаму павучыцца. Напэўна, перш за ўсё — стаўленню да сваёй працы.

На вагах еўрапейскіх стандартаў

Устойлівае развіццё камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Магілёўаблдарбуд» яскрава характарызуе выкананне планавых заданняў. За восем месяцаў гэтага года выкананы ўсе прагнозныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця. За адпаведны перыяд прадпрыемства ў поўнай меры справілася з праграмай увядзення ў эксплуатацыю аб'ектаў будаўніцтва і капітальнага рамонту аўтамабільных дарог. У прыватнасці, зроблены капрамонт 10,3 кіламетра, а 208,9 кіламетра дарог завершана бягучым рамонтам. Своечасова (у адпаведнасці з зацверджанымі тэрмінамі) выконваецца комплекс неабходных работ на аб'ектах у аграгарадках. Як з упэўненасцю заўважаюць у «Магілёўаблдарбудзе», ужо зараз можна сцвярджаць: гадавая праграма работ па мясцовых дарогах Магілёўскай вобласці будзе выканана. Разам з тым ёсць і пэўныя цяжкасці.

— Фінансавыя сродкі перш за ўсё выдаткоўваюцца на правядзенне бягучых рамонтаў і ўтрыманне сеткі мясцовых аўтадарог для падтрымання яе эксплуатацыйнага стану і прадухілення далейшага разбурэння, забеспячэння бяспечных умоў для ўдзельнікаў дарожнага руху, бесперапыннага праезду да населеных пунктаў, якія маюць грунтовыя пад'езды, — кажа Мікалай Краўцоў. — Апошняе найбольш актуальна ўвосень і вясной, падчас дажджоў. Зразумела, што ў такіх умовах удзельная вага расходаў на ўтрыманне і бягучы рамонт сеткі мясцовых дарог у агульным аб'ёме фінансавання складае дзесьці 85 працэнтаў. Трэба адзначыць, што гэта даволі трывожная тэндэнцыя. Вытворчыя магутнасці філіялаў прадпрыемства дазваляюць выконваць значна большыя аб'ёмы работ, у тым ліку і па капітальных рамонтах, будаўніцтву і рэканструкцыі. Гэта вельмі актуальная праблема, паколькі на сёння пратэрмінаваны міжрамонтныя тэрміны капітальнага рамонту на значным участку сеткі аўтадарог, якія мы абслугоўваем. На больш чым 70 працэнтах агульнай працягласці рамонты не выконваліся больш чым дзесяць гадоў. Зараз для забеспячэння транспартных сувязяў сельскіх населеных пунктаў з аграгарадкамі, цэнтральнымі сядзібамі гаспадарак існуе неадкладная патрэба ў правядзенні новага будаўніцтва на грунтовых дарогах, якія перададзены на баланс прадпрыемства. У большасці такія дарогі абсалютна не абуладкаваныя, фактычна яны з'яўляюцца толькі накірункамі на мясцовасці, не забяспечваюць бесперапыннага праезду на працягу ўсяго года.

На працягу 1997—2005 гадоў рэканструкцыя і будаўніцтва мясцовых аўтадарог у межах рэалізацыі дзяржаўнай праграмы «Дарогі Беларусі» адбывалася далёка не ў тых аб'ёмах, у якіх спачатку планавалася. Асноўнай прычынай такой сітуацыі з'яўляецца тое, што прадпрыемства забяспечвалася фінансавымі сродкамі (у адносінах да аб'ёмаў, якія былі прадугледжаны дзяржпраграмай) не больш, чым на трэць. Такім чынам, у той час як агульная працягласць сеткі дарог Магілёўскай вобласці, што абслугоўваецца прадпрыемствам, за апошнія пяць гадоў узрасла больш чым у 1,5 раза, фінансаванне ж дарожных работ у супастаўных цэнах зменшылася. Факт сам па сабе вельмі паказальны. На жаль, даводзіцца канстатаваць, што, нягледзячы на паляпшэнне сітуацыі з фінансаваннем мясцовых аўтадарог, адпаведная тэндэнцыя захоўваецца і дасюль. Таму недахоп сродкаў — па-ранейшаму надзвычай актуальнае пытанне.

— Усе населеныя пункты вобласці, дзе размешчаны будынкі сельскіх Саветаў і якія з'яўляюцца цэнтральнымі сядзібамі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, звязаны мясцовымі дарогамі з цвёрдым пакрыццём, — заўважае галоўны інжынер камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Магілёўаблдарбуд» Міхаіл Шастакоў. — Гэта дазваляе забяспечыць да іх бесперапынны круглагадовы праезд аўтатранспарту. Вядома, што для аўтамабільных дарог устаноўлены канкрэтныя тэрміны, пасля заканчэння якіх патрабуецца неадкладнае правядзенне капітальнага рамонту для падтрымання эксплуатацыйнага стану ў адпаведнасці з нарматыўнымі патрабаваннямі. Пэўная іх частка пабудавана сіламі саміх сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, так званым гаспадарчым спосабам.

Вышэй мы прыводзілі статыстыку аб павелічэнні сеткі аўтамабільных дарог, якія абслугоўваюцца ўладкаванне водапрапускных труб, водаадводных кюветаў, а таксама палепшаных грунтовых пакрыццяў шляхам увядзення ў грунт земляного палатна розных дабавак (гравій, шчэбень і г.д.), засыпка паніжаных месцаў грунтам. Аднак прымяненне названых мераў не ў кожным выпадку дазваляе забяспечыць круглагадовы бесперапынны праезд. Для пераводу такіх дарог у гравійныя патрабуюцца даволі вялікія сродкі — неабходна выдаткаваць каля 262,5 мільярда рублёў. Паводле разлікаў, затраты на выкананне адпаведнага комплексу работ складаюць з разліку дзесьці 85 мільёнаў рублёў на адзін кіламетр дарог. Як заўважаюць у «Магілёўаблдарбудзе», стварэнне з мінулага года адзінага дарожнага фонду па рэспубліцы дазволіла істотна палепшыць стан сеткі вобласці, якую абслугоўваюць работнікі прадпрыемства. У сувязі са змяненнем падыходаў да фінансавання мясцовых аўтадарог і рэалізацыяй мерапрыемстваў дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі з'яўляецца рэальная магчымасць у перспектыве давесці дарогі, якія абслугоўваюцца, да ўзроўню еўрапейскіх стандартаў. Аднак, зноў-такі, пры ўмове выдзялення сродкаў у належных памерах.

Прафесіяналізм перш за ўсё

Аўтамабільныя дарогі паводле тэрытарыяльнага прынцыпу замацаваны за дарожнымі рамонтна-будаўнічымі ўпраўленнямі, работнікі якіх ажыццяўляюць будаўніцтва, рамонт і ўтрыманне дарог для забеспячэння круглагадовага бесперапыннага, бяспечнага руху транспартных сродкаў. Усяго ў структуры камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Магілёўаблдарбуд» працуюць 22 ДРБУ, надзвычай важнае значэнне ў працэсе ўтрымання аўтамабільных дарог мае правільны выбар тэхналогіі работ. Не менш актуальнае пытанне — эфектыўная арганізацыя. Зараз усе асноўныя работы механізаваныя, яны выконваюцца комплекснымі брыгадамі, якія маюць неабходны транспарт, забяспечаны ўсімі патрэбнымі сродкамі так званай малой механізацыі. Усяго ў падведамасных арганізацыях КУП «Магілёўаблдарбуд» створана 42 такія брыгады, кожная з якіх у сярэднім абслугоўвае 180-200 кіламетраў дарог. Праз іх стварэнне ўдалося дасягнуць галоўнага — павысілася мабільнасць, а таксама эфектыўнасць абслугоўвання. Прасцей кажучы, брыгада мае ўсё неабходнае, каб без усялякіх перашкод, без прастояў выканаць патрэбную работу.

— Вельмі важна, каб усё было зроблена на адпаведным узроўні, — лічыць Мікалай Краўцоў. — Дарожныя работы даволі затратныя, таму якасць — ці не галоўная ўмова, пастаяннае патрабаванне. Зараз мы больш жорстка падыходзім да вырашэння гэтага надзённага пытання. Рэгулярна праходзяць Дні якасці, падчас якіх спецыялісты выязджаюць непасрэдна на аб'екты і на практыцы паказваюць, што і якім чынам неабходна рабіць. Лабаранты дарожных рамонтна-будаўнічых упраўленняў рэгулярна праходзяць неабходную перападрыхтоўку, павышаюць кваліфікацыю. Штомесяц правяраем некалькі арганізацый, і парушальнікі караюцца рублём — атрымліваюць грашовыя штрафы. Гэта таксама мае свой эфект, паколькі на памылках аднаго неабходна вучыць усіх астатніх.

Асноўнымі накірункамі кантролю якасці работ, якія выконваюцца, у КУП «Магілёўаблдарбуд» з'яўляюцца своечасовае выяўленне і ўхіленне неадпаведнасцяў, яны праяўляюцца ў вытворчым цыкле як падчас набыцця будаўнічых матэрыялаў, так і непасрэдна пры выкананні работ. «Алгарытм» далейшых дзеянняў заключаецца ў выяўленні прычын тых ці іншых збояў, іх аналізе і выпрацоўцы мерапрыемстваў, якія змяншаюць верагоднасць узнікнення неадпаведнасцяў у далейшым. Таксама да дзейсных мераў можна аднесці ўкараненне новай тэхнікі і тэхналогій у вытворчы працэс.

— На прадпрыемстве існуюць некалькі відаў кантролю якасці прадукцыі, — паведамляе Міхаіл Шастакоў. — Па-першае, гэта ўваходны кантроль. Ён робіцца з мэтай своечасовага выяўлення неадпаведнасцяў матэрыялаў і вырабаў, якія да нас паступаюць, пашпартам, сертыфікатам, патрабаванням праекта. Аперацыйны кантроль адбываецца падчас выканання работ, ажыццяўляецца службамі прадпрыемства. Гэты від забяспечвае своечасовае выяўленне неадпаведнасцяў, прычын іх узнікнення і прыняцця мераў для іх ухілення і папярэджання. Прыёмачны кантроль праводзіцца работнікамі тэхнічнага нагляду на адпаведнасць якасці работ, якія выконваюцца, па элементах будаўнічых канструкцый патрабаванням праекта. І, нарэшце, інспекцыйны кантроль. Ён праводзіцца работнікамі дзяржаўнага кантролю, КУП «Магілёўаблдарбуд», прадстаўнікамі заказчыка і праектнай арганізацыі з мэтай праверкі эфектыўнасці выканання вытворчага кантролю (уваходнага, аперацыйнага, прыёмачнага). Гэты від уключае ў сябе візуальны кантроль, кантроль выканання тэхналагічных картаў і рэгламентаў, кантроль адпаведнасці складу і аб'ёму работ, кантроль за своечасовым і правільным афармленнем вытворчай дакументацыі.

На прадпрыемстве ўкаранёны і асвоены новыя тэхналогіі, якія дазваляюць значна павысіць якасць работ. Ямачны рамонт дарожных пакрыццяў выконваецца з выкарыстаннем комплексаў «Тайфун» з прымяненнем эмульсій. Укараняюцца комплексы для прамыўкі і класіфікацыі шчэбеню, заліўшчыкаў швоў. Прымяняюцца імпартныя асфальтаўкладчыкі, для падгрунтоўкі пакрыццяў выкарыстоўваюцца дарожныя эмульсіі, а для слаёў дарожных пакрыццяў павышанай устойлівасці і даўгавечнасці прымяняецца бітумная эмульсія. Усё гэта прыносіць відавочную карысць — эканамічны эфект ад укаранення новай тэхнікі і сучасных тэхналогій за мінулы год склаў 527 мільёнаў рублёў.

Яшчэ адзін вельмі актуальны накірунак — энергазберажэнне. Вырашэннем гэтай надзённай праблемы на прадпрыемстве сур'ёзна займаюцца на працягу апошніх чатырох гадоў. Як узгадваў Мікалай Краўцоў, спачатку многія проста не разумелі важнасці выканання такой работы, але калі пачалі рэалізоўваць адпаведныя мерапрыемствы, то хутка адчулі відавочную карысць. За апошнія некалькі гадоў спажыванне электраэнергіі зменшылася на 40 працэнтаў. Як кажуць, адчуйце розніцу! Тым больш што выкарыстанне мясцовых відаў паліва мае двайны эфект. Падчас правядзення дарожных работ ачышчаецца так званая паласа адводу. Раней драўніна не выкарыстоўвалася, а цяпер ідзе ў справу і прыносіць заўважны эфект.

Як нам падалося, у «Магілёўаблдарбудзе» заўсёды трымаюць руку на пульсе часу. Тэхнічнае пераўзбраенне, укараненне энергазберагальных тэхналогій, жорсткае стаўленне да належнага забеспячэння пытанняў якасці — усе гэтыя найважнейшыя задачы нароўні ці магчыма выканаць без прафесійных, кваліфікаваных кадраў. Таму да вырашэння кадравага пытання стаўленне асаблівае. На прадпрыемстве цудоўна разумеюць, што яго можна без ваганняў аднесці да разраду стратэгічных. Кожны кіраўнік структурнага падраздзялення рэгулярна трымае справаздачу аб вырашэнні надзённых пытанняў маладых спецыялістаў. Як справядліва адзначаюць у «Магілёўаблдарбудзе», работнікам перш за ўсё неабходна стварыць прымальныя ўмовы. За апошнія тры гады калектыў прадпрыемства папоўніўся 68 маладымі спецыялістамі. Відавочна, што кадравая палітыка, якая тут укараняецца, мае рэальны вынік. КУП «Магілёўаблдарбуд» натхнёна працуе на перспектыву, і гэта сапраўды тыя дарогі, якія мы выбіраем.

Захар БУРАК,
Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НА ЗДЫМКАХ:

1. Начальнік ДРБУ-59 Мікалай АЛЕШЧАНКАЎ.
2. Начальнік ДРБУ-128 Аляксандр СМІРНОЎ і галоўны інжынер «Магілёўдарбуда» Міхаіл ШАСТАКОЎ.
3. Начальнік вытворча-эканамічнага аддзела Ала ФАЦКАЯ і інжынер па працы Вольга КІСЯЛЁВА.
4. Хутка здаецца новы аграгарадок Княжыцы-Сумарокава.
5. Начальнік участка ДБРУ-128 Юрый ТУКАЧ.
6. Машыніст аўтакрана Андрэй САЛДАЦЕНКА.
7. На асфальтабетонным заводзе. Вадзіцель Віктар ПАРФЁНАЎ.
8. Майстар зварачнага ўчастка Міхаіл МАІСЕЕЎ і прараб Вікенцій САМУСЕЎ з ДРБУ-59 у пакоі адпачынку.
9. У аграгарадку Вейна.



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

html: www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсціруецца*)

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.517 Індэкс 63850. Зак. № 5799. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12